№ 19-20 (86) 26 траўня 1997 г.

НАША НІВА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА. ЗАСНАВАНАЯ Ў 1906 Г. Ў ВІЛЬНІ. АДНОЎЛЕНАЯ ТАМСАМА Ў 1991 Г. ЯК ШТОМЕСЯЧНІК. З 1 САКАВІКА 1998 Г. ВЫХОДЗІЦЬ Ў МЕНСКУ

Ігнат Канчэўскі

мы разам

Не відаць вас, брацьця, у крывавым тумане на дымлівым шляху гаманлівай штодзённасьці. Але ўсе мы разам, мы разам, бо нас злучае супольнасьць адна.

— Калі ідзеш сьмела ў крывавую бойку, поўную цемры і плачу, забойства і злосьці, хаваючы ў сэрцы сваім цяжар заміраньня і радасьці каханьня — дык нас злучае ў цяжкую часіну супольнасьць ахвяры...

— Калі ты ідзеш на патаптаньне людзкіх законаў, каб зь цяжкіх кайданаў вызваліць дух чалавецтва, што там у вастрогах і на эшафотах, — ты з намі, брат наш, бо нас злучае супольнасьць ахвяры...

— Калі твая сьмелая думка змагаецца з тым, што прыняла мірная пасрэднасьць, калі ты шукаеш новых шляхоў да сонца і новай гармоніі формаў праменных, — не палохайся лёсу тых, каго спалілі на вогнішчы: таксама ты з намі, брат наш, бо нас злучае супольнасьць ахвяры...

Калі ты стаіш прад сьвятым аўтаром у пустой сьвятыні і ўзносіш хвалу Невядомаму, каго адчувае душа твая ў сьветлым імкненьні пэўнасьці яснай, — мы разам, мы разам, бо нас злучае супольнасьць ахвяры....

Вільня, бібліятэка Акадэміі Навук Літвы, рукапісны аддзел, ф. 21, спр. 212, арк. 19.



РУСАФІЛЫ І РУСАФОБЫ

Сусед па вёсцы, дзед Васіль, апошні жывы зь вясковых дасавецкіх дзядоў — шчыры русафоб. "Хто заманіў майго малодшага сына на БАМ, скуль ён вярнуўся алькаголікам? — пытае ён. — Рускія. Ад каго ўсё гэтае піцьцё без канца, бязь меры? Ад іх. Хто забраў зямлю і загнаў у калгас? Хто сьцягаў крыжы з царквы і з ростаняў? Хто, як гналі немца, без патрэбы запаліў мой загон з жытам? Хто ў 1945 зьнёс усе прыбускія вёскі і выкінуў людзей у голае поле, каб адгарадзіцца ад Польшчы калючым дротам, "граніцай?" І гэтак далей, і бясконца.

Нашы адукаваныя русафілы ставяць зусім іншыя пытаньні: хто выратаваў нас ад фашызму і адбудаваў зьнішчаныя гарады? Хто правёў індустрыялізацыю Беларусі? Хто навучыў нас мыцца, у прыватнасьці, у лазьні? Чыя культура самая багатая, і хто прынес яе ў нашыя цёмныя хаты? Хто дае нам нафту і газ?

Падобная дыскусія вось ужо дзесяць гадоў як стала публічнай, і за гэты час пазыцыі дзьвюх уплывовых групаў насельніцтва: тых, што прагнуць вечнага шлюбу з Расеяй і тых, што дамагаюцца разводу альбо шлюбу з каротказтэрміновым разлікам — зазналі значную эвалюцыю. Яны вядуць дыскусію, а дыс-кусія тым часам вядзе іх. Унутраныя зьмены ў колькасным і якасным складзе дзьвюх гэтых разнародных групаў грамадзтва, трансфармацыя іх поглядаў і кірункаў іх дзейнасьці, пераносполюсаў і вэктараў дыскусіі і мэтамарфозы дыскусійных практыкаў вакол не апошняга пытаньня беларускага грамадзтва і беларускага мысьленьня: без Расеі, пад Расеяй, на Расеі ці за Расеяй — усё гэта дазваляе прасачыць за незваротнымі глябальнымі зьменамі, што адбыліся з матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурай і самаўсьведамленьнем беларусаў за апошнія гады. Больш за тое, яны даюць падставы меркаваць, што працэс паволькага "беларусатрусу" расьцягнецца, верагодна, яшчэ на пятнаццаць-дваццаць гадоў і скончыцца ўжо напярэдадні ператварэньня беларускага грамадзтва з індустрыйнага ў постіндустрыйнае.

Працяг на старонцы 3

ІНДЭКС ПАЦЯРПЕЛЫХ 1996

Сьпіс грамадзянаў, якія на працягу 1996-га году пацярпелі ад праваахоўных органаў паводле палітычных матываў у часе акцыяў пратэсту. ІНДЭКС складзены на падставе заяваў саміх ахвяраў у Гэльсынскі камітэт, Управу БНФ, Архіў Найноўшае Гісторыі, сьведчаньняў іншых праваабарончых арганізацыяў, сьведкаў і ўдзельнікаў падзеяў, матэрыялаў, сабраных Беларускім ПЭН-цэнтрам, а таксама паводле публікацыяў прэсы. Таму сьпіс ня можа разглядацца як юрыдычны дакумэнт. Ён далёка не ахоплівае ўсіх тых, хто пацярпеў ад рэжыму на працягу 1996 году. Згодна з інфармацыяй прэсы, міліцыі, пракуратуры можна лічыць, што толькі за вясну-лета 1996-га затрыманых міліцыяй на той ці іншы тэрмін за ўдзел у розных палітычных і праваабарончых акцыях было ня менш за чатырыста чалавек. Больш за сто чалавек былі зьбітыя.

На старонках 8-9.

КАБ НЯ ЎМЁРЛІ...

Вясна скончылася падпісаньнямі і арыштамі. Вясна скончылася Савецкім Саюзам у адной асобна ўзятай краіне. Нашай краіне. Вясна ў календары. У Беларусі хутчэй восень. І гэтая восень не была "восеньню патрыярха". Над грамадзтвам — знак стомы і беспэрспэктыўнасьці. Ва ўсім і для ўсіх, ад улады да самага нязначнага грамадзяніна.

Беспэрспэктыўна скончылася для беларускага рэжыму падпісаньне чарговага саюзу. Больш таго, яшчэ і напалохалі. Усё адбывалася як у школьнай гульні, калі звычайна больш моцны палохае слабога, а пасьля ўсьміхаецца і кажа: "Саечку за испуг". А сьледам, пакуль слабы зразумее, што да чаго: "Саечку за невежество". І так далей. "За испуг". "За невежество". "За испуг"! "За невежество"!.. Пакуль не надакучыць... мацнейшаму, вядома.

Для беларускай улады магчымасьць зрабіцца ўладай рассійскай ня спраўдзілася. Страчаная ініцыятыва. Прыходзіцца нэрвова трымаць рукі па швох і падстаўляць падбародзьдзе пад саечкі. "За испуг. За невежество".

Беларускія дэмакраты-апазыцыянэры, так і ня здолеўшы нарадзіць пэрспэктыўнага лідэра, апынуліся ў тым самым стане, што менскі рэжым перад Масквой. "За испуг! За невежество!" Боязь адказнасьці — беларускае таўро. Складаецца ўражаньне, што ў нас у прынцыпе ня здольныя паўстаць асобы кшталту Дудаева, Валэнсы, Ельцына... Прынамсі цяпер...

Таму, відаць і няма дзяржавы. Ёсьць "савецкае хазяйства" са сваім гербам, сьцягам і старшынём. Скандальным, хуліганістым, хамаватым... Але дырэктарам. Цікава, што будзе, калі яго раптам ня стане? Ну, напрыклад, паўстане на ягоным шляху бульбавоз — тыповы бэзсэсэраўскі сюжэт для савецкага беларуса.

Што далей?! Эўропа?!

Хутчэй, Расея. Шэсьць вобласьцяў.

З краіны зьяжджаюць. Беспэрспэктыўна. Альтэрнатыва адна —змаганьне. Самае шырокае. Але да змаганьня не дасьпелі. Тых, хто мог бы неяк паўплываць на падзеі, у адказ на нанесеныя крыўды, хуценька прывячае Масква. Былы шэф КГБ Шыркоўскі асеў там. У Маскве апынуўся і генэрал Мальцаў. Паступалі прапановы і генэралу Захаранку. Пройдзе нейкі час і зь іх зробяць Аркадзяў Вольскіх — расейскіх функцыянэраў...

Беспэрспэктыўнасьць. Моладзь, тыя, хто лічыць сябе бізнэсоўцамі, прафэсіяналамі, зьяжджаюць хто куды. Адраджэнцы таксама. У краіне маняць, п'юць, б'юць, садзяць. Пакуль ненадоўга.

Беларусь імкліва пафарбавалася ў шэры колер нявызначанасьці і беспэрспэктыўнасьці. Краіна нібы сышла ў свае самыя вялікія ў Эўропе балоты. Дрыгва. Альтэрнатыва адна — змаганьне. Хто як можа. Каб ня ўмёрлі.

Алег Дашкевіч

"НАШАЙ НІВАЙ"

30 траўня (пятніца) у Доме літаратара ў Менску "Наша Ніва" ладзіць сустрэчу з чытачамі. У вечарыне возьмуць удзел супрацоўнікі рэдакцыі й сталыя аўтары газэты. Будзе паказаны дакумэнтальны фільм "Віленскі зборнік", выступяць музыкі.

Пачатак у 18.30.

ГІСТОРЫЯ

Падземнае войска імпэратара

Шыхты тысячаў гліняных воінаў, сотні гліняных коней, калясьніцы і вазьніцы больш 2 тыс. гадоў назад занялі сваю ганаровую варту перад грабніцаю "Сына Неба" — знакамітага кітайскага імпэратара Шы-Хуана — заснавальніка дынастыі Цынь. Гліняныя фігуры людзей глядзяцца настолькі рэалістычна і індывідуальна, што сярод іх нельга ўбачыць аднолькавых твараў...

Чарговы артыкул у сэрыі "Археалягічныя адкрыцьці сьвету" — на старонцы 5.

ЛІТАРАТУРА

Амэрыканскі бэстсэлер

Кароткія апавяданьні Дэна Кларка, Бэнэта Сэрфа, Хэнака Маккарці, Джо Эн Ларсэн ды іншых сучасных амэрыканскіх аўтараў — упершыню па-беларуску, на старонках 13-14.

Сёмы год "НН"

Ад рэдактара

У пачатку стагодзьдзя "Наша Ніва" праіснавала дзевяць гадоў. З гэтым тэрмінам мы ўжо можам сувымяраць і час выхаду адноўленае "НН". З канца траўня 1991 году мінае шэсьць гадоў. Але параўноўваць мы будзем ня столькі два выданьні, колькі дзьве сытуацыі ў краіне — на пачатку і ў канцы XX стагодзьдзя.

Сувымерныя і цяжкасьці, у якіх "Наша Ніва" выходзіла тады і выходзіць цяпер. Ня думаю, што дзяржаўны прэсынг на беларушчыну тады, за царом, і цяпер, за Лукашэнкам, істотна зьмяніўся. Магчыма, тады ён быў не настолькі падступны і каварны. Толькі на працягу мінулага году мы перажылі два арышты нашых супрацоўнікаў, чатырохгадзінавы пératрус у рэдакцыі, які зрабіў КГБ, два пяпрэджаньні Дзяржкамдруку, ня кажучы пра "наезды" чарнасоценнай прэсы і хранічнае безграшоўе. Сёньняшняя ўлада разглядае наша і падобныя прадпрыемствы як камэрцыйныя і спаганяе за "Нашу Ніву" такія ж падаткі, як за любы іншы тавар. Пры чым, мы і тут на асаблівым рахунку. Сёньня ўжо другі тыдзень у рэдакцыі ідзе няпляпавая падаткавая праверка, скіраваная загадам адміністрацыі прэзыдэнта. А ў мінулы аўторак да "працы з намі" падключылася і Генэральная пракуратура.

Нагодай для выкліку рэдактара да пракурора стаў артыкул у "НН" за 10 сакавіка пра атрад савецкіх партызанаў, якія ў часе мінулай вайны па-зьверску забівалі мірных вяскоўцаў.

Старэйшы пракурор Новікаў пачаў гутарку з пытаньня: раскажыце пра вашу газэту, — што гэта, адкуль і навошта? Я пачаў расказваць, а сам думаў пра тое, што роўна тыдзень таму з падобнага пытаньня пачынаўся допыт мяне ў Вярхоўным судзе, куды я выклікаўся ў якасьці сьведкі ў справе Славаміра Адамовіча. Там, праўда, судзьдзя спытаўся зусім канкрэтна, па-пратакольнаму: чаму ваша газэта называецца "Наша Ніва"?

Яшчэ раней з экскурсу ў гісторыю беларускай культуры пачыналася мая гутарка з участковым, які ўшчуваў мяне за тое, што не зьявіўся на пасяджэньне віцебскага суда, якое, дарэчы, я гэта ведаў, не адбылося. А яшчэ...

Памятаю, з год таму пра слаўную беларускую газэту я расказваў сьледчаму КГБ Сакольчыку... Лаўлю сябе на думцы, што пачынаю бясконца пераздаваць праваахоўным органам адзін і той самы экзамэн з падручніка па беларускай літаратуры за пятую клясу. І адказы мае робяцца ўсё больш разгорнутымі, бо яны, экзамэнатары, не перабіваюць, слухаюць.

Распавядаеш ім пра "Нашу Ніву" і бачыш, што вочы рэагуюць толькі на пейкія найбольш моцныя індыкатары. Вось згадаў Янку Купалу ці Якуба Коласа. Ага, у ягоных вачах штосьці бліснула. Гэтыя імёны ён ведае. А ўжо Максім Гарэцкі для яго нічога ня значыць. Як, зрэшты, і "Наша Ніва". У адрозьненьне ад пяцікляcьніка, у мяне значна горшая пазыцыя. Мае словы ўспрымаюцца з заведамым недаверам. Бо я выклікаюся ў КГБ, да ўчастковага, у суд і пракуратуру ў якасьці патэнцыйнага злачынцы.

На гэты раз нагодаю для пракурора стаў ліст бабруйскіх вэтэранаў, абураных артыкулам пра партызанскія злачынствы. Падзеі мінулае вайны апісаў наш аўтар Сяргей Ёрш са словаў яшчэ жывых сьведкаў. Злачынстваў было шмат — цынічных, зьверскіх.

Старэйшы пракурор Новікаў прызнаў, што факты жахлівыя і варта было б зьвярнуцца зь імі ў КГБ. "Гэта прамы абавязак пракуратуры", — уставіў я. "Мы свае абавязкі ведаем самі", — абсёк Новікаў. І наогул справа ня ў гэтым. Бабруйскіх вэтэранаў абурылі зусім ня факты. Факты яны пад сумнеў ня ставяць. Іх абурылі выразы, якімі акрэсьліваюцца ў артыкуле бандыты. На ксэракопіі ў пракурора чырвоным маркерам выдзелены сказ аўтара артыкула Сяргея Ярша: "... я адчуў, як нэгатыўна настроеныя былі вяскоўцы да савецкай партызанкі". Вось што абурыла. Кожнае слова. Па-першае, аўтар наводзіць цень на ўсіх партызанаў. Маўляў, усе вяскоўцы нэгатыўна настроеныя да ўсіх партызанаў. Па-другое, падкрэсьлена, што партызаны савецкія. І бабруйскія вэтэраны бачаць у гэтым яўны подступ. Партызаны ж і былі ТОЛЬКІ савецкія, усе астатнія — польскія, украінскія, беларускія незалежныя — былі бандытамі. Па-трэцяе... Ну, навошта вы так груба, "па-блатному" пішаце — партызанка?

Апошняе, прызнацца, прымусіла мяне задумацца. Гэта праблема рознага ўспрыманьня суфіксаў па-расейску і па-беларуску. Дагэтуль, слухаючы ўспаміны лясных ваякаў, я адчуваў хутчэй замілаванасьць і пяшчоту ў гэтым іхным слове — партызанка. Можна таксама ўспрымаць яго як зусім нэўтральны палянізм. Але цяпер я на хвіліну ўявіў сябе бабруйскім вэтэранам і прамовіў сабе па-расейску — "советская партизанка". Сапраўды, не гучыць. Прыблізна тое самае, што з жыдамі. Традыцыйнае для народнай беларускай мовы неэкспрэсіўнае слова, па-нашаму гучыць безумоўна лепей, чым "яўрэі", а па-расейску ўспрымаецца як абраза.

Яшчэ больш просты прыклад са словам "блага", якое ў расейскай і беларускай мовах мае зусім адваротны сэнс. Благія намеры па-расейску — "плохие намерения", а "благие намерения" па-беларуску — добрыя намеры. Гэта, бадай, ведае кожны. Але тое, што такія рэчы даводзіцца тлумачыць у генэральнай пракуратуры — гэта ці не найлепшая ілюстрацыя стану розумаў у нашай краіне? Мы гаворым на розных мовах. Вэтэраны, КГБ, пракуратура, усё, словам, сілавое гаворыць па-расейску, а незалежныя выданьні і недзяржаўныя аб'яднаньні, — па-беларуску.

Быццам дзьве псыхікі існуюць у краіне — мілітарная, расейскамоўная і цывільная, беларускамоўная. Пры гэтым ня так істотна, якой мовай чалавек карыстаецца фармальна — расейскай ці беларускай.

Што тычыцца сэнсавых непаразуменьняў, то яны ідуць ад рознага разуменьня краіны. Мы — дома, і гэта наш спадчынны дом. Яны — на выдзеленай ім жылплошчы. Адсюль розная філязофія.

Ведаеце, кажа пракурор Новікаў, сёньня так цяжка разабрацца. Афіцыйныя прэса піша адно, бульварная — зусім іншае. Вось вам і ўся дыфэрэнцыяцыя. Трэцяга ня дадзена.

Ну, куды ім зразумець тых, несавецкіх партызанаў, у іхным успрыманьні — пагалоўна бандытаў? У Дальвіцы, — кажа пракурор, — былі здраднікі радзімы... Я пытаюся — якой радзімы? І згадваю эпізод з кнігі "Гарт. Саюз Беларускіх Патрыётаў" — з мэмуараў адной жанчыны, якая за свой беларускі патрыятызм адразу пасьля вайны была засуджаная на ГУЛАГ. Тамары Барсук было тады 18 гадоў.

"На судзе вельмі часта гучала абвінавачаньне сябрам і прыхільнікам СБП у здрадзе Радзіме. Якой радзіме? Мне за 18 гадоў чатыры разы мянялі радзіму. Да 1939-га ў школе ўбівалі пазойлівa ў галаву, што мая радзіма — "вялька Польска". З 1939 па 1941 — што СССР, які на справе асацыяваўся з Расеяй. З 1941 па 1944 — Нямеччына, гітлераўскі райх, ну і адначасова, як нешта няпэўнае, неакрэсьленае, у пэрспэктыве — Беларусь-Беларутэнія. З 1944-га — зноў СССР, Расея. Пра Беларусь, як пра пейкую асобную дзяржаву ў гэты час калі і гаварылася, то болей з мэтай прапагандысцкай, дэкаратыўнай. Але я ўжо зь дзяцінства засвоіла, што ўсё ж мая Радзіма, тая зямля, на якой жылі мае бацькі, дзяды-прадзеды, на якой жыла сама, называецца Беларусь".

Над тымі, каго пракурор Новікаў называе "здраднікамі радзімы", было чатыры рэжымы, а радзіма ў іх заставалася адна. Адсюль чысьціня патрыятызму. У гэтых, сучасных абвінаваўцаў, усё жыццё прайшло пры адным рэжыме — савецкім, які працягваецца і сёньня. Не зямля, ня мова, ня спадчына, а сыстэма ўлады стала для іх радзімай. Яны патрыёты рэжыму. І я распавядаю ім пра "Нашу Ніву" таксама як патэнцыйны "здраднік радзімы" або "вораг народа". Дарма, што часы, як кажуць, ня тыя...

А што нам інкрымінуецца? — спытаўся я ў Новікава на разьвітаньне. Артыкул пяты Закону аб друку, апошні пункт: пасяганьне на маральнасьць, гонар і годнасьць грамадзян.

Якіх грамадзян? — пытаюся.

Не міргнуўшы вокам, пракурор адказаў: Усіх.

Словам, закон — што дышла.

Ня думаю, што ў пачатку стагодзьдзя было інакш. Прынамсі, успрымаўся прэсынг ня менш драматычна. Адно дакладна, што людзі, якія песьлі беларушчыну ва ўсе сфэры жыцьця, тады былі іншыя. Больш людзкія і адначасова больш загартаваныя. Яны гэта даказалі. Нам гэта яшчэ трэба будзе зрабіць.

Выглядае, што менавіта гэтая задача цяпер міжволі робіцца для нас цэнтральнай. І для нашых чытачоў таксама.

ПОШТА

Добры дзень, шаноўная рэдакцыя!

Вы думаеце, калі гэта Магілёў, дык тут любяць Лукашэнку? На жаль, не памыляецеся. Але слова "любоў" у нашым прыкладзе выступае ў вельмі дзіўнай форме. Спробы зьмяніць яго на іншае, напрыклад, "прыязна ставяцца", ці нават, "боготворят" таксама не дазваляюць раскрыць сэнс адносінаў некаторай часткі насельніцтва да ППРБ.

Маладое магілёўскае згуртаваньне моладзі "Патрыёты Бацькаўшчыны. Рух у Эўропу" усё часьцей прымушае ўлады лічыцца са сваім існаваньнем. І гэтым разам "парушальнікам спакою" выступілі маладыя хлопцы.

Нагодай для правядзеньня антыфашыстоўскага пікету ў цэнтры горада стаў дзень народзінаў аднаго сусьветна вядомага чалавека. Нягледзячы на прыхільнае стаўленьне да яго яшчэ аднаго сусьветна (?) вядомага (чым, дарэчы, ён значна павялічыў межы сваёй вядомасьці), афіцыйны Менск узгаданую дату яшчэ не адзначаў, магчыма таму дазволу на пікет афіцыйны Магілёў ня даў.

Але, на дзіва, усё атрымалася. У прызначаны час у самым людным месцы абласнога цэнтру паўстаў шэраг моладзі з плякатамі, здымкамі і... чырвона-зялёным сьцягам РБ, які, як і меркавалася, добра выконваў сваю місію пудзіла для ахоўнікаў парадку.

Людзей ды спрэчак было шмат. Гвалту не было. Хаця... Спачатку зьявілася адчуваньне паразы й бессэнсоўнасьці. Здавалася, увесь горад у выглядзе даволі сталых людзей кінуўся ў наступ. Чаго толькі не даводзілася чуць! А з-за грошай, якія нам за гэта "заплацілі" нават зьявілася пачуцьцё ўпэўненасьці, што яны ўжо тут, у кішэні.

Вядома, увесь час узьнікалі спрэчкі, разпораз чуліся словы ўдзячнасьці й падтрымкі, але... уразіла іншае. У вялікае праваслаўнае сьвята сталыя людзі зь перакошанымі ад злосьці тварамі, з парасткамі вярбы ў руках падыходзілі і лаяліся... Лаяліся апошнімі словамі, крычалі, а потым з пачуцьцём, відаць, выкананага абавязку ішлі ў царкву ды маліліся...

У адказ на свае абразы "вернікі" чулі "дзякуй!" ды "са сьвятам!" Але... ці чулі?

Гледзячы на ўсё гэта, у галаву прыходзіла адна думка: "Гэта ня людзі... Зомбі".

Халодны бляск у вачах, брыдкія словы, баязбожніцтва, глухата — што гэта? Любоў? Прыхільнасьць?..

Плякат. Гітлер ды Лукашэнка. Подпіс: "Выбери кумира". Жанчына з дрыжаньнем у голасе пытаецца "як можна было іх разам?" Ледзь ня сьлёзы. Побач плякат з цытатай ППРБ пра "ня ўсё толькі дрэннае". Што яшчэ растлумачыш кабеце?..

Больш-менш маладыя людзі падыходзяць і думаюць. Яны — "за"? А іншыя падыходзяць і чыняць гвалт. Яны — "супраць"!

Але ўсе гэтыя назіраньні нечакана перакрэсьліў адзін непрыкметны момант. Мужчына сталага веку зь вельмі сур'ёзным тварам і зь яўным намерам паразмаўляць наконт працаўладкаваньня, канцлягера ды "зароблены грошай пікетоўцаў" спытаў: "Дык хто ж ваш кумір (Гітлер ці ППРБ)?" Слова "Радзіма" ў адказ, здалося, ледзь ня зьбіла яго з ног. Дзядзька сарамліва апусьціў вочы й ціхенька пакрочыў прэч, пакідаючы табе пачуцьцё перамогі й жалю.

З павагай, Андрэй Мыш

Магілёў

МОЛАДЗЬ ХОЧА ЗМАГАЦЦА

"Менавіта нам, маладым, гісторыя даравала запавет — пераняць бел-чырвона-белы сьцяг Адраджэньня і зрабіць тое, чаго ня здолелі юныя пакаленьні гарбачоўскай перабудовы й кебічаўскага застою: надаць беларусам сьвядомасьць нацыі". Гэтыя словы Паўла Севярынца, старшыні маладзёвай фракцыі БНФ, могуць вызначыць агульны тон падзеі, якая адбылася ў Менску ў суботу, 24 траўня, а менавіта, паседжаньня Арганізацыйнага Камітэту "Маладога Фронту". У залі Ўправы БНФ сабраліся маладыя прыхільнікі фронту й незалежнасьці зь Менску й рэгіёнаў.

Досьвед "Вясны-96-97" паказаў, што менавіта моладзь сёньня становіцца галоўным чыньнікам палітычнага жыцьця, а ў сучаснай пэрспэктыве — магчыма й рэзыстэнцыі, змаганьня за незалежнасьць, дэмакратыю, нацыянальную ды чалавечую годнасьць. Альбо — змаганьня супраць незалежнасьці, што выдатна разумее рэжым, спрабуючы стварыць дзейсную маладзёвую структуру, нешта накшталт "лукамолу". Праўда, масавага спантаннага імкненьня юнакоў да абароны ідэалаў панславізму, інтэграцыі, рынкавага сацыялізму ці праваслаўнага атэізму пакуль не назіраецца. А вось на іншы бок шчытоў і касак моладзь ідзе ахвотна, што паказалі практычна ўсе менскія масавыя акцыі. Назвы радыкальных групаў, такіх як "Белы Легіён", "Чырвоны Жонд" становяцца легендарнымі. Паўстаньне "Грамадзянскага Форуму", "Маладой Грамады" гаворыць аб увазе да "маладога фактару" сталых палітычных структураў "нслукашэнскага" лягеру.

Нарэшце, маладзёвая фракцыя БНФ, пэўна, — самае масавае са згуртаваньняў беларускай моладзі, якое зазначылася ў вулічных падзеях, але пакуль ня вызначылася як арганізацыя са сваім выразным "палітычным тварам", "перагрупоўваецца" ў аўтаномную, але, як дэкляравана, дастаткова зьвязаную з "матчынай" структуру. На сустрэчы ў Менску абраны аргкамітэт з чатырнаццаці чалавек, дзе дамінуюць менчукі, а таксама найбольш актыўныя і шматлікія гарадзенцы і магілёўцы. Вызначаныя кірункі працы, сярод якіх дамінуюць культура і спорт, выдадзеныя тэхнічныя парады, прынятая ўхвала, зачытанае прывітаньне ад З.Пазьняка. Усё было выдатна, хаця крыху й нагадвала альбо камсамольскі сход, альбо сходку БНФ. Наколькі "младафронтаўцы" здольныя будуць не паўтараць тактычных памылак фронту, наколькі іхная сувязь ня будзе нагадваць тандэм "партыя — камсамол" — ад гэтага будзе залежаць будучыня арганізацыі. Пакуль, менавіта несамастойнасьць і недахоп дынамічнасьці, можа й радыкалізму, здаецца, часам адштурхоўваў юнакоў ад фракцыі.

Варта спадзявацца, што заплянаваны на верасень зьезд будзе зьездам будучых пераможцаў, але не расчараваных будучыняй свайго краю.

Вацлаў Арэшка

Наказ "чарнарабочым Адраджэньня"

Беларускі Гуманітарны Адукацыйна-Культурны Цэнтар абвясьціў ляўрэатаў уласнае прэміі. Падзея адбылася 16 траўня ў памяшканьні ліцэя пры БГАКЦ у сьціплай, але ўрачыстай атмасфэры.

З часу заснаваньня ў 1990 годзе прэмія існуе ў выглядзе дзьвюх намінацыяў: "За грамадзкую чыннасьць, за самаахвярніцтва й патужніцтва ў справе беларускага Адраджэньня", а таксама "Аўтару высакаякаснай літаратуры, якая спрыяе духоўнасьці моладзі". Такім аўтарам быў прызнаны Алесь Наварыч. Камэнтуючы гэты выбар, дырэктар Цэнтру Ўладзімер Колас адно адзначыў, што яму падаецца, што ў выбары ляўрэата памылкі няма. Зрэшты, ня змог даць камэнтар і сам ляўрэат, паколькі адсутнічаў на імпрэзе. Такім чынам, выступіць з кароткай прывітальнай лекцыяй давялося ляўрэату першай намінацыі. Ім стаў Юры Хадыка.

Зьвярнуўшыся да прысутных ліцэістаў як "не да эліты нацыі", а да "чарнарабочых Адраджэньня", спадар Хадыка між іншым прыгадаў наказ Хрыста: "Не стварай сабе куміра — не пакланяйся й не служы яму". А на прыканцы імпрэзы выказаў сьціплы спадзеў-пажаданьне на тое, што з часам малавядомая пакуль прэмія БГАКЦ наблізіцца да кшталту Нобэлеўскай прэміі.

Севярын Квят.

РУСАФІЛЫ І РУСАФОБЫ

Працяг са старонкі 1

ЛЯСЫ — ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ?

За апошні год у краіне адбылося столькі ж падзеяў гістарычнай і газэтнай значнасьці, як за цэлы пэрыяд 1950-85 г. Для нацыянал-дэмакратаў гэта быў год імклівай і аптымістычнай радыкалізацыі, і нездарма шматзначную заяву сп. Краўчанкі: "Наша моладзь не павінна пайсьці ў лясы", зробленую леташняй вясной, не прайшло і году, як падхапіў (са сваім лягерам баевікоў у Ганцавічах) дзяржсакратар рады бясьпекі. Гэта сьведчыць толькі пра тое, што абодва бакі ў душы згодныя: калі б юнакі пайшлі ў лясы вакол газаправодаў, тады сапраўды пачалося б самае цікавае, — і патаемна чакаюць. З досьведу вядома: чаго чакаюць усе...

Цікава, што радыкалізацыю ціха, але рэгулярна падбухторвае русафільская прэса: тая ж "Народная газета" не міне зьвесткі накшталт: "А вось у адной зь вёсак Лагойскага раёну выпускнікі мясцовай школы напісалі на асфальце "Беларусь — для беларусаў!" Вядома, далей ідуць завярэньні ў непахіснай "славянскай дружбе" і г.д. Тады як прэса, якую спрэс кляймяць русафобскай, зь дзіўнай адзінадушнасьцю ігнарус той факт, што студэнцкая дэманстрацыя перад расейскай амбасадай скандавала "Далоў акупантаў", а на іншай частцы свайго маршруту: "Беларускі прэзыдэнт — маскалёўскі рэзыдэнт".

Апазыцыя спрабуе падагнаць пратэст пад прыстойную традыцыйную форму. Русафілы выкарыстоўваюць звыклую тактыку — правакуюць абурэньне большасьці. Праўда, няспыннае правакаваньне і прамаўленьне яшчэ ўчора забароненых праўдаў урэшце зьмяняе самую большасьць; мінулыя 10 гадоў мы назіралі няспыннае ссоўваньне "нормы", "дазволенага лёзунгу", "асярэдненага меркаваньня" не на карысьць русафілаў. Так, галоўным вынікам рэгулярных гнеўных філіпік наконт перамогі гетмана Астроскага пад Воршай стала тое, што кожны беларус ведае, што "калісьці мы іх пабілі". Увогуле, у сувязі з падыходамі да выбару тэмаў і мэтадаў іх абмеркаваньня прэсай і палітыкамі можна было б гаварыць таксама пра гульні несьвядомых памкненьняў, сьвядомых жаданьняў і выказаных словаў, як і пра тое, што русафілаў сярод беларусаў зусім ня столькі, колькі здаецца на першы погляд.

Ва ўмовах хуткай эвалюцыі сьвядомасьці палітычныя рухі заўсёды адстаюць. У Беларусі дагэтуль не засьведчыла сябе сур'ёзная сіла, якая б выступіла пад сьвядома скрайнімі лёзунгамі: татальнай прыватызацыі, закрыцьця ўсходняй і адкрыцьця заходняй мяжы, ліквідацыі ўсіх таталітарных памятак, мадэрнізацыі цывёрдай рукой — хоць пэўная частка праэўрапейскіх грамадзянаў ужо даўно такія думкі падзяляе. Гэтак жа, як няма й галоснай сілы, якая б сьвядома шакавала маўклівую большасьць і русафільскую меншасьць лёзунгам "Беларусь для беларусаў".

Маладзёжны нон-канфармізм і нацыянальна-вызваленчыя памкненьні урбанізаванага грамадзтва зьліліся ў бурным пацалунку, што адбіваецца як на актыўнай публіцы, так і на мілай русафілам вонкава пасыўнай большасьці. Першыя, насуперак намерам арганізатараў "Рок-каранацыі", выкрычалі тытул лепшай песьні для "Партызанскай" N.R.M.: "Акупанты прыйшлі, ім імя легіён, але нас не спыніць, але нас не стрымаць. Відаць, што зноўку давядзецца адкапаць кулямёт, відаць, што зноўку давядзецца страляць". Хітом другіх стала "нявінная" і даступная Ляпіс-Трубяцкоўская "Лукашэнка". Радыкалізацыя поглядаў моладзі, асабліва калі яе і надалей будуць стымуляваць такія акцыі, як закрыцьцё Радыё 101,2 і замена дэканаў-беларусафілаў на русафілаў, мае шанцы стаць стратэгічна вызначальным працэсам будучага, постлукашысцкага разьвіцьця падзеяў, і вымкне навідавок пры першай "адлізе".

ШМАТВЭКТАРНАЯ СТАБІЛІЗАЦЫЯ РУСАФІЛАЎ

Русафілы свае радыкальныя лёзунгі ўжо даўно сфармулявалі. Аднак жа, афіцыйнасьць іх ідэалёгіі і стракатасьць палітычна-ідэалягічных прыхільнасьцяў за апошні час ня раз прыводзілі да парадоксаў. Яны працягваюць вагацца між чатырма ідэалёгіямі: савецкай, вялікарасейскай, кілбасным папулізмам і абмежаваным лібэралізмам.

У сфэры культуры яны разам з расейскім тэлебачаньнем цалкам скіраваныя ў мінулае: да старых фільмаў, старых песень, матроскіх плясак, псэўдатрадыцыйнага, псэўданароднага, да сьпевакоў, якія штогод разьвітваюцца з гледачамі, а таксама да постмадэрнісцкіх паводле эстэтыкі і савецкіх паводле зьместу рымэйкаў і рытэйкаў. Іхная маскультура сьведчыць пра тое, што будучыню яны бачаць у своеасаблівай форме ўжо вядомага. Пры гэтым беларускія русафілы — што было цяжка ўявіць у імпэрскія часы — пачынаюць рэалізоўваць аўтаномныя, часам цалкам фантасмагарычныя праекты культурнага ўплыву Беларусі на Расею кшталту часопіса "Всемирная литература", тэлерадыёкампаній "Мир", "Славянскага базару" і кінафэстывалю "Витязь", якія a priori ніякага ўзьдзеяньня на Расею зрабіць ня здольныя, затое выклікаюць жывую рэакцыю (ад простай інфармацыі да ідэалягічнага адпрэчваньня) у Беларусі, ствараючы праблематызацыі, уласьцівыя толькі беларускай прасторы. Памятаючы прарочыя словы Багушэвіча пра "каб ня ўмёрлі", русафілы зрабілі расейскую мову сваім сьцягам, галоўным бастыёнам і зброяй страшэннай сілы. Здаецца, устаўшы перад дылемай: абвясьціць вайну Расеі ці загаварыць па-беларуску, — яны бяз роздуму выберуць першае. Аднак жа, да "вялікага і магутнага" падыходзяць творча, і іхная мова ўжо пачынае набываць уласныя моды ("отслеживание стабилизации многовекторной политики состоялось" і г.д.), чаго яшчэ пару гадоў таму не назіралася.

Русафілы ў пашане. Бадай, і першым мэдалём Кастуся Каліноўскага ўзнагародзяць аднаго з тых, каго сам Кастусь, магчыма, расстраляў бы ля першага дуба. Тым ня менш, можна быць упэўненым, ніхто з русафілаў ад мэдаля імя русафоба Каліноўскага не адмовіцца. Нават беларусы расейскага паходжаньня паступова "стабілізуюцца" ў Беларусі і пачынаюць шанаваць нашу краіну.

Абраньне на прэзыдэнта ўсходніка Лукашэнкі паскорыла і разьвіцьцё нацыянальнай самасьвядомасці, пачуцьця далучанасьці да Беларусі сярод усходніх беларусаў, і інтэграцыю русафілаў-фундамэнталістаў у беларускія нацыянальныя рамкі.

"Запісны" русафіл Лукашэнка распачынае працэс сыходу з расейскай тэлевізійнай прасторы, на што не спакушаўся нават запісны "русафоб" Шушкевіч. Падставы і мэты гэтага кроку могуць быць самыя розныя, але ягоную патэнцыйную значнасьць для Беларусі нельга пераацаніць.

ПАРАДОКСЫ ДЭКАЛЯНІЗАЦЫІ

Галоўны ж парадокс дзейнасьці нашых русафілаў вось у чым. З аднога боку, яны абавязаныя дзейнічаць актыўна, абвяргаючы, крытыкуючы і запалохваючы, каб ураўнаважыць дзейнасьць і ўплыў праэўрапейскіх сілаў. З другога боку, што б яны ні рабілі — ад рэфэрэндумаў, што мусяць умацаваць іхную палітычную вагу, да закладкі помнікаў, якія маюць увекавечыць еднасьць з Расеяй — яны ўсё адно ствараюць беларускую праблематыку, яны працуюць на ўсьведамленьне Беларусяй сябе ў якасьці суб'екта пэўнага выбару.

Дэкалянізацыя — гэта ня зьмена вонкавых атрыбутаў дзяржаўнага жыцьця, гэта перадусім стварэньне ўласных палітычнага, культурнага, маральнага, адукацыйнага, інфармацыйнага ды іншых кантэкстаў з уласьцівай ім унутранай дынамікай, у пэўнай ступені незалежнай ад дынамікі былога цэнтру. Дэкалянізацыя — гэта шлях грамадзтва ў цэлым, сацыяльных і ідэалягічных групаў, што яго складаюць, і асобных людзей ад стану аб'ектаў або patiens гісторыі і мысьленьня да стану суб'ектаў або agens праз самарэфлексію, самаспазнаньне, самавыказанасьць, самарэалізацыю. Увесь гэты шлях посткаляніяльнае грамадзтва праходзіць у стане ўстойлівага інфармацыйнага шоку, што суправаджаецца, з аднаго боку, адпрэчваньнем і інстыктыўным адмаўленьнем усіх новых рэаліяў, лёзунгаў, значэньняў (сваё войска? Не! свае грошы? Не! Аршанская бітва? Не! і г.д.), а з другога — няспыннай патрэбай у новым шоку, у працягу дынамікі спазнаньня невядомых дагэтуль рэаліяў і значэньняў, няспыннай пагоняй за новымі мэтамі. Такі супярэчлівы, канфліктны працэс дазваляе няспыннае ўзрастаньне ўнутранай энэргіі прасторы, яе аўтаномнай жыцьцяздольнасьці і разам з тым засьцерагае ад "пераскокаў і пералётаў". У выкананьні адной сацыяльнай ролі актыўна ўдзельнічае грамадзкая ідэалягічная група русафобаў, другой — русафілаў. Іх палеміка рухае наперад усю сыстэму. Толькі маўчаньне і бязьдзеяньне вядуць назад, да стану, калі Беларусь ня мела ні голасу, ні гістарычнага сэнсу. І працэс дэкалянізацыі, калі толькі збольшага захаваецца сёньняшняя вонкавая раскладка, незалежна ад нечыіх жаданьняў, будзе доўжыцца і надалей.

НЕЗАЎВАЖНЫ БЕЛАРУСАТРУС

Адна з найцікавейшых зьяваў апошніх гадоў у Беларусі — нараджэньне паэтыкі нацыянальнага змаганьня. Хіба можна было 10 гадоў таму ўявіць сабе, каб жонка прэм'ер-міністра (лічы, сам прэм'ер) падпольна трымала ў рэзыдэнцыі герб, забаронены і зганьблены прэзыдэнтам? Маленькі, а ўсё ж — учынак. Прынамсі, сюжэт, варты свайго маленькага Лопэ дэ Вэгі. Зрэшты, з чаго, як не з маленькіх учынкаў або маленькіх подзьвігаў (як на чый густ) складаецца вызваленьне чалавека і народа з цугляў нявыказанасьці? Менавіта яны зьмяняюць рамкі дапушчальнага і ўяўленьне пра норму.

І вось ужо робіцца нармальным, што Элеанора Язерская не размаўляе з тэлезоркаю русафілаў Зімоўскім (гэтым яна прызнаецца ў разьліку на шырокую, нэўтральную публіку). І вось ужо нікога асабліва не хвалюе тое, што ўдзячныя тэлегледачы зьбілі на горкі яблык іншую тэлезорку русафілаў — Грышана. Або такі факт: частка ўдзельнікаў тусоўкі "Прямого действия" больш старанна пазьбягалі аб'ектываў, чым дэманстранты на незалежніцкіх маршах, якім сапраўды можна спадзявацца на дубінкі і турэмную койку. Прычына страху "прамадзейных" зразумелая: славы не заробіш, а мо' нейкі легіён і сапраўды складае нейкія сьпісы?

У апошнія гады ў Беларусі ўсё ж адбылася пэўная мадэрнізацыя: ад кампутарызацыі да пашырэньня кантактаў са сьветам. Адбылася таксама пэўная "беларусізацыя" мысьленьня, у тым ліку і шляхам "ад праціўнага", ад непрыняцьця "хамскай улады", ад жаданьня пераменаў, паводле інэрцыі і аналёгіі з працэсамі, што адбываюцца ва ўсім рэгіёне. Працягваецца ўпарты канфлікт між эўрапейскай і русафільскай ідэалёгіямі. Ствараецца паэтыка нацыянальнага змаганьня. З усяго гэтага складаецца незаўважны "беларусатрус", які ўсё ж мусіць нешта вытрасьці.

ЗАБОЙСТВА КУПАЛЫ

Калі ўзяць літаратуру, дык творам, які найбольш яскрава ўвасобіў дух нацыянальнага пошуку апошніх гадоў, стаў, мабыць, ліст беларускага нацыяналіста, які ў 1942 забіў Купалу (пішу і баюся, каб пільная пракуратура нарэшце не далучыла да справаў гр. Ведзьмака Лысагорскага і Адамовіча яшчэ й справу пра забойства Івана Луцэвіча). Своеасабліва "спаленьне Купалы", таго, што гэтае імя і ягоная творчасьць сталі для нас абазначаць і сымбалізаваць — адлюстраваньне пошуку Беларусяй новых формаў мысьленьня.

Па сіле разбуральнага ўзьдзеяньня на базавыя стэрэатыпы і інстынкты беларусаў, бадай, нішто не параўнаецца са зьяўленнем у Беларусі пары тысячаў маладых, якія прынцыпова і ўсюды, дзе толькі ёсьць магчымасьць — у побыце і публічнай сфэры — карыстаюцца выключна беларускай мовай, выклікаючы ціхае шаленства русафілаў і піск замілаваньня пераважна расейскамоўных русафобаў. Беларуская мова моладзі — форма бунту, нонканфармізму, але й рухавік працэсу нацыянальнай самаідэнтыфікацыі. Яна разбурае найгалаўнейшыя стэрэатыпы, якія стагодзьдзямі ствараліся калянізатары. Гэтая жменька юнакоў і дзяўчат рэалізоўваюць усе стратэгічныя задачы і канцэпцыі, вылучаныя армадай нашых палітолягаў і сацыёлягаў. Хто далучаецца да гэтай жменькі, той далучаецца да гісторыі. Аднак, і тут ня ўсё так проста, і сёньня пакаленьне "Тутэйшых" са зьдзіўленьнем назірае, як маладыя на нейкім канцэрце рвуць на поўныя грудзі "Жыве Беларусь", але як толькі выходзяць з залі, дык ад іх і слова не пачуеш па-беларуску. Няўхільныя музэіфікацыя і сымбалізацыя мовы і блізка не замарудзіліся. Паўстае ўнікальная новая сытуацыя.

БЕЛАРУСКІЯ АРЭАЛІ

Акрэсьлены пераход ад традыцыйнага да індустрыйнага грамадзтва шырока пачаўся ў Беларусі недзе пад час будаўніцтва чыгунак, крыху больш за стагодзьдзе таму. Менавіта тады пачала зараджацца беларуская самасьвядомасьць, зьмяняючы і інтэгруючы "западно-русскую", тутэйшую, ліцьвінскую і польскашляхецкую сьвядомасьці, зьявіліся першыя патрыёты, былі напісаныя першыя сьвядома беларускія творы. Аднак, адначасова, тады ж па меры разбурэньня традыцыйных укладаў жыцьця пачалося выцясьненьне беларускай мовы. "Ідылія" нерухомасьці беларускіх арэляў скончылася. Арэалі раскалоліся.

Гушкалка мысьленьня, самаўсьведамленьня паляцела ў адзін бок — ад патрэбы ў аўтаноміі да патрэбы ў незалежнасьці, ад патрэбы ва ўласнай літаратуры да патрэбы вызваленьня ад "хамскай улады". Гушкалка ж мовы скіравалася ў процілеглым кірунку. Самы марудны тэмп маўленьня сярод эўрапейскіх народаў — не адзіны вынік расколу мысьленьня і мовы, што пралёг празь сьвядомасьць народу і большасьці ягоных асобных прадстаўнікоў. Паўз увесь індустрыйны пэрыяд нашай гісторыі раскол усё паглыбляўся. І цяпер таксама амаль усе праэўрапейскія сілы робяць акцэнт на ўмацаваньні самасьвядомасьці, разуменьня сэнсу і вартасьці нашай незалежнасьці і эўрапейскасьці, пакідаючы праблему мовы, маўляў, на заўтра.

Калі меркаваць з такіх настрояў, то празь нейкіх дваццаць гадоў, са зьменай яшчэ аднаго пакаленьня, вырашальная большасьць беларусаў будзе абсалютна абыякава ставіцца да Расеі, і пры гэтым будзе выключна расейскамоўнай. Фактычна, русафілы і русафобы зьнікнуць як ідэалягічныя групы, але пакінуць па сабе ў спадчыну для нацыі: першыя — убогую паўмову, другія — убогае паўмысьленьне. Гэта будзе момант найбольшага разьлёту палавінак беларускіх арэляў. Гэты момант таксама, верагодна, супадзе з пачаткам пераходу беларускага грамадзтва з індустрыйнага ў постіндустрыйны стан.

І хто ведае, а ці не пачнуць нашыя зашмальцаваныя арэлі, даляцеўшы да верху, зваротны рух аж да сутыкненьня палавінак? Ці будзе жорсткім гэтае сутыкненьне? Ці стануць беларускія арэлі зноў цэлымі, ці, наадварот, разьляцяцца ад удару на дробныя шматкі, і канчаткова дэградуе народ, адораны самым запаволеным тэмпам маўленьня? Ці ўтворыцца нейкая абсалютна іншая сытуацыя, іншая мова? Ці ў постіндустрыйных грамадзтвах мовы ўвогуле не ўтвараюцца, а толькі зьнікаюць?

Вядома, цяпер, у тэлевізійным грамадзтве, сярод татальнага жабрацтва і занядбаньня, калі большасьць беларусаў фізычна хворыя, ды яшчэ й пры нежартоўным ціску акупантаў здаецца, што імклівай ірляндызацыі Беларусі нішто не стрымае. І мы адчуваем роспач і самоту, і мы скаланаемся, чытаючы Джойса, і мы, калі не бярэм лахі пад пахі, дык прынамсі, сьціскаем зубы.

Аднак жа, хочацца верыць, што ў адкрытым грамадзтве, у грамадзтве інтэлектуалізаванай вытворчасьці, у грамадзтве дабрабыту ўсё будзе па-іншаму. Гэты спадзеў часткова падмацоўваецца досьведам Скандынавіі і Галяндыі. Да таго ж, расейская і беларуская мовы — не ангельская і кельцкая. Што ж, значыць, галоўнае — дайсьці да грамадзтва дабрабыту?..

Усё залежыць ад таго, які культурны досьвед, культурны набытак здолеюць назапасіць беларусы; ад таго, якая частка беларусаў застанецца рэальна беларускамоўнай; ад таго, як хутка беларусы апынуцца ў большасьці ў войску і вышэйшых навучальных установах, выцясьніўшы стуль агрэсіўных русафілаў, і ад наяўнасьці беларускамоўнай праслойкі ў гэтых цэнтральных грамадзкіх інстытутах пярэдадня постіндустрыйнага грамадзтва. Усё залежыць ад беларусаў. У гэтым іхным "усім" ад русафілаў не залежыць нічога.

Андрэй Дынько,
Заказанка

ДЗЁНЬНІК

Літвіначка

Ідзеля чаго толькі мне дадзеная мая галава! Пэўна дзеля таго, каб быць п'яной ад заўсёдных дум. Думкі наплываюць адна на адну, то мірна суіснуюць, то ўсчынаюць спрэчкі, а то й жорстка сьціпаюцца, бы на якой сечы. І кожная думка мяне некуды кліча, каб ішла за ёй адной. Я імкнуся аддаваць перавагу сардэчнай думцы, бо мне мілей гэтая ціхая маленькая пяступка. Каб зь дзіцяці узгадаваўся добры й дужы чалавек, яму ў маленстве вельмі патрэбна матчына ласка. Вось я й лашчу гэтую сваю "малюпатачку". Расьці вялікай ды здаровай, любачка!

Сказала: "расьці", як быццам дачушка ўжо нарадзілася. Не, я ніяк нашу гэтую бясьцелавую істоту ў сваім сэрцы, і для іншых такі мой надзвычайны стан бывае зусім незаўважным. Мо праз самаахвярную матчыну любоў у мяне апошнім часам усталявалася асаблівая нелюбоў да газэтаў, кнігаў, радыё, тэлевізіі. Зза таму, што ўчыняюць гэтыя сродкі масавай інфармацыі, мне не чуваць лёгкага зыбаньня майго дзіцяткі ў маім целе. І калі я ня чую яго ў сабе, навакольны сьвет становіцца нудным, шэрым. Тады мяне цягне да людзей. Надта сьпяшаюся, бы хтось гоніць, раздаць, вярнуць абдзеленым украдзеную ў іх часьцінку душы, мне так хочацца ўсіх застыных адагрэць матчынай ласкай!.. Але аддадзенае людзям духоўнае багацьце вяртаецца да мяне то далікатным дотыкам Нябеснай навуцінкі, то Сьветлым спакоем маёй душы. І вельмі рэдка ў чорнай цемры блісьне маланкай — Азарэньнем. Я шчасьлівая, бо ведаю, што ўва мне жыве мая Літвіначка... Прагаварылася... Кажуць, нельга загадзя даваць імя дзіцяці. Ат! "Мы — Ліцьвіны, і нам усё можна", — кажа мая Вераніка. І я веру дзіцяці, ды ня нейкім забабонам. Бо памятаю, што Хрыстос казаў, каб дарослыя былі, як дзеці.

... Рукою чорнай хтось крануўся крылаў... Гэта зноў яны! Яны камандуюць, каб аддала Міколку ў абрыдлы яму інкубатарскі сад, каб Вераніку завяла ў нудны ёй каставы касьцёл. "Будзьце шэранькімі, паскудненькімі, як усе мы", — даводзяць яны. Віталіку ў гімназіі таксама загадваюць, каб пісаў хваласьпевы чыноўнікам ад школьнае навукі. Але ён ужо ўмее адбівацца: "Гусьлям, княжа, ня піпуць законаў". Дый Вераніка не аб'ераю хлеб кроіць. Ёй нецікава малпаваць на масоўках у школе. Іншая рэч, калі самой чытаць свае вершыкі. Яна заўважае, што ніхто зь ейных аднаклясьнікаў не вядзе дзёньніка, не запісвае сьмяшынак, прыказак. "А ты, калі можаш, дык і рабі гэта, не глядзі на іншых", — кажу ёй.

Толькі ў Міколкавым нораве я не магу пакуль разабрацца. Ня горнецца ён да навукі. Я яго й не схіляю. Яму добра ў вёсцы ўлетку, калі можна хадзіць у лес па ягады, грыбы. Лес — гэта Храм. І мне таксама бывае там надта ж хораша! Ня тое, што ў Койданаўскім касьцёле, дзе ксёндз моліцца па-польску, а людзі па-расейску. У дадатак да ўсяго за малітвы бяруць грошы, каб пасьля адбудаваць на іх двухпавярховую плябанію з гаражом, куды будуць прыяжджаць дэлегацыі з Польшчы. Нагледзелася я там гэткіх парадкаў, калі хадзіла на Вялікдзень сьвянцаць для бацькоў фарбаваныя яйкі, соль, булку. Я не спрачаюся са старымі (дый наогул ні з кім не спрачаюся) — зраблю ўсё так, як хочуць яны. Толькі грошай за касьцельную малітву не дала. Не было. І так у Віталіка пазычала на муку лепшага гатунку, каб выйшлі адмысловыя булкі. (Ён сяды-тады зарабляе ганарары ад сваіх вершаў, апавяданьняў). Пасьля сьвятаў, калі муж парэшце прынес з казённага прыгону патрапаныя, убогія "зайчыкі", я неяк вымеркавала і паслала па пошце сымбалічную суму знаёмай мне толькі лістоўна дзяўчыне. Яна піша мне лісты зубамі. Вось цяпер мае булкі асьвечаныя. І гэта зусім не істотна, што я іх асьвяціла пасьля таго, як іх ужо зьелі. Я ведаю, што Бог не пакіне маіх бацькоў, бо я паклапацілася пра далёкую сястру. Бо памятаю, што Хрыстос казаў, у нас будзе шмат сясьцёр ды братоў.

... Калі выгналі Хрыста з храмаў, тады храмы прызналі Хрыста сваім. Калі палякі пагубілі Адама Міцкевіча, тады яны прызналі Адама Міцкевіча польскім паэтам. Але ні Хрыстос, ні Адам Міцкевіч не былі ні "нашымі", ні "вашымі". Яны былі Ўсіхнымі. А для Літвы Адам Міцкевіч быў зьвяном між ейным узьлётам і ейным падзеньнем. І ад нас, калі толькі мы ня хочам быць безыменнымі тубыльцамі, што жывуць на ягонай Айчыне, цяпер залежыць ці закапаць у зямлю дадзены нам Богам скарб, ці наадварот, з пашанай, далікатна адцерці залатоўкі таленту паэта ад векавечнага пылу й бруду.

А я цяпер нават Караткевіча не магу чытаць... Бо натыкаюся на рэанімаваныя словы, не гутарковыя, ды вычытаныя з даўно памерлага кніжнага жыцьця. Няхай ён мне дарус, але ўжо й Караткевічава проза мне здаецца штучнай літаратурай, як штучнай прыстаўкай да жыцьця выглядае сёньняшняя цацачная ўніяцкая царква. (Ці не таму ён блізка не падпускаў да сябе юных пісакаў, "не даваўся ўжывую"?)

Я не чытаю, ня слухаю, не гляджу. Я кахаю. Я адчуваю. Я раблю тое, што адчуваю, патрэбна рабіць. Зьнікае на маіх вачах вёсачка Камароўшчына, што прытулілася на Койданаўшчыне, а разам зь ёй гіне сйная мова. Мова ёсьць летапіс народа, слоўнік ёсьць гісторыя Культуры. І я, як умею, узялася складаць "Маленькі слоўнічак тубыльцаў", дзе будуць сабраныя дыялектызмы, прыказкі, фразэалягізмы. Гэтая сьціплая праца й ёсьць ціхая малітва за ўсю маю каханую Айчыну. Я ведаю, што ціхая шчырая малітва даходзіць да Бога..

Ганна Матусэвіч

ШОСТАЯ ЛІНІЯ

Прамаўляць, ня мовячы

"... Усякае сапраўднае пачуцьцё ў сапраўднасьці непередавальнае. Выказаць яго — азначае, здрадзіць яму. Аднак, перакласьці яго на іншую мову — азначае яго схаваць".
А.Арто

Напачатку траўня ў галерэі "Шостая лінія" адбыўся "Тыдзень перфомансу", прысьвечаны Арто. Штовечар на працягу шасьці дзён публіка магла сачыць за мастацтвам дзеяньня, якое прадстаўлялі пяць мастакоў.

Perfomanse — французізм у ангельскай, які літаральна азначае "прадстаўленьне". Часьцяком перфомансы блытаюць з акцыямі, але гэтым разам адбываліся менавіта перфомансы. Час перфомансу — гэта час руху, які адмаўляе ўсялякую "скончанасьць", гэта рух, паводле вызначэньня Арто, "цела бяз органаў", які толькі набліжаецца да параджэньня і нічога ня кажа пра сьмерць. Прастора перфомансу — пустата, нішто, якое яшчэ не пачало быць як месца існаваньня. Як заўважае куратарка праекту, Вольга Капенкіна, межы перфомансу заўсёды ўмоўныя (якія межы могуць быць у пустаты?).

Для Беларусі гэтая зьява, вядома, не навіна. Першыя перфомансы адбыліся ў Менску яшчэ ў 80-я. Іх аўтары Ігар Кашкурэвіч, Людміла Русава ды іншыя, адкрылі дзьверы ў незабсяжны сьвет гэтага найноўшага віду мастацтва.

Сёньня ўжо добрая палова выставаў не абыходзіцца без перфомансаў у дзень адкрыцьця. Аднак спроба вылучыць гэты від мастацтва ў апрычоную праграму была зробленая ў Беларусі ўпершыню.

У Тыдні бралі чын ня толькі пачаткоўцы, але й добра вядомыя мастакі. Гледачы сталі сьведкамі перфомансаў з выкарыстаньнем відэаінсталяцыі (Максім Тымінька "У маёй сярэдзіне кветкі"), літаратурных (Ільля Сін "Ільля Сін памёр" і мастак з Полацка Алег Ладзісаў "Ziggurat"), тэатральных (Ірына Зелянкова, "Realioга"). Людміла Русава, мастачка з найбольшым досьведам у практыцы перфомансу, прадстаўляла "Рухомы крыж" (які ўжо дэманстраваўся ў Віцебску на "Information'96") і "На звароце".

Энэргетыку, што перадавалі гэтыя дзеі, мог адчуць кожны са сьведкаў. Невыпадкова перфомансы часта завуць Live art — жывое мастацтва. Адсюль іх непаўторнасьць і немагчымасьць перадачы простым пераказам паступовасьці рухаў і эфэктаў. У Беларусі ўжо стварыліся традыцыі перфомансу ў розных жанрах і Тыдзень гэта засьведчыў.

Ірына Сазонава

Людміла Русава

Ірына Зелянкова

Людміла Русава

Здымкі Васіля Сямашкі

PROMENADE

ЗНОЎ ХІЧХАЙКЕР

У першыя дні лістапада, будучы пасажырам рэйсавага аўтобуса Талін — Адэса, я нечакана патраплю у абыякавую, некалькі нават варожую і мокрую кібэр-прастору. Гэта здарылася на расейска-эстонскай мяжы. Дзьве, тры, а можа і болей схемаў-сыстэмаў зьмяняліся месцамі, зьнікалі, зьяўляліся зноў і бралі ўва мне самы гарачы ўдзел. Пры гэтым яны ляскалі зброяй, запальвалі агонь, совалі крэслы і нават каплялі. Праз гадзіну я зразумеў, што мне падрэзалі крылы — аўтобус марудна і трэбліва аддаляўся па нічыйнай паласе на расейскі бок. Дзьве балбатлівыя жанчыны на заднім сядзеньні жыва абмяркоўвалі мой арышт, але я гэтага ўжо ня чуў.

Грунтоўна і адначасова па-дзіцячаму лёгка вайсковец корпаўся ў маіх кішэнях, шаргацеў пальцамі ў складках майго адзеньня, перабіраў старонкі нататніка і задумліва разглядаў на сьвятло кавалак засьвечанай стужкі, які выцягнуў з майго партманэ. Я ня надта разумеў гэтых людзей. Замест таго, каб напаліць як сьлед печку, пасадзіць у крэсла і пачаставаць гарбатай, гэтыя дзівакі строга мяне пра штосьці распытвалі, складалі дзіўныя дакумэнты і, галоўнае, паводзілі сябе неяк недружалюбна. Самы суворы зь іх прапанаваў мне скласьці тлумачэньне. Незаўважна для сябе, я заханіўся і праз гадзіну атрымалася выдатнае эратычнае апавяданьне. Строгі эстонскі капрал нават папрасіў у сябе дазволу ўсьміхнуцца, аднак у апошні момант усё ж не дазволіў. Накіраваўшы ўсю інфармацыю пра маё парушэньне ў кампутар — з трэшчынай на шэрым корпусе, заклеенай брунатным скойчам, — памежнік рапартам абвясьціў, што я свабодны. За два крокі да нічыйнай паласы, у пашмальцаванай драўлянай будцы, румяная эстонка наводмаш пляснула чарнільны штамп у мой пашпарт. Над галавой у яе вісеў акуратны дыванок з выявай Мэкі.

У расейскіх памежнікаў і мытнікаў у зьвязку з пахмурным надвор'ем быў сплін. Мусіць таму яны ставілі штампы, ня гледзячы, моўчкі і сувора. На ўсе пытаньні замест адказу чыноўнікі паказвалі на шлягбаўм, кудысьці ў бок леса. У лесе стралялі з Калашнікава — відаць, ішлі вучэньні.

Апынуўшыся за шлягбаўмам, я агледзеўся. На душы стала неяк тужліва. Ішоў дождж, зьмяркалася, я сербануў гарэлкі і рушыў па дарозе куды-небудзь.

Праз кілямэтар мяне падабраў зялёны джып. Гледзячы на мой мокры шынэлак і падазроны чорны пляцак, кіроўца пацікавіўся, ці ўдала я перабег мяжу і ў якім менавіта месцы. Я чамусьці адказаў, што еду ў Менск да мамы. На ўскрайку Пячораў, каля ДАІ ён мяне высадзіў і параіў зьвярнуцца да міліцыянта. Шчыра кажучы, я так і зрабіў. Увайшоў у памяшканьне дарожнай службы і натыкнуўся на сяржанта, які сядзеў за сталом сьпінаю да мяне і калупаўся ў носе. Яўна сумуючы, ён разглядаў бабку ў сінім працоўным халаце. Тая вадзіла шчабраю па падлозе, і рухі яе былі відавочна разьюшаныя. Слухаў мяне сяржант няўважліва, раз за разам перабіваючы, даваў карысныя парады прыбіральшчыцы. Калі я скончыў гаварыць, міліцыянт млява павярнуўся ў мой бок і важка сказаў: "Вали отсюдова".

Зусім іншае, нечаканае на пах і дотык паветра, цемра, разруха будынкаў і сапраўдныя мужыцкія галасы насяляюць усе расейскія трасы. Яшчэ не напісаны сцэнар руху, але ўжо прысутнічае, ужо відзён трапны сюжэтны ход. Цяпер я нэрвова і напружана ўзіраюся туды, дзе нічога не відаць. Тут сапраўды нічога не было бачна. Толькі белая паласа на вузкай шашы і агульнае адчуваньне ляснае прасторы.

Праз паўтары гадзіны хады я вырашыў адначыць у сялянскай сядзібе, якая ўзьнікла раптам за паваротам, каля шашы. У вокнах гарэла сьвятло, на двары дружалюбна тарахцеў трактар, а цьмяная лямпачка выгадна асьвятляла завэдзганы двор. Тут, амаль напэўна, я змагу прысесьці і, калі не пераначаваць, то адпачыць, пачаставаўшы вяскоўцаў эстонскай гарэлкай.

У хаце пахла гнілой бульбай, два мужчыны ў дзіравай прамасыленай вопратцы сядзелі за сталом і выпівалі зь сіняй бабуляй нейкую гадасьць, жыва дыскутуючы пры гэтым. Калі я ўвайшоў, іх вялыя і друзлыя твары ўставіліся на мяне, хутка набываючы злосныя выразы. Мяне ўразіла спалучэньне сухіх масьнічын і мокрых пляшак, раскіданых паўсюль. Спытаўшы, куды вядзе суседняя дарога і не атрымаўшы адказу, я выйшаў на вуліцу і рушыў далей.

Неўзабаве нехта зблытаў мяне з манахам. У аблупленай Пабедзе запалілася сьвятло і я разгледзеў на пярэдніх седалах двух падазроных асобаў. Калі я ўлез у салён, кіроўца адразу прапанаваў пяцьдзесят грамаў у мутным шкаліку. Выпіўшы і закусіўшы, я зьвярнуў іх увагу на тое, што я не манах. Нейкі час паразмаўляўшы пра тое-сёе, я зразумеў, што ў дадзены момант гэта добрыя і прыемныя людзі. Сябры-сантэхнікі рухаліся ў вёску да таварыша Вані-аўганца. Я сказаў, што нядрэнна было б ім узяць мяне з сабою. Яны пераглядваліся і з радасьцю згадзіліся, хоць потым даволі доўга вывучалі мой пашпарт.

Праз кілямэтар мы зьвярнулі на прасёлак. Хата стаяла асабняком. Па ўсім было відаць, што мы прыехалі сюды дарма — у вокнах мёртва, вакол ціха і спакойна. Аднак настойлівыя госьці ўсё ж патрывожылі сон гаспадароў. У дзьверы прасунулася падрапаная пыска чырвоненькай бабулькі. Усё, што я запомніў у ёй — шэры ватнік і мокрыя чырвоныя вочы. Нас як быццам пусьцілі. У пакоі за печкай нехта схамянуўся. Напэўна, Ваня-аўганец. Здарылася так, што ён нічога ня цяміў. Прамаўляючы розныя бяссэнсавыя фразы, Ваня ўвесь час спрабаваў штурхануць на сьцяну п'яную бабульку. Таварышы суворa забаранілі яму рабіць гэта і нават пачалі адцягваць яго ў бок за рукі, спрабуючы ўсадзіць на стол. Адчувалася, што ім было сорамна за сябра.

Кухонны стол быў завалены нечым брудным, недзе на краі кешкаліся тараканы. Трэба было выпіць за сустрэчу — знайшлі адпаведную шклянку. Пакуль Ваня бязмэтна насіўся па пакоях, скідаючы на падлогу розныя прадметы, мы па чарзе выпілі. Узьнікла душэўная размова. На стол падалі цыбулю ў тлушчы, хлеба не было. Прысутныя паставіліся да мяне з разуменьнем і на ўсялякі выпадак вырашылі, што я злодзей. Ня ведаю, куды, але неўзабаве тры таварышы выйшлі ў двор, селі ў машыну і зьехалі. Бабуля да гэтага часу ўжо ўсхліпвала. Яна намагалася, застаўшыся са мною, паведаміць мне нейкую таямніцу свайго жыцьця, аднак моцна саромелася і не падавалася на мае ўгаворы, урэшце так нічога й не распавяла.

Праз дзьве гадзіны вярнуліся сантэхнікі, але чамусьці бяз Вані. Селі за стол, дасталі бутэльку, і душэўная размова працягнулася. Апоўначы, апынуўшыся ў хляву, спрабавалі падаіць карову, але зьдзічэлая жывёліна не давалася. Параіўшыся, вырашылі даць ёй вады. Карова выпіла восем вёдраў. Дзякуй Богу, адратавалі.

Атрымалася так, што ў сем гадзінаў раніцы я ўжо стаяў каля будкі ДАІ на ажыўленай трасе і прасіў у паставых бутэльку вады. Зноў ішоў дождж. Я мала цікавіўся кірункам і, скарыстаўшыся з выпадку, сеў на белы Камаз і паехаў у Пецярбург, хоць мне там рабіць не было чаго.

Цімох Ізотаў

АРХЕАЛЯГІЧНЫЯ АДКРЫЦЬЦІ СЬВЕТУ

Падземнае войска імпэратара

Шыхты тысячаў гліняных воінаў, сотні гліняных коней, калясьніцы і вазьніцы больш 2 тыс. гадоў назад занялі сваю ганаровую варту перад грабніцаю "Сына Неба" — знакамітага кітайскага імпэратара Шы-Хуана — заснавальніка дынастыі Цынь. Гліняныя фігуры людзей глядзяцца настолькі рэалістычна і індывідуальна, што сярод іх нельга ўбачыць аднолькавых твараў...



"Шы-Хуан, упершыню прыйшоўшы да ўлады, пачаў прабіваць гару Лішань і ўладкоўваць у ёй склеп; аб'яднаўшы Паднябесную, ён паслаў туды з усяе Паднябеснае блізу 700 тысячаў злачынцаў. Яны заглыбіліся да трэціх вод, залілі сьцены бронзаю і спусьцілі ўніз саркафаг. Склеп напоўнілі перавезенымі і апушчанымі туды копіямі палацаў і незвычайнымі каштоўнасьцямі. Майстрам замовілі зрабіць лукі-самастрэлы, каб, пастаўленыя там, яны стралялі па тых, хто паспрабуе пракапаць ход і пранікнуць ва ўсыпальніцу..."

Гэтае паведамленьне некалі ў адным з сваіх трактатаў пакінуў кітайскі гісторык Сім Цянь, згадваючы прыгатаваньне пахавальнага склепішча для імпэратара Цынь Шы-Хуана. "Сына Неба" — заснавальнік цынскай імпэрыі правіцель Шы-Хуан (246-210 г. да н.э.) — адна з найбольш вядомых асобаў у раньняй кітайскай гісторыі. Яго нездарма яшчэ называлі "Будаўніком Сьцяны", — пры ім сьцены асобных кітайскіх дзяржаваў былі злучаныя ў адну Вялікую Сьцяну. Скрозь па ўсёй краіне пачалося будаўніцтва ірыгацыйных каналаў і паштовых трактаў. Мільёны людзей працавалі над гэтымі калясальнымі праектамі. За часы свайго ўладараньня імпэратар стандартызаваў кітайскае пісьмо, сыстэму мер, упарадкаваў грашовае абарачэньне і каляндар.

Месца пахаваньня Цынь Шы-Хуана, пра якое згадваў Сім Цянь, і сёньня можна пабачыць у правінцыі Шэньсі недалёка ад горада Сіаня, што на паўночным захадзе Кітая. Усыпальніцы імпэратара знаходзіцца ў нетрах насыпной гары вышынёй 75 м і даўжынёю ў пэрымэтры 2,5 км. Дагэтуль грабніца застаецца нераскапаная археолягамі. Спэцыялісты спадзяюцца, што яе ніхто не рабаваў. Калі ж верыць кітайскім трактатам, усыпальніца Шы-Хуана па колькасьці затрачанай на яе будаўніцтва працы намнога пераўзыходзіць адзін з цудаў сьвету — піраміду фараона Хеопса. Нагадаю, піраміду ў Эгіпце ўзводзіла каля 100.000 будаўнікоў на працягу каля 30 гадоў. Раскопкі пахаваньня Шы-Хуана могуць стацца адной з найвялікшых падзеяў у гісторыі сучаснай археалёгіі.

Першая таямніца грабніцы Шы-Хуана нечакана і неспадзявана адкрылася ў 1974 годзе...

Гліняное войска

Сакавіцкім днём 1974 г., на мясцовасьці, якая ляжыць больш за 1 км на ўсход ад кургана Шы-Хуана сяляне капалі студню. Калі яны наблізіліся да пяцімэтровай глыбіні, зямля нечакана правалілася, адкрываючы вачам велізарнае падземнае сховішча. Археолягі, якія ў хуткім часе апынуліся на месцы здарэньня, зьдзівіліся ня менш за сялян. Пад абрынутымі перакрыцьцямі гіганцкага склепішча можна было разгледзець бясконцыя шэрагі глінянага войска ў поўным ўзбраеньні...

Як высьветлілася пазьней, у падзямельле цягнецца адзінаццаць тунэляў, у якіх стаіць каля 7 тысячаў гліняных воінаў, зробленых у натуральную велічыню. Яны трымаюць сапраўдную зброю, каля іх стаяць гліняныя коні і драўляныя калясьніцы. Перакрыцьці, якія абваліліся ў склепішча, пашкодзілі частку скульптураў. На думку спэцыялістаў, абвал мог адбыцца ў выніку пажара, які здарыўся недзе праз тры гады пасьля сьмерці Шы-Хуана пад час паўстаньня салдат. Тады ж Дынастыя Цынь была зьліквідаваная.

Глінянае войска пашыхтаванае ў баявым парадку па трое. Наперадзе — камандзіры. Авангард зьвернуты тварам на ўсход, а ар'ергард — на захад, як быццам сымбалізуючы бязьмежнасьць імпэратарскай улады на зямлі. Наперадзе стаяць лёгка ўзброеныя воіны з самастрэламі ці лукамі. За імі — шчыльныя шэрагі пяхотнікаў, запрэжаныя чатырма коньмі калясьніцы. Пяхотнікі трымаюць алебарды, коп'і, зброю блізкага бою. Калі ў адных — звычайнае войсковае адзеньне, то ў іншых — багатыя дасьпехі.

Фігуры зробленыя зь мясцовай гліны і абпаленыя пры тэмпэратуры 800°С. Вышыня іх — 178-187 см. Антраполягі пішуць, што гэта значна вышэй за сярэдні рост сучасных кітайцаў. Кідаецца ў вочы найперш тое, што гэта рослыя і дужыя людзі розных узростаў і рангаў.

Апісваючы скульптуры, усе аўтары аднадушна пагаджаюцца з тым, што гэта надзвычай высокамастацкія творы. Кожная фігура мае індывідуальныя рысы. Існуе нават меркаваньне, што ўзорамі для выяваў паслужылі сапраўдныя гвардзейцы імпэратара. "Адзін салдат, магчыма вэтэран, азмрочыўся і шчыльна сьціснуў вусны, у другога зьдзіўлена ўздымаюцца бровы і зіхцяць вочы — мусіць, гэта неспрактыкаваны навабранец, у тэрцяга — закручастыя вусы і бадзёры погляд аптыміста, якога не турбуюць думкі пра сьмерць на пабаявішчы. Ніхто зь іх не падобны адзін да аднаго", — апісваў свае ўражаньні пасьля прагляду скульптур вядомы кітайскі археоляг і журналіст Гу Вэнджы.

Спэцыялісты, якіх цікавіла тагачасная мода, вылучылі ў гліняных гвардзейцаў 25 стыляў барады. Форма яе адпавядала ўзросту, характару, твару, пасадзе воінаў. Найчасьцей, як было прынята ў тыя часы, кітайскія жаўнеры зьбіралі валасы ў вузел на макушцы, зрэдку прыкрываючы галовы пляскатымі з завязкамі шапкамі.

На фігурах і побач зь імі захаваліся сьляды фарбы. Скульптуры расфарбоўваліся ў чырвоны, ружовы, пурпуравы, сіні, зялёны, жоўты, аранжавы, чорны, шэры ды белы колеры.

У складзе глінянага войска налічваецца больш за 600 коней. Усе яны зробленыя з гліны ў натуральную велічыню. У жывёл хвалістыя грывы, завязаныя вузлом хвасты. Коні пільна ўзіраюцца наперад, чакаючы каманды. Бачна, што частка іх прыстасаваная пад лёгкую кавалерыю, а іншыя запрэжаныя ў баявыя драўляныя калясьніцы. Апошніх налічваецца больш за 100. На кожнай калясьніцы — возьніца і два воіны зь дзідамі, мячамі альбо самастрэламі ў руках.

Увогуле зброі надзвычай шмат. Яе налічваецца больш за 10.000 адзінак. Спэцыялістаў уражвае вялікая колькасьць самастрэлаў, што дае падставы лічыць іх адным з асноўных відаў узбраеньня ў старажытным Кітаі. Бронзавыя наканечнікі стрэлаў ды мячы дагэтуль не згубілі свайго бляску і вастрыні.

На скульптурах можна ўбачыць таўро ці надпісы з прозьвішчамі 85 майстроў, якія ляпілі гліняных гвардзейцаў.

Дасьледчыкі выказваюць меркаваньне, што ўвасобленыя ў гліне воіны — копія палацавай варты ці гвардыі імпэратара Шы-Хуана. Чаму сымбалічная імпэратарская варта была разьмешчаная на адлегласьці больш за кілямэтар ад усыпальніцы? Некаторыя вучоныя схільныя патлумачыць гэты факт неабходнасьцю перасьцярогі ад рабаўніцтва магілы.

Аднак трэба дадаць, што Шы-Хуан быў не адзіны імпэратар, які забраў з сабой на той сьвет гліняную гвардыю. Такі звычай быў распаўсюджаны сярод іншых тагачасных правіцеляў і заможнай знаці Кітая. Праўда такога размаху, які мог дазволіць сабе "Сын Неба", не дасягнуў ніхто.

Малыя варты

Да адкрыцьця глінянага войска Цына Шы-Хуана, у 1960-ыя гады ў правінцыі Шэньсі былі знойдзеныя 2 масавыя пахаваньні керамічных скульптураў воінаў. На гары Шыцзышань, што побач з горадам Сюйчжоў ў канцы 1984 г. археолягі адкрылі падземнае склепішча сярэдзіны II ст. да н.э., у чатырох ямах якога стаяла 2300 гліняных фігурак воінаў і 4 кані. Праўда, скульптуры дасягалі памераў усяго толькі 45-55 см.

У 1990 г. кітайскія археолягі знайшлі адно такое ж паменшанае тэракотавае войска II ст. да н.э. Фігуркі жаўнераў вышынёю каля 50 см стаялі ў 24 падзямельлях. Цікава, што ў іх руках не было зброі. Яна кудысьці зьнікла. Скульптуркі фарбаваліся ў чырвоны і аранжавы колеры. Валасы, вочы і вушы падмалёўваліся чонаю фарбаю. На фігурках воінаў, як на ляльках, захаваліся рэшткі сатлелага адзеньня зь лёну і шоўку.

Музэй

Раскопкі, якія пачаліся ў 1970-ыя гады на месцы гіганцкага падземнага сховішча глінянай гвардыі імпэратара Цынь Шы-Хуана, працягваюцца дагэтуль. Адначасова праводзіцца рэстаўрацыя скульптураў, зброі, ды іншых пахавальных рэчаў. На думку спэцыялістаў, раскопкі могуць доўжыцца яшчэ некалькі дзесяцігодзьдзяў. Калясальныя памеры падзямельля і тысячы гліняных фігур вымагаюць вялікіх фінансавых і фізычных выдаткаў, напружаньня дасьледчыкаў.

На месцы ўжо раскапаных тунэляў і пасьля рэстаўрацыі пашкоджаных фігур адкрыты музэй. Гэта вялікі крыты павільён, плошча якога дасягала ў 1989 г. блізу 60 тыс. кв. м. Плянуецца па меры пашырэньня археалягічных і рэстаўрацыйных працаў давесьці музэйную плошчу аж да 300 тыс. кв. м.

Сярод простых кітайцаў павільён атрымаў назву "бі ма юн", што азначае "музэй статуяў і коней". Ён карыстаецца вялікім і нязьменным посьпехам у турыстаў. Кітайскім уладам прыйшлося ў зьвязку з гэтым рэканструяваць пад Сіанем дарогі і нават за 19 км ад горада пабудаваць новы аэрапорт.

Цяжка сабе ўявіць, якая грандыёзная паводле сваіх выдаткаў, арганізацыі і фізычных высілкаў праца была зьдзейсьненая пры стварэньні глінянага падземнага войска. Рэалізаваць такі праект мог толькі "Сын Неба", які бязьмежна ўладарыў над шматмільённым насельніцтвам і ніколькі не сумняваўся ў велічнасьці свайёй асобы і эстэтыцы імпэрскага гігантызму.

З другога боку, татальны ўціск і скрайняя напружанасьць часам можа акрэсьліць недасяжныя ў звычайных умовах вяршыні чалавечых магчымасьцяў. Падземнае войска імпэратара Цынь Шы-Хуана — уражвальнае відовішча і адначасова сьведчаньне адпаведнай эпохі, якая сёньня сымбалізуецца ня толькі Вялікай Сьцяной у бязьмежных кітайскіх прасторах, але і шэрагамі гліняных воінаў пад Сіанем, якія навечна застылі каля свайго Ўладара.

Мікола Крывальцэвіч

Працяг. Пачатак у №№ 17-18 (85) за 12.05.1997.

Аб праўдзе гісторыі

Ці асобныя заўвагі з нагоды артыкулаў Сяргея Ярша і Ігара Пушкіна, апублікаваных у шэрагу нумароў "Нашай Нівы"

... Пакуль у Беларусі выдаецца ўсяго некалькі гістарычных часопісаў, матэрыялы "Шуфляды" — ня толькі своечасовыя, але й вельмі карысныя для гісторыкаў. З кожным днём адыходзяць з жыцьця сьведкі мінулых падзеяў, а значыць, зьнікаюць карысныя, магчыма, адзіныя сьведчаньні і можа згубіцца нешта асабліваe, што дае нам магчымасьць больш поўна і аб'ектыўна зразумець нашу мінуўшчыну.

Я шмат сустракаўся з вэтэранамі вайны: вайскоўцамі, партызанамі і падпольшчыкамі, прачытаў амаль што ўсе апублікаваныя ўспаміны, з многімі аўтарамі апублікаваных мэмуараў сустракаўся па некалькі разоў. Толькі ў гутарках зь імі я разумеў, якая складаная рэч гісторыя, гістарычная праўда. Адчуваў таксама, які ўнутраны *цэнзар* сядзеў у кожным зь іх. Ня ўсякі мог гаварыць пра гэта, шмат хто проста хацеў забыць усё, як дурны сон.

З апублікаваных матэрыялаў "Шуфляды" відаць, што рэдакцыя ўзяла за мэту перш за ўсё зьбіраць і друкаваць матэрыялы на тэмы, якія раней замоўчваліся ці ўвогуле былі закрытымі. Гэтая дзейнасьць ня толькі карысная для гісторыі, але й адказная *(успаміны павінны быць пэўным чынам аформленыя)*, разам з тым гэта яшчэ й вельмі *далікатная* справа. Тут не павінна быць нейкіх *пасьпешлівых сьцьверджаньняў* ці адназначных ацэнак.

Зразумела, што толькі ў сутыкненьні розных поглядаў можна больш глыбока і яскрава разглядзець тую ці іншую падзею. Публікацыя раней закрытых тэмаў, як правіла, выклікае адмоўную рэакцыю ў першую чаргу з боку прыхільнікаў былой савецкай гістарыяграфіі, з боку заангажаванай часткі вэтэранаў, якія любую спробу больш поўнага разгляду, скажам, праблемы партызанскага руху, імкнуцца выдаць за "очернительство", "фальсификацию" і г.д.

Сяргей Ёрш у першым сваім артыкуле сэрыі "Партызанскімі сьцежкамі" ("НН" №37 (75) 16.XII.1996) зь некалькіх размоваў зь людзьмі, якія ведалі камандзіра атрада імя Кірава *Кастуся Нішчанкова*, не зьвяртаючыся нават да архіўных зьвестак, змог рэканструяваць асобныя эпізоды жыцьця і трагічнай сьмерці гэтага чалавека, які карыстаўся павагай мясцовых жыхароў. Можна было б сказаць аўтару дзякуй, каб ня "лыжка дзёгцю" ў першым сказе — "Ці быў справядлівы ў Садоме?" Другім сказам аўтар адказвае: "На Слонімшчыне такі быў". Можна спрачацца, што меў на ўвазе аўтар пад Садомам — партызанскі рух ці ўвогуле вайну? Мне падаецца, што першае.

Ці можна пагадзіцца з такой адзнакай савецкага партызанскага руху? Ці можна таксама пагадзіцца з тэзысам аўтара, што савецкія партызаны ў Заходняй Беларусі ня мелі *цэнтральнага кіраўніцтва*, што прыводзіла да таго, што некаторыя атрады сталіся звычайнымі рабаўніцкімі бандамі? На маю думку, нельга. І вось чаму.

Партызанскі рух у гады ІІ сусьветнай вайны — справа не выключна савецкая. Ён меў месца фактычна ва ўсіх акупаваных немцамі краінах, быў непазьбежным спадарожнікам татальнай зьнішчальнай вайны. Сёньня можна спрачацца пра тое, ці магло савецкае кіраўніцтва, заклікаючы да ўсенароднай барацьбы ў тыле ворага, прадбачыць канчатковыя вынікі гэтай барацьбы. Але тое, што гэтыя вынікі *былі вельмі значнымі і важныя сёньня, не аспрэчваецца ні адным больш-менш сур'ёзным дасьледчыкам*. Можна было б на гэтую тэму не пісаць ніводнай працы, а толькі друкаваць нямецкія дакумэнты, скажам, дзёньнік камандзіра ахоўных войскаў тылу групы арміяў "Цэнтар" генэрала Шэнкендорфа за пэрыяд з 22 чэрвеня 1941 г. і да канца акупацыі. З гэтага дакумэнту бачна, што амаль паўмільённая нямецкая ахоўная армія вяла штодзённую жорсткую барацьбу і несла пры гэтым значныя людзкія і матэрыяльныя страты.

Сёньня мы ведаем, што ў Маскве ўжо ўвосені 1941 г. вырашалася пытаньне пра цэнтралізаванае кіраўніцтва партызанскага руху. Дарэчы, тады Л.Берыя настойваў, каб гэтай справай займаліся спэцыялісты ягонага ведамства, але, як сьведчыць П.Панамарэнка, Сталін адхіліў гэтую прапанову, цьвёрда сказаўшы, што партызанскім рухам павінна кіраваць партыя. Прапанова Берыі зводзілася да стварэньня разгалінаванай сеткі спэцыяльна падрыхтаваных дывэрсантаў і дывэрсійных групаў, якія былі б добра забясьпечаныя адпаведнай спэцтэхнікай і міннападрыўнымі сродкамі з пастаноўкай ім канкрэтных баявых задачаў.

Магчыма, такая дзейнасьць была б больш эфэктыўнай у ваенных адносінах, але мясцовае насельніцтва апынулася б у баку, што супярэчыла марксысцкаму погляду на ролю народных масаў. На прыкладах гішпанскай герылы і барацьбы аўганскага народа яшчэ ў XIX ст. клясыкі марксызму паказалі, што нельга перамагчы народ. Як бачым, Сталін глядзеў далей за свайго вучня.

Што да "стыхійнасьці" і "партызаншчыны", то іх рэцыдывы — непазьбежныя спадарожнікі партызанскіх войнаў. Асаблівасьцю савецкага партызанскага руху было тое, што кампартыя змагла ня толькі ўзначаліць гэты рух, але й прыдаць яму пэўныя арганізацыйныя формы, зрабіць яго кіраваным. Бандытызм і рабаўніцтва існавалі ва ўсе "смутныя" пэрыяды, калі паслаблялася ўлада, жыве гэтая зьява і ў мірны час.

Для таго, каб зразумець тыя падзеі, зразумець тых, хто апынуўся ў лясах улетку-ўвосені 1941 г., хто пайшоў туды ў 1942-44 гадах, дастаткова ўявіць сябе на іх месцы. Кожны дзень трэба было нешта есьці, насіць, недзе спаць, пагаліцца і памыцца, акрамя таго весьці разьведку, несьці вартавую службу, хадзіць на заданьні, займацца баявой вучобай і г.д. Я ўжо не кажу пра зброю і боепрыпасы, пра хваробы, надвор'е і мэдыкамэнты...

Зразумела, што пэўная частка груп і атрадаў на першым этапе вайны ставіла за мэту ня столькі весьці актыўныя дзеяньні, колькі перачакаць, захаваць людзей, назапасіць сілы для таго, каб пачаць актыўныя дзеяньні з падыходам Чырвонай Арміі. Дарэчы, легендарная Вера Харужая, якая ў жніўні 1941 г. выйшла ў савецкі тыл з атрада Васіля Каржа, будучы цяжарнай, у дакладной запісцы для ЦК пісала, што В.Корж не зусім разумее задачы партызанскага руху, бо імкнецца пазьбегнуць баявых сутычак зь немцамі, лічачы, што асноўныя дзеяньні трэба весьці з падыходам Чырвонай Арміі. Каржа і іншых можна зразумець — хто мог тады падумаць, што чакаць прыходу Чырвонай Арміі трэба будзе ня тыдні і месяцы, а шмат гадоў.

Нельга забываць пра тое, што былі і проста бандыцкія групы з былых крымінальнікаў і г.д. Яшчэ адно вельмі вострае пытаньне — забойства мясцовых жыхароў, рэпрэсіі супраць тых, хто пайшоў на службу да акупантаў — жудасная, прыкрая старонка нашай гісторыі. Фактычна адбываўся генацыд, ішло самавынішчэньне народа. Немцы і іх саўдзельнікі зьнішчалі працоўнікаў акупацыйнай сыстэмы, тыя — іх, палякі —камуністаў і сьвядомых беларусаў, апошнія, як маглі, змагаліся з польскім тэрорам і камуністамі. Звычайным было тое, што партызаны і падпольшчыкі маглі зьнішчыць без суда і сьледзтва любога, каго падазравалі ў сувязях зь немцамі. Тое самае рабіла і польскае, акаўскае падпольле. Зразумела, што пры гэтым магла быць і была процьма памылак, асабліва ў першы пэрыяд. Былі яны і пазьней. Стварэньне сыстэмы падпольных партыйных органаў надало гэтай зьяве пэўную бачнасьць законнасьці і правапарадку. Я маю на ўвазе тое, што пачалі дзейнічаць партызанскія суды і трыбуналы з "правамі народных судоў".

Падпольныя партыйныя органы вялі жорсткую барацьбу з праявамі бандытызму, марадзёрства, бытавога разлажэньня, п'янствам і г.д. — і гэта таксама праўда гісторыі. Але аб ёй стараліся не пісаць.

А нават калі пра ўсё напішуць, то ўсё адно гэта ніяк ня зьнізіць аўтарытэт Беларусі як "рэспублікі-партызанкі". Хутчэй наадварот.

Аляксей Літвін

Ад рэдактара

Сёньняшняя публікацыя "камэнтару з працягам" гісторыка Аляксея Літвіна, на маю думку, не здымае дыскусійнасьці з праблемы партызанскага руху ў Беларусі, а наадварот — узмацняе яе. Думаю, мы атрымаем яшчэ не адзін допіс з падтрымкаю або адмаўленьнем тых ці іншых думак. Верагодна, пазыцыі чытачоў будуць фармуявацца ў прасторы паміж звыклай апалягетыкай савецкага партызанскага руху і рашучым непрыняцьцем менавіта гэтае апалягетыкі. Але такая прастора звужае і зьбядняе дыскусію. Бо што сёньня могуць значыць выказваньні накшталт "Сталін глядзеў далей за свайго вучня" ці "клясыкі марксызму паказалі, што нельга перамагчы народ", якія нічога не дадаюць да разуменьня прыроды і сутнасьці тых фактаў, якія былі апісаныя ў сэрыі артыкулаў Сяргея Ярша.

На жаль, наша гістарыяграфія ніяк не наважыцца ўвесьці ў аналіз падзеяў мінулае вайны ключавое паняцьце, якое дазволіць узнавіць поўную карціну гісторыі і зразумець яе сутнасьць. Маю на ўвазе нацыянальныя інтарэсы — тое, на што даўно абапіраюцца расейскія, польскія, французскія ды іншыя гісторыкі мінулае вайны ў іншых краінах. Для Беларусі нацыянальныя інтарэсы ў мінулай вайне застаюцца закрытаю тэмай, найвялікшым табу. Можна сабе ўявіць, што пастаноўка гэтай праблемы прывядзе да калясальнае пераацэнкі ролі розных удзельнікаў тагачаснага жыцьця на акупаванай беларускай тэрыторыі. Гледзячы на прыклад іншых краінаў, можна сьцьвярджаць, што такая пераацэнка немінучая і для беларускай гістарыяграфіі. Рана ці позна мы расплюшчым свае вочы.

За савецкім часам і пры сёньняшнім постсавецкім рэжыме шырокая дыскусія пра беларускія нацыянальныя інтарэсы ў мінулай вайне не ўяўлялася і, на жаль, не ўяўляецца магчымай. Бо гэтае табу, гэтая закрытасьць, гэтае замоўчваньне застаецца адным з краевугольных камянёў аўтарытарызму. Магчыма, гэта нават галоўны камень, або іголка, у якой — сакрэт сьмерці дракона.

Тым ня менш, давайце выказвацца. У тым ліку і пра аўтарытэт "рэспублікі-партызанкі", які, на думку Аляксея Літвіна, яшчэ чакае свайго ўздыму.

Публікацыя ажыцьцёўленая ў рамках праекту "Адна зямля – Усходняя Эўропа". © Архіў Найноўшай Гісторыі.

ПАДПІСКА

ГАРТ

САЮЗ БЕЛАРУСКІХ ПАТРЫЁТАЎ

Усе памятаюць, якой папулярнасьцю ў чытачоў у ранейшыя часы карысталіся кнігі ўспамінаў — мэмуары савецкіх партызан і падпольшчыкаў, васначальнікаў і чэкістаў. Сёньня мы прапануем Вам успаміны людзей — з другога боку лініі барацьбы. Гэта мэмуары 12-ці ўдзельнікаў Саюзу Беларускіх Патрыётаў — нелегальнай арганізацыі беларускіх студэнтаў, якія ў 1945-47 гадах аб'ядналіся супраць русіфікацыі і далі прысягу служыць Бацькаўшчыне:

"Я (кожны называў сваё імя і прозьвішча), уступаючы ў Саюз Беларускіх Патрыётаў, прысягаю перад Бацькаўшчынай і беларускім народам, што заўсёды буду верны ідэалам свабоды і незалежнасьці Беларусі. Калі ж па слабасьці сваёй або па злому намеру я парушу гэтую прысягу і выдам тайну сяброў, хай пакарае мяне Бог ганебнай сьмерцю здрадніка Радзімы".

У 1947-м Саюз Беларускіх Патрыётаў быў разгромлены балыпавіцкімі карнымі органамі. На двух працэсах былі асуджаныя 44 сябры СБП. Чатыром была прысуджаная сьмяротная кара, якую пасьля замянілі на 25 гадоў, астатнія таксама пайшлі ў ГУЛАГ на доўгія тэрміны зьняволеньня...

Кніга ўспамінаў "Гарт", акрамя мэмуараў, уключае ў сябе прадмову ўкладальніка Германа Кірылава, індэкс асобаў і прадметна-геаграфічны паказальнік, больш за 60 дакумэнтальных фатаздымкаў. Выдавецтва "Наша Ніва", якое падрыхтавала кнігу да друку, мяркуе выдаць яе ўжо ў гэтым месяцы.

Зразумела, што тыраж будзе невялікі. Таму, каб забясьпечыць усіх зацікаўленых чытачоў, выдавецтва абвяшчае папярэднюю падпіску на кнігі. Падпісанты першымі атрымаюць кнігу праз пошту. Яны заплацяць крыху наперад, затое ў два разы менеі, чым гэта будзе каштаваць у гандлі пасьля выхаду другой партыі кнігі. Акрамя гэтага, сваімі грашыма яны паспрыяюць самому выхаду кнігі.

Каб зрабіць папярэднюю замову, трэба 37.000 рублёў праз пошту пералічыць на наступны рахунак:

БГФ "Наша Ніва" р/р 3015201930039 "Гарант" філія АКБ "Поіск" г. Менску, код 987.

(У названую суму ўваходзіць кошт перасылкі кнігі ў межах Беларусі.)

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары "Для пісьмовага паведамленыя" ўказаць: "падпіска — СБП" і Ваш дакладны паштовы адрас.

ВЫДАВЕЦТВА "НАША НІВА"

інфармацыйнае забеспячэнне
Belarusian Public Relations Association

ІНФАРМАТАР

ПАДЗЕІ ГОДУ

425 гадоў таму заснаваная Лоская друкарня, адзін з цэнтраў рэфармацыйнага кнігадрукаванья ў 16 ст. Існавала з 1572 да 1592 у мястэчку Лоск (Валожынскі раён). Заснаваная магнатам Янам Кішкам, які ў 1572 купіў яе ў братоў Кавячынскіх зь Нясьвіжа і запрасіў на працу Д.Ланчыцкага і С.Буднага.

225 гадоў таму Магілёў стаў цэнтрам Магілёўскай правінцыі, Магілёўскай губэрні. Тады ж утвораная ўласна Магілёўская губэрня.

200 гадоў таму пачалі будаўніцтва Лідзкага Юсіфаўскага касьцёлу піяраў. Касьцёл зьяўляецца помнікам архітэктуры клясыцызму. Будаўніцтва вялося да 1825. У 1863 касьцёл піяраў перароблены ў праваслаўную царкву.

125 гадоў таму нарадзілася Купрыянава Настасься Фамінічна, маці-патрыётка, чые пяцёра сыноў загінулі падчас II сусьветнай вайны. Купрыянава стала прабобразам гераіні манумэнта ў гонар Маці-патрыёткі, пастаўленага ў Жодзіне ў 1975. Купрыянава пражыла 107 гадоў.

100 гадоў таму ў в. Варкавічы Слуцкага раёну нарадзіўся вядомы беларускі палітычны дзеяч Юры Лістапад. Лістапад быў удзельнікам Слуцкага паўстаньня, сябрам Беларускай Рады Случчыны (1920). У 1925 арыштаваны ГПУ БССР, як кіраўнік "контарэвалюцыйнай арганізацыі", у якую ўваходзілі настаўнікі і слухачы агульнаадукацыйных курсаў Слуцка (т.зв. "лістападаўшчына"), асуджаны на пяць гадоў турмы. У 1927 вызвалены. Улетку 1930 арыштаваны ў справе "Саюзу вызваленьня Беларусі", вызвалены. У кастрычніку 1933 арыштаваны ў справе "Беларускага нацыянальнага цэнтру" і ў студзені 1934 асуджаны на 8 гадоў лягераў. У 1938 расстраляны.

75 гадоў таму Я.Купала сканчае працу над "Тутэйшымі" — вяршыняй сатырычнай камэдыяграфіі. У гэтым творы зь незвычайным патасам упершыню агаляліся актуальна-палітычныя праблемы ўзаемаадносінаў усходніх і заходніх суседзяў Беларусі ў іх дачыненьні да беларускага нацыянальнага адраджэньня.

50 гадоў таму вядомы беларускі скульптар, доктар архітэктуры Язэп Лангбард становіцца выкладчыкам Інстытуту жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна ў Ленінградзе. Асноўныя працы Лангбарда ў Менску: Дом ураду, Дом афіцэраў (1939), Опэрны тэатар (1937), корпус Прэзыдыюму АН Беларусі (1937).

25 гадоў таму Бэрнард Нгэнэа на раскопках ў Кубі-Фора каля возера Туркана на поўначы Кеніі знайшоў акамянелы чэрап прадстаўніка роду Homo. Чэрап меў веку 1,9 млн гадоў, захоўваецца ў Нацыянальным музэі Кеніі.

25 гадоў таму зарэгістраванае апошняе вывяржэньне вулкана Ключэўская сопка, паўвыспа Камчатка. За апошнія 270 гадоў вулкан вывяргаўся больш за 50 разоў.

25 гадоў таму ўвесну быў пабудаваны самы вялікі крэматорый у сьвеце, які знаходзіцца на Мікола-Архангельскіх могілках (Балашыхінскі раён Маскоўскай вобласьці). У крэма-торыі абсталяваныя 7 падвойных крэмацыйных камэраў ангельскай канструкцыі. У рытуальным будынку крэматорыя знаходзяцца 6 заляў разьвітаньня.

ТРАВЕНЬ

26 траўня

25 гадоў таму быў узарваны гатэль "Трэймар" (Атлянтык-Сыці, штат Нью-Джэрсі, ЗША). Гатэль стаў самым вялікім збудаваньнем (21 паверх), якое было ўзарваная скіраваным выбухам. Узарвала яго фірма "Кантролд дэмалішэн" з Таўсана (штат Мэрылэнд, ЗША). Аб'ём памешканьняў гатэля складаў 181.340 м3 на 600 нумароў.

27 траўня

25 гадоў таму на плата Джыдатэль-Харасыс у Паўднёвым Амане былі забітыя тры і злоўленыя чатыры жывёлы, якія вядомыя пад назовам Арабійскага орыкса. З таго часу гэтых жывёлаў больш не назіралі ў дзікай прыродзе.

28 траўня

25 гадоў таму Герцаг Вінсдорскі, які стаў каралём Эдвардам VIII, калі ажаніўся на міс Уолес Уарфілд Сымпсан, амэрыканскай прынцэсе, памёр у Парыжы ва ўзросьце 77 год.

30 траўня

25 гадоў таму тры ўзброеныя японцы, байцы леватэрарыстычнай арганізацыі "Рэнго сэкітур" забілі 28 чалавек у аэрапорце Лод у Тэль-Авіве.

ЧЭРВЕНЬ

25 гадоў таму Лоўэл Эліёт, 61 году, на сваёй фэрме ў Пэру (штат Індыяна, ЗША) знайшоў 500 тыс. даляраў. Іх выраніў драпежнік, які спускаўся на парашуце. Гэта была самая вялікая ў гісторыі сьвету сума наяўных грошай, якую вярнулі законным уладальнікам.

1 чэрвеня

25 гадоў таму ў лябараторных умовах марская сьвінка дала самы вялікі памёт (для гэтага віду жывёлы) — 12 парсючкоў.

5 чэрвеня

50 гадоў таму ЗША прапанавалі плян Маршала для краінаў Заходняй Эўропы.

6 чэрвеня

100 гадоў таму зь Нью-Ёрку стартавала судна Фокс (5,58 м) з Джорджам Харбоў і Франкам Самуэльсанам (Нарвэгія) на борце. Гэта было першае трансатлянтычнае падарожжа на вёслах, якое доўжылася 55 дзён і фінішавала на выспах Сілі 1 жніўня.

6 чэрвеня

25 гадоў таму ў Ванкі (Радэзія) выбух магутнай міны забіў 427 чалавек.

9-10 чэрвеня

25 гадоў таму ў Рапід Сыці (штат Паўднёвая Дакота) пачаўся масавы голад, які забраў 226 жыцьцяў і нанес стратаў на $120 млн.

10 чэрвеня

25 гадоў таму вылупіўся самы буйны ў няволі кракадзіл, гібрыд грэбністага і сіямскага кракадзілаў, мянушка Яй. Кракадзіл утрымліваецца ў знакамітым гадавальніку пры заапарку Самутпракан (Тайлянд). Яго даўжыня — 6 м, вага — 1114,27 кг.

і Бясплатныя прыватныя абвесткі

Дзе ты, беларускамоўная дзяўчына-патрыётка? Цябе шукае малады хлопец, які хранічна не ўспрымае "нармальнай" мовы. Аўсянікаў Зьмітрусь. Віцебская вобл., Дубровенскі р-н, в. Баброва

Маю неабходнасьць у знаёмстве зь людзьмі, якія некалькі разоў на месяц наведваюць Горадню, Ліду, Гомель і іншыя гарады. 220085, Менск, а/с 5. Тэл.: 39-78-49, Супрановіч Віталь

Шукаю рэдкія запісы беларускіх рок-гуртоў, бардаў. Тэл.: 256-12-14, Сяржук

Мяняю 1-пак. кв. у Віцебску ці 2-пак. кв. у Воршы на кватэру ў іншым горадзе Беларусі, Расеі, Кіеве. 210001, Віцебск-1, а/с 39

Куплю тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Танна. Тэл.: 257-26-57, Анатоль

Праца дома. Заробак 4 млн. руб. Кароткую анкету, купон б/а, капэрта са зв/а. 220073, Менск, а/с 48

Праца або прыробак для ўсіх. Тэл.: 273-39-38 (з 18.00 да 22.00) Вольга Мікалаеўна

Увага! Маю на рэалізацыю кнігі і часопісы: "Менская вясна" (35.000), "Унія" №1-4 (12.00), Біблія. Кніга Роду (20.000), Н.Арсеньнева "Яшчэ адна вясна" (60.000), "Аршанская Шляхта" (20.000) і інш. 220085 Менск-85, а/с 5. Тэл.: 39-78-49, Супрановіч Віталь

Дзіцячыя стол-крэселка, конік-гушкалка і ванначка — танна прадаю, беларускамоўнаму пакупніку скідка 30%. Аптоваму пакупніку скідка 20%. Тэл.: 249-56-09. Валера

Арганізацыя нацыянальна сьвядомай моладзі будзе ўдзячная за дасланыя наступныя кнігі: А.Літвін "Беларуская Краёвая Абарона", А.Калубовіч "Крокі гісторыі", Ю.Туронак "Беларусь пад нямецкай акупацыяй", "З гісторыі ўніяцтва ў Беларусі" (выд. Акадэмічн.), "Гарт. Саюз Беларускіх Патрыётаў". Выказваем надзею, што з тымі ахвярнымі беларусамі, якія гатовыя дапамагчы нам, наладзіцца таксама і больш цеснае супрацоўніцтва на ніве Адраджэньня. 224028 Берасьце, вул. Маскоўская 390/2-16

Шаноўнае спадарства! Запрашаем да супрацоўніцтва ў справе аднаўленьня БАПЦ у Беларусі. Калі Вас цікавіць гісторыя і сучасная дзейнасьць БАПЦ на эміграцыі, калі Вы жадаеце атрымліваць газэту БАПЦ "Царкоўны Пасланец", жадаеце і маеце магчымасьць дапамагчы ў справе аднаўленьня БАПЦ у Беларусі, то пішыце, выказвайце свае думкі і меркаваньні на адрас: 220005, Менск-5, а/с 185 "ЦП"

Прашу Ігара Матавілава тэрмінова патэлефанаваць: 261-21-78

Ірэначка, з Днём народзінаў. Жыцьцё толькі пачынаецца, і таму самае лепшае яшчэ наперадзе. Сябры

Праца дома. Даход да 800$. Ад Вас капэрта са зв/а. 222310, Маладэчна-4, а/с 22

Прапаную хатнюю працу з газэтамі ды часопісамі. Дашліце капэрту з Вашым адрасам. 220131, Менск-131, а/с 162

Прадам вымяральнік ціску — таномэтар (Японія). Тэл.: 231-80-14, 227-95-42

КУПОН
бясплатнай прыватнай абвесткі

Тэкст:

Імя і прозьвішча. Адрас, тэлефон

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 4 радкі) бясплатна.

220123, Менск, а/с 71

Шаноўныя чытачы! На гэтым здымку мы скончаем наш конкурс, прысьвечаны падарожжам нашых аўтараў, парэшце чакаем Вашых адказаў. Адказы мусяць быць дасланымі не пазьней як за тыдзень пасьля гэтага нумару "НН". Пераможцаў чакаюць прызы. Чакаем Вашых лістоў. Да сустрэчы!

Базавыя шапікі "НН" у Менску

(працуюць безь перапынку на абед і ў выходныя дні)

раён	№ шапіка	адрас
Ленінскі	№11	пр. Ф.Скарыны, 10 (каля Паштамту)
	№110	вул. Пуліхава, 3 (каля гастраному)
Цэнтральны	№1	пр. Ф.Скарыны, 38 (крама "Хлеб", мэтро "Пл. Перамогі")
	№109	вул. Заслаўская, 9 (каля гастраному "Заслаўе")
Кастрычніцкі	№41	вул. Маскоўская, 20 (каля ДБ, мэтро "Ін-т культуры")
	№303	АС "Дружная"
Маскоўскі	№255	пр. газэты "Правда", 14а
	№289	пр. Любімава, 26-1
Фрунзенскі	№14	вул. Арлоўская — Фінская запраўка
	крама №21	станцыя мэтро "Пушкінская"
Савецкі	№133	вул. В.Харужай, 6 (каля прыпынку "Камар.рынак")
	№225	вул. Кальцова, 48
Першамайскі	№162	пр. Ф.Скарыны, 89
	№164	пр. Скарыны — мэтро "Парк Чалюскінцаў"
Заводзкі	№200	пр. Партызанскі, 36
	№254	вул. Сурганава, 17
Партызанскі	№214	пр. Ракасоўскага, 119 (насупраць кіно "Салют")
	крама №2	пр. Ф.Скарыны, 44 (каля крамы "Оптыка")

Увага! У кнігарні "Сьветач" (пр-т Машэрава, 11) можна набыць "Нашу Ніву" па самых нізкіх у Менску коштах. У дзень выхаду газэты (панядзелак) у краме "Сьветач" "Нашу Ніву" можна набыць з 13.00.

Перад вамі трэці выпуск "Беларускага хіт-параду" за красавік-травень 1997 году, які сфармаваны па выніках продажу касэтаў сыстэмы "Касэта-поштай" і ў камэрцыйным шапіку на прыпынку "Ўнівэрсам Рыга", "крама Трыкатаж".

Спачатку пра зьнешні выгляд самой табліцы. У ёй зьявіўся новы слупок, які ўмоўна пазначаецца "XZ", вызначае месца выканаўцы ў мінулым выпуску хіт-параду. Зроблены ён для таго, каб Вы маглі назіраць за рэйтынгам і ўдзельнічаць у яго фармаваньні праз продаж.

Зараз зьвернемся да самога хіт-параду. Як бачым, пакінулі сьпіс гурт "Крама" (альбом "Камэндант"), А.Мельнікаў ("Шлях", 2 часткі), Ален ("Нармалёк-2 альбо міфія"), "Уліс" (Танцы па даху"), "Камэлот" ("У краіне талераў"). Асабліва зьдзівіў Ален, які нечакана ўварваўся ў папярэдні рэйтынг і гэтак жа нечакана зьнік. Але вера ў тое, што беларускамоўная поп-музыка зможа прабіцца да масавага слухача, не пакідае нас, таму мы зычым Алену хутчэйшага вяртаньня ў хіт-парад.

У гэтым выпуску зьявіліся й дэбютанты: "Палац", Вольга Акуліч ("Трохкутнік"), Эдуард Акулін ("Мая Крывія"), "Крама" ("Хворы на rock-n-roll"), Зьміцер Бартосік ("Да пабачэньня"). Як бачым, палова дэбютантаў — гэта вядомыя барды, што таксама дзіўна: у папярэднім выпуску бардаў прадстаўляў толькі Андрэй Мельнікаў. Чым гэта можна патлумачыць? Хіба тым, што вясна — гэта заўсёды вясна, нават калі яна й "Менская". У лік дэбютантаў трапілі "Крама" й "Палац" з альбомамі адпаведна 1993 і 1995 г. Гэты факт яшчэ раз сьведчыць пра неразьвітасьць шоў-бізнэсу ў краіне. Праўда, "Крама" спрабавала выдаць свой "The Best", але там няма ніводнай новай кампазыцыі, якія б маглі забясьпечыць добрую раскупляльнасьць альбому.

Сталае трэцяе месца "Маёй краіны" "Новага Неба" і вяртаньне ў тройку лідэраў N.R.M. ("Одзірыдзідзіна") ня сталася нечаканасьцю. Пасьля сэрыі канцэртаў, якія даваў гэты "залаты дуэт" вясною (асабліва ж "Легенда друку й Легенды року" ў менскай "Рэзэрвацыі"), а таксама сэрыі вулічных акцыяў, на якіх "партызанскую" вывучылі нават міліцыя з амонам, посьпех гуртоў быў прагназаваным. Дарэчы, апошні факт — прагназаванасьць — ня можа ня радаваць, асабліва людзей, якія жадаюць укладваць свае грошы ў беларускую музыку.

Нарэшце, першую пазыцыю ізноў займае Данчык з альбомам "Мы яшчэ сустрэнемся". Вялікі попыт на касэты сп. Андрусішына не спадае нават пасьля канцэртаў 3-месяцовай даўніны, і гэта сапраўды рэкорд.

Паважаныя чытачы! Мы зьвяртаемся да Вас з пытаньнем: ці мае сэнс уносіць у Беларускі хіт-парад расейскамоўныя гурты (напрыклад "Нейро Дюбель")? Таксама нагадваем, што ў канцы году будуць вызначаныя лепшыя альбомы. Дасылайце свае варыянты на адрас: 220085, Менск а/с 5, "Беларускі хіт-парад". Пераможцы атрымаюць прызы.

Сяргей Сахараў

Красавік — Травень

X	XZ	Выканаўца	Альбом	Выдавец
1	1	Данчык	Мы яшчэ сустрэнемся	Фан-клюб Данчыка
2	4	N.R.M.	Одзірыдзідзіна	Каўчэг
3	3	Новае Неба	Мая краіна	Каўчэг
4	2	Віктар Шалкевіч	Смутны беларускі блюз	Ton Records
5	-	Зьміцер Бартосік	Да пабачэньня	Літ.маст.суполка
6	-	Крама	Хворы на Rock'n roll	Каўчэг
7	-	Эдуард Акулін	Мая Крынія	Саціс
8	9	Новае Неба	Выбранае	Саціс, "Уши"
9	-	Вольга Акуліч	Трохкутнік	Літ.-маст.суполка
10	-	Палац	Palace	Vigma

X — *месца ў гэтым выпуску*
XZ — *месца ў папярэднім выпуску*

ІНДЭКС ПАЦЯРПЕЛЫХ 1996

ІНДЭКС складзены на падставе заяваў саміх ахвяраў у Гэльсынскі камітэт, Управу БНФ, Архіў Найноўшае Гісторыі, сведчанняў іншых праваабарончых арганізацыяў, сведкаў і ўдзельнікаў падзеяў, матэрыялаў, сабраных Беларускім ПЭН-цэнтрам, а таксама паводле публікацыяў прэсы. Таму сьпіс ня можа разглядацца як юрыдычны дакумэнт. Ён далёка не ахоплівае ўсіх тых, хто пацярпеў ад рэжыму на працягу 1996 году. Згодна з інфармацыяй прэсы, міліцыі, пракуратуры можна лічыць, што толькі за вясну-лета 1996-га затрыманых міліцыяй на той ці іншы тэрмін за ўдзел у розных палітычных і праваабарончых акцыях было ня менш за чатырыста чалавек. Больш за сто чалавек былі зьбітыя. Але далёка ня ўсе зь іх адзначаныя ў ІНДЭКСЕ. Некаторыя не палічылі важным падаць пра сябе зьвесткі, іншыя ня ведалі куды, многія проста баяцца далейшых рэпрэсіяў, непрыемнасьцяў на працы, складанасьцяў з роднымі, суседзямі. Страх ізноў становіцца характэрнай рысай беларускага жыцьця.

Ва ўсіх выпадках, дзе не ўказаны горад, гутарка ідзе пра Менск.

АБАДОЎСКІ Сяргей, сябра Гэльсынскага камітэту, Магілёў. Затрыманы 10.12.96 ў Магілёве падчас пікету, прысьвечанага міжнароднаму Дню правоў чалавека. Распаўсюджваў разам з В.Сівухам улёткі з тэкстам Дэклярацыі правоў чалавека.

АБАЛІК Нэлі. Бачыла, як 24.3.1996 амонавец зьбіваў жанчыну гадоў 55-ці ў чорным паліто; зьбівалі таксама хлопца гадоў 30-ці ў карычневай куртцы; мужчыну ў сьветлым паліто міліцыянт пырснуў з балёнчыка ў вочы газам; высокага мужчыну амонавец стукнуў па кінакамэры і зьбіў зь яго акуляры, калі той паспрабаваў іх падняць, два амонаўцы пачалі зьбіваць яго дубінкамі і нагамі; амонавец выхапіў у хлопца з рук сьцяг і зубамі разарваў яго.

АДАМОВІЧ Славамір, паэт. Арыштаваны КГБ 05.4.96. Зьняволены за верш "Убей президента", надрукаваны ў Віцебскай газэце "Выбар". Інкрымінуецца заклік да тэрарыстычнага акту, спроба незаконнага пераходу мяжы, трыманьне халоднай зброі. Суд пачаўся ў Віцебску 03.9.96, неаднаразова адкладаўся і дагэтуль працягваецца (травень 1997). Мера стрыманьня Адамовіча пад ціскам міжнароднай грамадзкасьці зьменена толькі 07.2.97. Больш за дзесяць месяцаў паэт правёў за кратамі, 8 дзён трымаў сухую галадоўку.

АДАМЧЫК Анджэй, супрацоўнік прафсаюзу "Салідарнасьць" (Польшча). 14.5.96 затрыманы разам зь лідэрам "Салідарнасьці" М.Кшаклеўскім і выдвораны зь Беларусі.

АДЦУКЕВІЧ Анатоль, 55 гадоў, чыгуначнік. Арыштаваны і асуджаны да штрафу ў 200.000 руб. за ўдзел 17.12.96 ў пікеце ў абарону зьняволеных падчас шэсьця 08.12.96.

АЙНУДДЗІНАЎ Аляксандар. Затрыманы 19.10.96 каля ўнівэрсаму "Рыга" ўжо пасьля заканчэньня мітынгу апазыцыі. Атрымаў 5 сутак адміністрацыйнага арышту.

АЛІСЁНАК Віталь. 25.5.96 затрыманы пад час правядзеньня Дня памяці М.Багдановіча разам зь іншымі трыма ўдзельнікамі гэтай імпрэзы.

АЛЬХОЎСКІ Васіль, шахцёр, Салігорск. Удзельнік пешага маршу-пратэсту ад Салігорску да Менску, які пачаўся 16.10.96. На працягу маршу затрымліваўся і быў засуджаны пяць разоў. Пакараны штрафамі. Алошняе затрыманьне 21.10.96 каля аэрапорту Менск-1.

АМЕЛЬЧАНКА Аляксандар, 29 гадоў. 30.5.96 затрыманы каля кавярні "Пінгвін" на вул. Леніна людзьмі ў цывільным. Пасьля затрыманьня зьбіты. Сьведка зьбіцьця З.Ждановіча. Асуджаны на пяць сутак арышту.

АНТОНАЎ Руслан, 1975 г. нар. За падзеі 26.04.96 судом Фрунзэнскага р-ну 29.04.96 аштрафаваны на 200 тыс. руб.

АНТОНІК Кацярына, сакратарка дэпутата ВС В.Ганчара. Параненая стрэлам з аўтамата пры ўзброеным нападзе міліцыянтаў на машыну В.Ганчара.

АНЦЫПОВІЧ Мікалай. 26.04.96 пасьля мітынгу затрыманы каля ГУМу, атручаны газам, страціў прытомнасьць. З Цэнтральнага РАУС забраны "хуткай дапамогай" у 5-ю клінічную лякарню. Дыяг наз: "чэрапна-мазгавая траўма".

АПЕЙКА Марыя, 50 гадоў. 26.04.96 зьняважаная і зьбітая спэцназаўцамі ў раёне пл. Волі. У яе адабралі бел-чырвона-белы сьцяг.

АНТОНЧЫК Сяргей, дэпутат Менскага гарсавету, адзін зь лідэраў рабочага руху. Затрыманы міліцыяй пасьля выступу на прафсаюзным сходзе гандляроў "Дынама" 26.09.96. Пратрыманы ў Ленінскім РАУС дзьве гадзіны і выпушчаны.

АПРЫШКА Алесь, інжынэр, адзін зь лідэраў Нацыянальна-Дэмакратычнай партыі Беларусі. 30.05.96 у раёне ГУМу затрыманы і зьбіты амонаўцамі. Судзьдзя Фрунзэнскага райсуда Дулуб Е. асудзіў Апрышку на пяць сутак арышту.

АРЭСТОВІЧ Дзьмітры. 30.5.96 арыштаваны і адпушчаны.

БАБАЕД Віктар, шахцёр, Салігорск, старшыня Незалежнага прафсаюзу гарнякоў. З 16 да 22 кастрычніка пяць разоў затрымліваўся, засуджаны за ўдзел у маршы-пратэсту салігорскіх шахцёраў на Менск.

БАНЭЛЬ Эльяш. 29.5.96 затрыманы ў мікрараёне Зялёны Луг за распаўсюджваньне абвестак аб пікеце ў абарону палітзьняволеных 30 траўня. Прысуджаны да штрафу 60.000 руб.

БІЧ Алесь, прадпрымальнік. Затрыманы 8.12.96 каля пл. Перамогі, дзе стаяў зь сябрамі. Міліцыянт схапіў Алеся за крысо курткі і без тлумачэньня пацягнуў у міліцэйскі аўтобус. Да 9 сьнежня знаходзіўся ў спэцпрыёмніку. Справа перададзеная ў суд Цэнтральнага раёну. Пракуратура спрабуе ўзбудзіць супраць яго крымінальную справу.

БАГІНСКІ Павал, 1977 г. нар. 26.4.96 затрыманы на тралейбусным прыпынку каля ст. мэтро Кастрычніцкая, зьбіты. У 22.20 выпушчаны без складаньня пратаколу аб затрыманьні. Зьвярнуўся ў пракуратуру Цэнтральнага р-ну г. Менску для прызначэньня судова-мэдычнае экспэртызы.

БАРШЧЭЎСКІ Лявон, намесьнік старшыні БНФ. 29.3.96 затрыманы за ўдзел у пікеце каля расейскага пасольства. Асуджаны судом Цэнтральнага р-ну на 1 млн. руб. 26.4.96 затрыманы ў штаб-кватэры БНФ невядомымі ў цывільным. Выпушчаны праз тры дні.

БАТУРА Ўладзімер, 1975 г. нар. 29.6.96 асуджаны судом Фрунзэнскага р-ну за падзеі 26.4.96 на 10 сутак арышту.

БОНДАР Аксенці. 26.4.96 зьбіты пад час шэсьця.

БОНДАРАЎ Яўген, 1973 г. нар. Пасьля зьбіцьця амонам забраны "хуткай дапамогай". Асуджаны за ўдзел у несанкцыяваным шэсьці 26.04.96.

БУДАЙ Ніна, беспрацоўная. 20.11.1996 у 19.00 арыштаваная амонаўцамі каля касьцёлу Сьв. Сымона і Алены. Адвезеная ў Маскоўскі РАУС. Складзены пратакол за ўдзел у несанкцыянаваным мітынгу і распаўсюджваньні ўлётак. У РАУСе адабраны пашпарт і выпісаная позва ў суд на 21.11.96. Асуджаная судом Маскоўскага р-ну, атрымала папярэджаньне.

БУРАКОЎ Аляксандар, 22 гады, Магілёў. У верасьні асуджаны на сем сутак за надпіс на сьцяне дома "Лукаша за краты".

БУРАНОК Аляксей, непаўналетні. 30.5.96 затрыманы і зьбіты. Справа накіраваная ў райаддзел міліцыі.

БУРЛАКА Андрэй, студэнт, грамадзянін Украіны. Арыштаваны 26.4.96. Асуджаны да 1 году турмы. Амніставаны 20.12.96.

БЯЗРУЧКІНА Ніна. 24.7.96 затрыманая разам зь сястрою Валянцінай Пруднікавай каля праваслаўнага катэдральнага сабору за тое, што абмяркоўвалі сатанінскія надпісы на сьцяне сабору. Справа ня ўзбуджаная.

БЯЛОЎ Вячаслаў. Арыштаваны 30.5.96, асуджаны на 10 сутак.

БЯЛОЎСКІ Ян, супрацоўнік "Радыё 101,2". 30.5.96 каля ГУМу зьбіты амонаўцамі, атрымаў страсеньне мозгу.

БЯЛЯЦКІ Аляксандар, сакратар управы БНФ, дэпутат Менскага гарсавету. На працягу васьмі месяцаў 1996 за ўдзел у пікетах і дэманстрацыях незаконна затрымліваўся міліцыяй сем разоў.

БЯЛЯЧЫЦ Станіслаў, дэпутат Менскага гарсавету. 26.4.96 зьбіты міліцыянтамі каля пл. Якуба Коласа за спробу абараніць мужчыну, якога зьбівалі міліцыянты.

БЯРОЗКА А. 20.4.96 затрыманы ў Магілёве.

ВАЖНІК Ірына. Затрыманая ў 23:00 26.4.96 у штаб-кватэры БНФ, асуджаная закрытым судом на 3 сутак паводле арт. 167.

ВАЙТОВІЧ Мікалай, 1957 г. нар. 29.4.96 за ўдзел у падзеях 26.4.96 асуджаны на 200 тыс. руб. Судзьдзя Л.Лапо.

ВАЛУЙ Лявон, жыхар вёскі Выгар Лагойскага раёну. Арыштаваны 8.12.96 за ўдзел у антыпрэзыдэнцкай дэманстрацыі і "супраціў міліцыі". Пры сабе меў плякаты і нацыянальны сьцяг. Лявона завезьлі ў спэцпрыёмнік, адтуль 9 сьнежня перавезьлі ў Цэнтральны суд, які прысудзіў Л.Валую трое сутак арышту.

ВАРЫВАЦКІ Вадзім, 1977 г. нар. За падзеі 26.4.96 паводле арт. 156 аштрафаваны на 200 тыс. руб.

ВАСІЛЕЎСКІ Пётра, журналіст. 26.4.96 зьбітага з ног амонаўцы некалькі разоў ударылі дубінкамі.

ВАСІЛЬЕЎ Уладзімер. Асуджаны за падзеі 26.4.96 на 3 сутак.

ВЕРАМЕЙ А. Затрыманая 20.11.96 за касьцёлам Сьв. Сымона і Алены. Адвезеная ў Маскоўскі РАУС.

ВЕРАЦІНСКІ Генадзь. Зьбіты й арыштаваны 30.5.96, асуджаны на 4 сутак зьняволеньня.

ВІНЯРСКІ Генадзь. Схоплены і адпушчаны 30.5.96.

ВЯРОЎКІН-ШЭЛЮТА Ўладзіслаў, 26 гадоў, незалежны гісторык. Праходзіў сьведкам у справе А.Рамашэўскага. У судзе заявіў, што будзе адказваць толькі па-беларуску. У ліпені суд Ленінскага раёну ўзбудзіў супраць яго справу за "адмову ад дачы паказаньняў", "дачу ілжывых паказаньняў".

ВЯЧОРКА Вінцук, намесьнік старшыні БНФ. 27.4.1996 у 11 гадзінаў затрыманы ў дварэ свайго дому двума невядомымі ў цывільным, якія сілай упіхнулі яго ў машыну. Абвясьцілі галадоўку пратэсту. Выпушчаны праз тры дні пад падпіску аб нявыезьдзе. Заведзеная крымінальная справа ў зьвязку з падзеямі 26.4.96.

ГАЛІНСКІ Цэзары, карэспандэнт "Газэты Выборчай", грамадзянін Польшчы. Жорстка зьбіты міліцыянтамі 26.4.96, страціў прытомнасьць.

ГАРДЗІЕНКА Алег, 18 гадоў, студэнт. Затрыманы 26.4.96. Асуджаны на 15 сутак, 29 красавіка абвясьцілі галадоўку.

ГАЛАЕНКА Ігар, жыхар Лагойску. Затрыманы 12.12.96 за ўдзел у пікеце. Прысуджаны штраф.

ГАНЧАРЫК Міхась, прыватны вэтэрынар. Арыштаваны 8.12.96. Усю ноч яго трымалі ў спэцпрыёмніку. На наступны дзень суд Маскоўскага раёну аштрафаваў яго на 500 тыс. рублёў.

ГІЛЕВІЧ Сяргей, жыхар Лагойску, беспрацоўны. 8.12.96 стаяў на праспэкце Скарыны. Да яго падышлі людзі ў цывільным і безь ніякіх тлумачэньняў запіхнулі ў міліцэйскую машыну. З Цэнтральнага РАУС яго перавезьлі ў спэцпрыёмнік, дзе пратрымалі да 9 сьнежня. Міліцыя запісала ў пратаколе, што Гілевіч выкрыкваў лёзунгі "Луку на муку", "Далоў Луку".

ГЛУЩАКОЎ Юры. Затрыманы 19.10.96 каля ўнівэрсаму "Рыга" ўжо пасьля заканчэньня мітынгу апазыцыі. Накладзены штраф у 300 тыс. руб.

ГОЛУБ Міхаіл. Арыштаваны 30.5.96.

ГОЦ Андрэй, грамадзянін Украіны. Затрыманы 26.4.96.

ГОЧ Вячаслаў, грамадзянін Украіны. За падзеі 26.4.96 затрыманы, заведзеная крымінальная справа. Некалькі дзён трымаў галадоўку. Асуджаны да 1 году турмы. Амніставаны 20.12.96.

ГРУШКО Мікалай, жыхар вёскі Чудзенічы Лагойскага раёну. Затрыманы 8.12.96 на праспэкце Скарыны. З Цэнтральнага РАУС перавезены ў спэцпрыёмнік, дзе пратрымалі ўсю ноч да 9 сьнежня. Цэнтральны суд аштрафаваў М.Грушко на 300 тыс. рублёў.

ГРЫЦУК Валеры. Затрыманы 15.11.96 за тое, што распаўсюджваў у мэтро ўлёткі.

ДАВІДОЎСКІ Аляксандар. 26.04.96 міліцыянты зьбілі яго дубінкамі па галаве. Накладзена пяць швоў.

ДАМАСЕВІЧ Сяргей, 1969 г. нар. за ўдзел у падзеях 26.4.96 асуджаны паводле арт. 159 на 8 сутак арышту.

ДАЛІРА Раман. Арыштаваны 30.5.96.

ДАШУК Віктар, кінадакумэнталіст. Падчас масавага пікету ў Менску 14.5.96 на вуліцы Валадарскага на яго й ягоную здымачную групу напалі міліцыянты, зьбіваючы і намагаючыся адабраць відэаматэрыялы.

ДЗЕМІДЗЕНКА Андрэй, 1973 г. нар. За ўдзел у падзеях 26.4.96 асуджаны паводле арт. 156 на штраф 200 тыс. руб.

ДЗЕРБАН Віктар, 1945 г. нар. 30.5.96 зьбіты амонаўцамі пры затрыманьні і пасьля. Без суда затрыманы на пяць сутак, а затым судом адпушчаны без абвяшчэньня прысуду.

ДЗЮБА Ўладзімер, журналіст. 26.4.96 затрыманы ў 21:15, у мітынгу ня ўдзельнічаў, спачатку судзьдзя Цэнтральнага р-ну Д.Рыбак асудзіў яго на трое сутак. Затрыманы паўторна, бо старшыня гарсуда М.Ардзяка палічыў, што пакараньне "зьяўляецца мяккім". Судзьдзя Маскоўскага р-ну М.Зялёнка дабавіў яшчэ 5 сутак зьняволеньня. Дзюба абвясьціў галадоўку.

ДЗЯМІД Мікалай, выкладчык Тэхналягічнага ўнівэрсытэту. 30.5.96 затрыманы і асуджаны.

ДОЎНАР Аляксандар, шахцёр, актывіст незалежнага прафсаюзу, Салігорск. Затрымліваўся падчас пешага маршу шахцёраў "Салігорск – Менск" у канцы кастрычніка.

ДОЎНАР Вадзім, студэнт факультэту журналістыкі БДУ. Затрыманы 10.12.96. Суд Ленінскага р-ну вынес папярэджаньне.

ДРАЧОЎ Віктар, фотажурналіст. Зьбіты міліцыяй падчас дэманстрацыі 24.3.96.

ДРЫГАЙЛА Андрэй, грамадзянін Украіны. Затрыманы 26.4.96. Асуджаны на 1,5 гады турэмнага зьняволеньня. Амніставаны 20.12.96.

ДУДАР Аляксандар, 1964 г. нар. 30.5.96 схоплены людзьмі ў цывільным, асуджаны судом Кастрычніцкага р-ну.

ЖДАНОВІЧ Зьміцер, 1971 г. нар. 30.5.96 затрыманы людзьмі ў цывільным каля ГУМу і моцна зьбіты. Пагражалі завесьці крымінальную справу за зьбіцьцё міліцыянта. Зноў білі, губляў прытомнасьць. Зь Ленінскага РАУС забраны "хуткай дапамогай" у 9-ю лякарню. Атрымаў "чэрапна-мазгавую траўму і расьсячэньне галавы ў раёне скроні".

ЖЛУТКА Алесь, навуковы супрацоўнік. 26.4.96 ў 21:00 схоплены на прыпынку каля ст. мэтро Кастрычніцкая. Зьбіты, абражаны. Атрымаў 4 сутак зьняволеньня.

ЖУК А., Горадня. 15.3.96 складзены пратакол за ўдзел у пікеце, прысьвечаным Дню Канстытуцыі.

ЖУК Павал, прадпрымальнік. Затрыманы 16.11.96 на літоўскай мяжы, сканфіскаваны наклад спэцвыпуску-дайджэсту. Празь некалькі дзён затрыманы другі раз з рэшткаю накладу на шашы Воранава – Ліда.

ЖУКАВЕЦ Андрэй, 1976 г. нар. За ўдзел у падзеях 26.04.96 паводле арт. 156 асуджаны на 10 сутак зьняволеньня.

ЖЫЛІНСКАЯ Марыя, фотакарэспандэнт "Народнай газэты". Затрыманая 01.05.96. Адпушчаная пасьля зьнішчэньня стужак.

ЗАЙКОЎСКІ Эдвард. Арыштаваны 30.05.96.

ЗАНЬКО Мікалай, 1951 г. нар., жыхар Ганцавічаў. 22.11.96 па падазрэньні ў расклейцы ўлётак ён, ягоныя жонка і дачка дапытаныя.

ЗАСЛАЎСКАЯ Вольга, пэнсіянэрка. 26.04.96 зьбітая міліцыяй пад час шэсьця.

ЗІМІН Мікалай, шахцёр, актывіст незалежнага прафсаюзу, Салігорск. Затрымліваўся падчас маршу шахцёраў "Салігорск–Менск" у кастрычніку.

ЗІМНІЦКАЯ Валянціна. За ўдзел у пікеце ў абарону Ю.Хадыкі і В.Сіўчыка асуджаная.

ЗНАВЕЦ Павал, дэпутат Вярхоўнага Савету. Затрыманы 26.04.96 у 23:00 у штаб-кватэры БНФ. 10.10.96 затрыманы разам з арганізатарамі несанкцыянаванага пікету П.Канавальчыкам, П.Карназыцкім і С.Марцылевым.

ЗОРЧАНКА Ўладзімер, падпалкоўнік міліцыі ў адстаўцы. Затрыманы 8 сьнежня каля ст. мэтро Плошча Перамогі. Ён размаўляў з Ірмаю Табушавай. На хвіліну адышоў і раптам пачуў крык І.Табушавай: "Уладзімер Васільевіч, дапамажыце!" Ён пабег на дапамогу І.Табушавай, якую схапілі міліцыянты. Зорчанку адвезьлі ў спэцпрыёмнік, дзе пратрымалі да наступнага дня. Цэнтральны суд аштрафаваў яго на 500 тысячаў рублёў.

ЗУЁНАК В., 62 гады. 30.05.96 затрыманы і пасьля зьбіты міліцыяй.

ЗЯЛЁНКА Юры. 30.05.96 схоплены людзьмі ў цывільным каля Цэнтральнага РАУС. Асуджаны паводле арт. 167.

ЕРМАКОЎ Васіль, 34 гады, беспрацоўны. Затрыманы 10.12.96 ў 14:00 насупраць рэстарана McDonald's. Зь лоткавога аўтамабіля выскачылі двое ў цывільным, запіхнулі яго ў машыну і завезьлі ў Ленінскі РАУС, дзе 4 гадзіны ўтрымлівалі ў камэры. Пасьля склалі пратакол. В.Ермакоў начаваў у РАУС у камэры разам з крымінальнікамі. 11 сьнежня яго даставілі ў Ленінскі суд. Інкрымінавалі "супраціў міліцыі". Ленінскі суд прысудзіў яму суткі пазбаўленьня волі.

ІВАШКЕВІЧ Віктар. 30.05.96 затрыманы ў раёне кінатэатру "Перамога" і асуджаны на 10 сутак арышту. У знак пратэсту трымаў галадоўку.

КАЗЬЯКОЎ Уладзімер. Асуджаны за падзеі 26.04.96 на 4 сутак.

КАЛІНОЎСКІ Андрэй. 26.04.96 пад час дэманстрацыі зьбіты гумовай дубінкаю.

КАЛЯДА Віталь. Асуджаны за падзеі 26.04.96 на 5 сутак.

КАМОЗІН Цімафей, дэпутат Магілёўскага гарсавету. 01.05.96 зьбіты і затрыманы падчас санкцыянаванага мітынгу ў Магілёве.

КАНАВАЛЬЧЫК Паўлюк. 22 гады. Лідар аб'яднаньня "Чырвоны Жонд". Асуджаны да штрафу ў 50.000 руб. як арганізатар несанкцыянаванага пікету 10.12.96. Таксама аштрафаваны і ў 1995 г. як арганізатар шэсьця 7.11.95.

КАНДАКОЎ Сьвятаслаў, 19 гадоў, студэнт аддзяленьня міжнародных адносінаў БДУ, сябра "Маладой Грамады". Затрыманы 10.12.96 на вуліцы пасьля пікету на месцы масавых зьбіваньняў студэнтаў. Адвезьлі ў Ленінскі РАУС, дзе пратрымалі каля гадзіны. Людзі ў цывільным вялі відэазапіс у часе допыту. Інкрымінавалі актыўны ўдзел у несанкцыяваным пікеце. 11 сьнежня справу С.Кандакова разглядаў суд Ленінскага раёну і вынес "папярэджаньне". Потым Сьвятаслаў меў акадэмічныя праблемы ў БДУ.

КАНДРАЦЬЕЎ Ігар, грэка-каталіцкі сьвятар, Берасьце. Затрыманы як грамадзкі назіральнік у час рэфэрэндуму 24.11.96, калі былі зьнойдзеныя няўлічаныя бюлетэні. Абвінавачваўся ў "злосным хуліганстве".

КАПАРЫХА Віталь. Арыштаваны 30.05.96.

КАПАРЫХА Мікалай. Арыштаваны 30.05.96 і асуджаны на трое сутак.

КАРАЛЁЎ А., актывіст незалежнага прафсаюзу, Салігорск. Затрыманы і аштрафаваны 16.10.96 за ўдзел у маршы шахцёраў "Салігорск – Менск".

КАРМІЛКІН Уладзімер, незалежны фотарэпартэр. 1.5.96 затрыманы й зьбіты, калі здымаў шэсьце апазыцыі. На працягу году на яго неаднаразова нападалі супрацоўнікі міліцыі.

КАРНАЗЫЦКІ Павал. 30.05.96 затрыманы і пасьля зьбіты. У апорным пункце міліцыі скаваны кайданкамі "ластаўкай", кінуты на падлогу і зноў зьбіты. Судом Ленінскага р-ну асуджаны паводле арт. 166 на шэсьць сутак арышту. Судзьдзя Л.Валевіч. Выключаны з журфаку БДУ з палітычных матываў за актыўны ўдзел у Менскай вясьне. Як адзін з афіцыйных арганізатараў пікету 10 сьнежня разам з дэпутатам Вярхоўнага Савету П.Знаўцом, П.Канавальчыкам і С.Марцылевым зьявіўся ў Ленінскі РАУС і патлумачыў міліцыянтам сваё права на правядзеньне пікету. Ленінскі суд аштрафаваў П.Карназыцкага на 50 тысячаў рублёў.

КАРНІЦКІ Іосіф. Затрыманы 26.04.96 на мосьце праз вуліцу Няміга яшчэ да заканчэньня мітынгу, разам з А.Мірончыкам. Асуджаны да 10 сутак зьняволеньня.

КАРОЛІК Віктар, сакратар Управы БНФ. 26.04.96 затрыманы на тралейбусным прыпынку людзьмі ў цывільным. Зьбіты. У судзе справу разглядаў судзьдзя С.Хрыпач (Ленінскі р-н). Атрымаў пяць сутак.

КАРПАЎ Юры. Затрыманы ў Віцебску ў Дзень Незалежнасьці 27.07.96 разам з Б.Хамайдам і Ул.Плешчанкам. 22.11.96 Ю.Карпаў затрыманы ў Віцебску за распаўсюджваньне ўлётак "антыдзяржаўнага зьместу".

КАРЫЗНА Аляксандар, 65 гадоў. Атрымаў газавы струмень у твар пад час дэманстрацыі 26.04.96. Амонаўцы вырвалі ў яго і парвалі бел-чырвона-белы сьцяг. 30.05.96 зьбіты амонам, без суда адсядзеў 5 сутак. Абвінавачаньне ня выстаўленае.

КАРЭЙКАЎ Дзьмітры, 1975 г. нар. 29.04.96 асуджаны судом Фрунзэнскага р-ну за падзеі 26.04.96 паводле арт. 156 на 5 сутак арышту.

КАСАРЖЭЎСКІ Яўген. 26.04.96 затрыманы пасьля шэсьця. Справа перададзеная ў райаддзел па справах непаўналетніх.

КАСАЧ Алесь. 30.05.96 затрыманы і асуджаны на 5 сутак арышту. Затрыманы 10.12.96.

КАШТАЛЯН Ірына, непаўналетняя. Арыштаваная 30.05.96, справа накіраваная ў райаддзел па працы зь непаўналетнімі.

КІЙКО Рыгор, мастак. 30.05.96 затрыманы і зьбіты міліцыяй. Сьведка – Карызна А. Асуджаны на 8 сутак арышту.

КІШКУРНА В. Затрыманы 26.04.96. Асуджаны.

КЛЫКОЎСКАЯ Ціна, журналістка газэты "Здравый смысл". Арыштаваная 30.05.96. 02.11.96 затрыманая на тры дні па падазрэньні ў дзеяньнях, накіраваных на гвалтоўную зьмену канстытуцыйнага ладу. Справа спыненая за адсутнасьцю складу злачынства.

КЛЯЙН Юрген, 55 гадоў, грамадзянін ФРГ, жыхар места Эсна. На працягу некалькіх гадоў забясьпечваў шпіталі Горадні лекамі ды іншай гуманітарнай дапамогай. За парушэньне правілаў правозу боезапасаў (для гарадзенскіх спартоўцаў) і зброі затрыманы 29.03.96, пасьля чатырох месяцаў зьняволеньня асуджаны на тры гады з адтэрміноўкай на адзін год.

КОБЕЦ Уладзімер. 30.05.96 на выхадзе са ст. мэтро Кастрычніцкая зьбіты невядомым у цывільным. Разьбіў калена, параніў руку. Білі і ў аддзеле міліцыі. Асуджаны на трое сутак арышту.

КОБРУСЕЎ Леанід. 29.04.96 як у старшыні Кальварыйскай рады БНФ Менску (на той час ужо былога) у 11 гадзінаў сьледчымі Фрунзэнскай пракуратуры разам зь міліцыяй на кватэры праведзены вобыск без прысутнасьці Л.Кобрусева. Кобрусеў у мітынгу 26.04.96 ня ўдзельнічаў, у гэты час быў на працы.

КОЛАС Мікіта, студэнт аддзяленьня міжнародных зносінаў БДУ, сябра "Маладой Грамады". Арыштаваны 10.12.96 пасьля пікету. Яму інкрымінавалі "нецэнзурную лаянку" (Мікіта ў час пікету трымаў плякат "Дыктатура – гаўно"). Яго пратрымалі да 11 сьнежня ў спэцпрыёмніку РАУС, адтуль прывезьлі ў Ленінскі суд. Па хадайніцтву Мікіты (ён папрасіў адваката) суд перанёс разгляд справы і адпусьціў хлопца дадому. Потым Мікіта меў акадэмічныя праблемы ў БДУ.

КОПАСАЎ Анатоль, 1938 г. нар. Зьбіты пад час шэсьця 26.04.96.

КОРСАК У. 26.04.96 у 22 гадзіны затрыманы невядомымі ў цывільным. Асуджаны на 5 сутак пазбаўленьня волі ў судзе Маскоўскага р-ну.

КОТАЎ Міхаіл, рэдактар выдавецтва "Мастацкая Літаратура". 14.6.96 каля ўласнага дому арыштаваны й зьбіты міліцыяй за тое, што меў на вопратцы значак з нацыянальнай сымболікай. Атрымаў пералом грудзіны.

КОШМАН Вадзім. 26.04.96 у 21:00 затрыманы міліцыяй на пр. Скарыны разам зь сяброўкаю. Складзены пратакол паводле арт. 156. Судом Ленінскага р-ну асуджаны на трое сутак арышту.

КРАЎЦОЎ Б., інвалід 2-й групы. 27.11.96 затрыманы ў мэтро сэржантам Даміровічам за тое, што паклаў на эскалятар адну ўлётку.

КРАЎЧАНКА Алесь. 30.05.96 арыштаваны і асуджаны на шэсьць сутак.

КРАЎЧАНКА Н., маёр міліцыі. Затрыманы ў Магілёве ў канцы кастрычніка за распаўсюджваньне газэты "Грамадзянін". Абвінавачаны ў "злосным хуліганстве". Праз тры дні адпушчаны за адсутнасьцю складу злачынства.

КРУЧОНАК Ігар, архітэктар. Арыштаваны 17.11.96 каля кінатэатру "Кастрычнік" за распаўсюджваньне ўлётак супраць рэфэрэндуму. Атрымаў 3 сутак "за хуліганства".

КРЫШТОЦІК А. Затрыманы 26.04.96. Асуджаны.

КУБЯНКЕВІЧ Сяргей, непаўналетні. За падзеі 30.05.96 затрыманы міліцыяй. Справа накіраваная ў райаддзел міліцыі.

КУЛЕШ Л. Затрыманая 20.11.96 за касьцёлам Сьв. Сымона і Алены. Адвезеная ў Маскоўскі РАУС.

КУРМАС Алег, інвалід другой групы зь дзяцінства. Затрыманы 8 сьнежня. У той жа дзень яго выпусьцілі з Цэнтральнага РАУС.

КУРЭВІЧ Сяргей, 18 гадоў. Арыштаваны каля ГУМу 30.05.96.

КУШНЕР Аляксандар, фотакарэспандэнт газэты "Рэспубліка". Яго затрымалі і засьвяцілі фотастужкі пасьля шэсьця 01.05.96.

КШАКЛЕЎСКІ Мар'ян, лідэр прафсаюзу "Салідарнасьць" (Польшча). 14.05.96 у 14:50 гвалтоўна затрыманы разам з калегамі і перакладчыкам у Менску, дзе знаходзіўся па запрашэньні Свабоднага Прафсаюзу Беларусі. Пасьля пяці гадзінаў зьняволеньня польскія грамадзяне выдвораныя за мяжу Беларусі.

ЛАПЦЭВІЧ В., 1935 г. нар. Пасьля падзеяў 24.03.96 атрымала даведку ў траўматалягічным аддзяленьні 31 паліклінікі г. Менску пра "ўшыб грудной клеткі справа".

ЛАПЦЭВІЧ Уладзімер, 22 гады, настаўнік гісторыі, жыхар Магілёва. Затрыманы ў кастрычніку за распаўсюджваньне тэксту Дэклярацыі правоў чалавека.

ЛЯПІАРСКАЯ Ларыса. За ўдзел у пікеце ў абарону Ю.Хадыкі і В.Сіўчыка асуджаная.

ЛЯПАРСКІ Уладзімер. Схоплены 26.04.96 каля ўправы БНФ у 23:00. Асуджаны на 8 сутак арышту.

ЛЕЎЧЫК А. 26.04.96 зьбіты амонам насупраць крамы "Сталічная" каля 22:00. У мітынгу ня ўдзельнічаў.

ЛІСУН Анатоль, 1977 г. нар., глуханямы зь дзяцінства. Арыштаваны 30.05.96, адсядзеў чацьвёра сутак арышту, абвінавачаны ў тым, што "крычал, нецэнзурно выражался, выкрикивал антиправительственные и антипрезидентские лозунги".

ЛІЦЬВІНАЎ Аляксей, 1975 г. нар. Паводле арт. 156 аштрафаваны на 200 тыс. руб.

ЛОСЕЎ Віктар. Арыштаваны 30.05.96.

ЛЫЧКАВАХ Аляксей, грамадзянін Украіны, міжнародны назіральнік на рэфэрэндуме. 24.11.96 затрыманы на выбарчым участку №9 у Берасьці, калі былі знойдзеныя няўлічаныя бюлетэні. Выкліканы 28.11.96.

ЛЯЎКОВІЧ Алег, 27 гадоў, інвалід ад нараджэньня. Затрыманы й зьбіты 17.11.96. З пастарунку прымусова адпраўлены ў псыхіятрычную лякарню, адкуль адпушчаны толькі 18.11.96 на просьбу бацькоў.

ЛЯШЭВІЧ Ірына. Затрыманая разам з мужам С.Патапенкам за падзеі 26.04.96 асуджаная на 5 сутак арышту.

МАЕЎ Васіль. 26.04.96 у 21:20 затрыманы на мосьце праз Сьвіслач людзьмі ў цывільным, 29.04.96 закрытым судом Ленінскага р-ну (судзьдзя С.Хрыпач) асуджаны на трое сутак арышту.

МАЗ Мікола. 26.04.96 пад час падзеяў дубінкаю разьбіта галава, накладзеныя швы.

МАЗУРА Аляксандар, 1957 г. нар. 30.05.96 ішоў з працы, арыштаваны.

МАЙСЮК А., Слонім. Затрыманы ў лістападзе за распаўсюджваньне ўлётак.

МАЙСЯЕВІЧ Іосіф. 30.05.96 арыштаваны.

МАЛЬЧЫК С., жыхар Горадні. 15.03.96 на яго складзены пратакол за ўдзел у пікеце, прысьвечаным Дню Канстытуцыі.

МАРАЧКІН Алесь, мастак. Пад час шэсьця 26.04.96 зьбіты амонаўцамі дубінкай з шыпамі па галаве і твары, накладзеныя швы ў 19-й паліклініцы. Дыягназ: "рана левай скулавой вобласьці". Зьвярнуўся ў судмэдэкспэртызу.

МАРГУН Дзьмітры, 1967 г. нар. Асуджаны на 5 сутак арышту.

МАРОЗ Юры, распаўсюднік газэтаў "Выбар", "Имя", "Свабода", "Народная Воля" ў Віцебску. 14.9.96 на яго зьдзейсьнены напад. Да гэтага падпадаў судоваму перасьледу.

МАРОЗЫ, браты. Арыштаваныя 30.05.96.

МАРТЫНЕНКА Вітаўт, 36 гадоў, журналіст. 24.03.96 на пр. Скарыны пяцьцю міліцыянтамі ўзяты ў кола, зьбіты, у кайданках кінуты ў машыну. Зьбівалі па дарозе ў Цэнтральны РАУС. Зь міліцыі забраны "хуткай дапамогай" у 10-ю гарадзкую лякарню. Асуджаны судом Цэнтральнага р-ну.

МАРЦЫЛЕЎ Сяргей, студэнт аддзяленьня міжнародных зносінаў БДУ. Як адзін з афіцыйных арганізатараў пікету 10 сьнежня разам з дэпутатам ВС П.Знаўцом, П.Канавальчыкам і П.Карназыцкім зьявіўся ў Ленінскі РАУС і патлумачыў міліцыянтам сваё права на правядзеньне пікету. Ленінскі суд аштрафаваў Марцылова на 50 тыс. рублёў.

МАРЧАНКА Зьмітро, 1975 г. нар., грамадзянін Украіны, сябра "Маладога Руху". Затрыманы ў лістападзе 1996 ў менскім мэтро. Быццам "за распаўсюджваньне ўлётак".

МАРЧУК Зьміцер, 1967 г. нар. 26.4.96 у 22 гадзіны затрыманы пасьля ўзлому дзьвярэй штаб-кватэры БНФ узброенымі невядомымі ў масках і бронекамізэльках. Асуджаны судзьдзёю Цэнтральнага р-ну

позву ў РАУС і адпусьцілі дахаты. 11 сьнежня склалі другі пратакол і адвезьлі ў Ленінскі суд. Маслоўскаму суд вынес "папярэджаньне".

МАТАФОНАЎ Аляксандар. За падзеі 26.4.96 атрымаў 15 сутак зьняволеньня.

МАЦКЕВІЧ Сяргей. Затрыманы ў Савецкім РАУСе, калі разам з дэпутатамі гарсавету спрабаваў увечары 30.5.96 высьветліць лёс затрыманых раней грамадзянаў.

МАЧУЕЎ Андрэй. 26.4.96 у 20.30 на вул. Няміга затрыманы супрацоўнікамі міліцыі. Забраны транспарант. Атрымаў 4 сутак зьняволеньня.

МІКАЛАЙЧАНКА Алесь, журналіст. 26.4.96 пад час дэманстрацыі атрымаў удар дубінкаю па руцэ. Сьведка — журналіст з газэты "Свабодныя прафсаюзы" В.Лапцік.

МІРАНЮК Андрэй, карэспандэнт газэты "Голас Нацыі", грамадзянін Украіны. За падзеі 26.04.96 затрыманы, заведзеная крымінальная справа. Некалькі дзён трымаў галадоўку. Асуджаны на 1 год турмы. Амніставаны 20.12.96.

МІРОНЧЫК Алесь, скульптар. Затрыманы 26.4.96. Асуджаны на 10 сутак зьняволеньня.

МІХАЛЕВІЧ Аляксандар, 30 гадоў, рабочы. 26.4.96 падчас Чарнобыльскага шляху зьбіты. 02.05.96 арыштаваны за тое, што падчас шэсьця 01.05.96 спаліў партрэт А.Лукашэнкі. Атрымаў пяць сутак зьняволеньня.

МІХНОЎСКІ Мікола, дырэктар Беларускага літаратурнага фонду. Затрыманы разам з М.Грушко і І.Шаховічам 8.12.96 на пр. Скарыны. З Цэнтральнага РАУС перавезены ў спэцпрыёмнік, дзе пратрымалі ўсю ноч да 9 сьнежня. Цэнтральны суд аштрафаваў М.Міхноўскага на 300 тысяч рублёў.

МІЦКЕВІЧ Андрэй, непаўналетні. 30.5.96 затрыманы і зьбіты каля кінатэатру "Перамога" людзьмі ў цывільным. Пратакол затрыманьня перададзены ў камісію па справах непаўналетніх пры райвыканкаме.

МУДРОЎ Вінцэсь, пісьменьнік, Полацак. Затрыманы разам зь яшчэ дзесяцьцю ўдзельнікамі пікету, прысьвечанага ўгодкам Чарнобыльскай катастрофы ў Полацку 26.04.96.

МУДРЫЧЭНКА А. Затрыманы 15.3.96 у Віцебску, разам зь яшчэ чатырма ўдзельнікамі пікету ў абарону Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі.

МУЗЕЛІКА Дзьмітры, 1970 г. нар. 29.4.96 судом Фрунзэнскага р-ну асуджаны за падзеі 26.4.96 паводле арт. 156 на 15 сутак арышту.

МУСКІ Барыс, 1939 г. нар. 25.5.96 пад час правядзеньня Дня памяці М.Багдановіча затрыманы, пасьля затрыманьня нанесеныя цялесныя пашкоджаньні, асуджаны судом Цэнтральнага р-ну.

МЯДЗЬВЕДЗЕВА Галіна, 42 гады, інжынэр. 24.3.96 насупраць будынку КГБ пры спробе аказаць дапамогу мужчыне, зьбітаму з ног міліцыянтам, атрымала дубінкаю па сьпіне, а ў вочы газ. Забрала "хуткая дапамога". У 10-й гарлякарні пастаўлены дыягназ: апёкі вачэй 1-й ступені, пабоі на сьпіне, галаве, плячах.

МЯРЦАЛА Сьцяпан, грамадзянін Украіны, журналіст. Затрыманы за падзеі 26.4.96, абвясьціў галадоўку. Выпушчаны як журналіст.

НАЙМАРК Дзьмітры, 1976 г. нар. За падзеі 26.4.96 судом Фрунзэнскага р-ну 29.4.96 асуджаны паводле арт. 156 на 200 тыс. рублёў.

НЕЎДАХ Уладзімер, арганіст. 17.11.96 вяртаўся пасьля выступленьня з Чырвонага касьцёлу. Схоплены, закаваны ў наручнікі, па дарозе ў РАУС Цэнтральнага раёна зьбіты. У РАУСе страціў прытомнасьць. Адвезены ў 10-ю паліклініку, дзе запатрабаваў зрабіць аналіз на алькаголь. Аналіз даў адмоўны вынік. Складзеная даведка аб атрыманьні ім тупых удараў па брушной поласьці. Ад кайданкаў засталіся крывападцёкі, пашкоджаныя пальцы рук.

НОВІК Дзьмітры. 30.5.96 арыштаваны і асуджаны на пяць сутак.

НОВІКАЎ Алесь, 18 гадоў, студэнт аддзяленьня міжнародных зносінаў БДУ, сябра "Маладой Грамады". Затрыманы 10.12.96 пасьля пікету непадалёк ад рэстарана McDonald's. Міліцыя адвезла яго ў Ленінскі РАУС і пратрымала да 18 гадзін у асобнай камэры. У пратаколе запісана, што "А.Новікаў раздаваў улёткі і заклікаў грамадзян у пікет". 11 сьнежня Ленінскі райсуд вынес Алесю "папярэджаньне". Потым меў акадэмічныя праблемы ў БДУ.

ПАГАРЦАЎ Раман. Затрыманы 19.10.96 у раёне ўнівэрсаму "Рыга".

ПАДГОЛІН Сяргей, 1978 г. нар. Паводле арт. 156 за ўдзел у падзеях 26.04.96 асуджаны на 5 сутак арышту.

ПАДЛІПСКІ Уладзімер. Арыштаваны 30.5.96.

ПАПКОЎ Ягор. Затрыманы ў Савецкім РАУСе, калі разам з дэпутатамі гарсавету спрабаваў увечары 30.05.96 высьветліць лёс затрыманых раней грамадзянаў.

ПАРКАЛА Сьвятлана, 1976 г. нар., грамадзянка Украіны, сяброўка "Маладога Руху". Затрыманая ў менскім мэтро ў лістападзе 1996, абвінавачаная ў распаўсюджваньні ўлётак.

ПАРТНОЎ Вячаслаў, студэнт БДУ. 26.4.96 каля ўнівэрсаму "Сталічны" зьбіты амонаўцамі, у выніку чаго атрымаў закрыты пералом перадплечча. Міліцыя адмовіла яму ў медычнай дапамозе. Выпушчаны пасьля некалькіх гадзінаў, ён з 27.4.96 да 11.6.96 лячыўся ў шпіталі хуткай дапамогі.

ПАТАПАЎ Сяргей, грамадзянін Украіны. За падзеі 26.4.96 заведзеная крымінальная справа. Некалькі дзён трымаў галадоўку. Асуджаны да двух гадоў і трох месяцаў турэмнага зьняволеньня.

ПАТАПЕНКА Сяргей. 26.4.96 пасьля мітынгу затрыманы на пр. Скарыны па дарозе дадому разам з жонкаю Ляшэвіч І. Парвалі кашулю, завезьлі ў разьмеркавальнік, абражалі, называлі "падонкамі". Пратакол складзены як на дробнага хулігана паводле арт. 156 (нецэнзурна лаяўся, аказваў супраціў работнікам міліцыі). Закрытым судом асуджаны на 3 сутак пазбаўленьня волі.

ПАТАПЁНАК Пётра, 43 гады. 30.5.96 моцна зьбіты міліцыяй. Зламанае рабро, пашкоджаная нага.

ПАТАПОВІЧ Зьміцер. 22.11.1996, пад час кругласутачнага мітынгу каля парлямэнту, затрыманы ў будынку педагагічнага ўнівэрсытэту, завезены ў Маскоўскі РАУС, дзе складзены пратакол аб затрыманьні.

ПАЧОБУТ Станіслаў. Затрыманы 19.10.96 каля ўнівэрсаму "Рыга" ўжо пасьля заканчэньня мітынгу апазыцыі. Атрымаў 5 сутак адміністрацыйнага арышту.

ПАЧЫНЬСКІ Аўген, супрацоўнік прафсаюзу "Салідарнасьць" (Польшча). 14.5.96 затрыманы ў Менску разам з М.Кшаклеўскім і А.Адамчыкам і выдвараны з тэрыторыі Беларусі.

ПІМЕНАЎ Аляксей, студэнт Менскага педунівэрсытэту. Затрыманы 10.12.96. Суд Ленінскага р-ну вынес папярэджаньне.

ПЛАТОНЕНКА Ўладзімер (Расея). Затрыманы 19.10.96 каля ўнівэрсаму "Рыга" ўжо пасьля заканчэньня мітынгу апазыцыі. Атрымаў 5 сутак адміністрацыйнага арышту.

ПЛЕШЧАНКА Ўладзімер, жыхар Віцебска, супрацоўнік газэты "Выбар". 18.5.96 за ўдзел у пікеце ў абарону Хадыкі і Сіўчыка ў Менску атрымаў трое сутак зьняволеньня. Затрыманы ў Дзень Незалежнасьці 27.08.96 ў Віцебску, калі трымаў нацыянальны сьцяг. Прыцягнуты да судовай адказнасьці таксама па "справе Адамовіча".

ПЛЕСКАНЬ Анатоль. Арыштаваны 30.5.96.

ПЛЯШКО Генадзь, пэнсіянэр. 24.3.96 міліцыя зьбіла яго гумавымі дубінкамі і нагамі. Суткі пратрыманы ў прыёмніку-разьмеркавальніку, пасьля чаго аштрафаваны. 18.05.96 арыштаваны на пікеце за выкананьне палітвязьняў Ю.Хадыкі і В.Сіўчыка, зноў асуджаны.

ПРАКАПОВІЧ В., рабочы, Берасьце. Затрыманы ў лістападзе за распаўсюджваньне ўлётак.

ПРЫВАРНІКАЎ Мікола. 19 гадоў, студэнт аддзяленьня міжнародных зносінаў БДУ, сябра "Маладой Грамады". Затрыманы 10.12.96 разам з І.Маслоўскім. Адвезены ў Ленінскі РАУС. Ленінскі суд вынес "папярэджаньне".

ПРУДНІКАВА Валянціна, Менск. 24.7.96 разам з Н.Бязручкінай затрыманая каля праваслаўнага катэдральнага сабору.

ПУЛЬША Сяргей, 19 гадоў, студэнт журфака БДУ. Людзі ў цывільным, якія не прад'явілі дакумэнтаў, без тлумачэньняў схапілі яго 10.12.96 на пл. Свабоды і ў аўтамабілі даставілі ў Ленінскі РАУС. Праз 6 гадзінаў там склалі пратакол. 11 сьнежня суд Ленінскага раёну аштрафаваў Пульшу на 50 тыс. рублёў.

ПШАНІЧНЫ Юры. Затрыманы 19.10.96 каля ўнівэрсаму "Рыга" ўжо пасьля заканчэньня мітынгу апазыцыі. Накладзены штраф у 300 тыс. руб.

ПЯНЬКОЎ Аляксандар, 1976 г. нар. 26.4.96 арыштаваны пад час аблавы на вакзале, асуджаны на 5 сутак.

ПЯТРОЎ Аляксей, шахцёр, актывіст незалежнага прафсаюзу Салігорск. Затрымліваўся пад час маршу шахцёраў "Салігорск—Менск".

ПЯТРОЎСКІ Аляксандар, 18 гадоў. Абвінавачваўся ў зьбіцьці міліцыянта, пагражалі крымінальнай справай. Зьбіты пасьля затрыманьня ў камэры гэтым міліцыянтам. За ўдзел у падзеях 30.5.96 асуджаны старшынём суда Цэнтральнага р-ну на 15 сутак арышту. Затрыманы на вул. Альшэўскага за расклейку ўлётак. Прысуджаны да штрафу 200.000 руб.

ПЯТРУША Юры, карэспандэнт газэты "Здравый смысл". Затрыманы 30.5.96. У знак пратэсту абвясьціў галадоўку. Асуджаны на шэсьць сутак арышту.

РАБАЎ Пётар (Расея). Затрыманы 19.10.96 каля ўнівэрсаму "Рыга" ўжо пасьля заканчэньня мітынгу апазыцыі. Атрымаў 5 сутак адміністрацыйнага арышту.

РАДЧАНКА Я., міжнародны назіральнік ад "Камітэту выбаршчыкаў Украіны" на рэфэрэндуме. 24.11.96 затрыманы міліцыяй, калі разам з А.Лычкавых знайшоў пад абрусам на стале выбарчага ўчастка №7 г. Берасьця лісты няўлічаных бюлетэняў.

РАЖАНКОЎ А., шафёр. Затрыманы ў лістападзе каля г. Воранава, пры канфіскацыі спэцвыпуску-дайджэсту.

РАМАНАЎ Мікалай. За ўдзел у падзеях 30.5.96 зьбіты пры затрыманьні і пасьля. Асуджаны на 15 сутак арышту.

РАМАШЭЎСКІ Андрэй, лідэр Партыі аматараў піва. Арыштаваны 29.03.96 за ўдзел у акцыі "Дзеці лжы 2", якая адбылася вясною 1995 і падчас якой быў спалены сьцяг БССР. Тры месяцы правёў у сьледчым ізалятары. Суд Ленінскага раёну прыгаварыў яго да двух гадоў зьняволеньня ўмоўна. Выпушчаны з-за кратаў 19.7.96. У сьнежні 1996 папрасіў палітычнага прытулку ў Польшчы.

РАШЭТНІК Аляксандар. 22.11.1996, падчас кругласутачнага мітынгу каля парлямэнту, затрыманы ў будынку педунівэрсытэту, завезены ў Маскоўскі РАУС, дзе складзены пратакол аб затрыманьні.

РУСЕЦКІ Павал, 1937 г. нар. Пад час падзеяў 26.04.96 атрымаў удар дубінкаю па галаве і па сьпіне. Галава расьсечаная, накладзеныя швы ў лякарні МУС.

РЫБАКОЎ Андрэй, 1974 г. нар. 29.6.96 асуджаны судом Фрунзэнскага р-ну за падзеі 26.04.96.

РЫСЯВЕЦ Андрэй, 1963 г. нар. 29.6.96 асуджаны судом Фрунзэнскага р-ну за падзеі 26.4.96 на 500 тыс. руб.

САВІЦКІ Мікалай, 1934 г. нар., прафэсар. 24.3.96 на пр. Скарыны спэцназаўцы зьбілі яго дубінкаю па галаве і атруцілі газам. Страціў прытомнасьць, забраны "хуткай дапамогай" у 3-ю бальніцу. У дваццаць дыягназ: "гематома цемяннай вобласьці справа".

САКАЛОЎСКІ Сяргей. 30.5.96 ішоў зь дзяўчынаю па пр. Скарыны. У пікеце ўдзелу ня браў. Ад амонаўцаў атрымаў удар кулаком у твар.

САКОЛЬЧЫК Тамара. 30.5.96 зьбітая з ног амонаўцамі і пабітая дубінкамі па сьпіне і па руках.

САЛАВЕЙ Уладзімер, грамадзянін Украіны, 1943 г. нар. Арыштаваны 26.4.96, заведзеная крымінальная справа. 5 верасьня Менскі гарадзкі суд прыгаварыў яго да 2,5 гадоў турмы. Амніставаны 20.12.96.

САМОЙЛЕНКА Генадзь, супрацоўнік дабрачыннага фонду, Берасьце. Затрыманы ў лістападзе за распаўсюджваньне ўлётак.

САРОКІН Аляксандар. Арыштаваны 30.5.96.

САРОКІН Анатоль. Арыштаваны 30.5.96.

САРОКІН Ігар. Арыштаваны 30.5.96.

САЧАНКА Зінаіда, 56 гадоў, пэнсіянэрка. 24.3.96 спрабавала абараніць мужчыну, якога міліцыянт стукнуў рацыяй па галаве. Сама збоку атрымала моцны ўдар дубінкай. Лячылася пасьля ў 2-й гарадзкой лякарні.

САЧКОЎ Міхаіл, інвалід 2-й групы. 30.5.96 зьбіты спэцназам, упаў.

СЕВЯРЫНАЎ Андрэй. 30.5.96 затрыманы на вул. Камсамольскай людзьмі ў цывільным (затрымліваў супрацоўнік КГБ Вярбіцкі). Справа перададзеная ў камісію па справах непаўналетніх пры райвыканкаме.

СЕЛІВОНЧЫК Павал. Арыштаваны 30.5.96.

СЕЛІВОНЧЫК Раіса. 30.5.96 затрыманая разам з сынам. Асуджаная паводле арт. 167.

СЕРДЗЮКОЎ Алесь, дэпутат Магілёўскага гарсавету. Зьбіты і затрыманы падчас санкцыянаванага мітынгу ў Магілёве 01.5.96.

СЁМУХА Васіль. Пад час правядзеньня 26.4.96 шэсьця атручаны газам.

СІВЕЦ Мікола. Затрыманы 26.4.96 каля гатэлю "Юбілейны". Асуджаны.

СІВОХІН Яўген. За падзеі 30.5.96 затрыманы і зьбіты.

СІВУХА Валеры, старшыня Магілёўскай філіі Аб'яднанай Грамадзянскай Партыі. Затрыманы 01.5.96 за ўдзел у санкцыянаваным мітынгу ў Магілёве. Затрыманы ў ліпені 1996, калі праводзіў на вуліцах Магілёва жартоўны "запіс у ЦРУ". Пакараны штрафам у 400.000 руб. "за распаўсюджваньне незарэгістраваных пасьведчаньняў". 10.12.96 затрыманы ў Магілёве за распаўсюджваньне тэксту Дэклярацыі правоў чалавека.

СІНІЦЫН Ігар. Арыштаваны 30.5.96.

СІНЯКОЎ Андрэй. Арыштаваны 30.5.96 і асуджаны на 10 сутак.

СЎЧЫК Вячаслаў, сакратар управы БНФ. За падзеі 26.04.96 заведзеная крымінальная справа. Утрымліваўся ў зьняволеньні да суда. Абвясьціў галадоўку, трымаў яе 18 дзён. Да суда выпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе.

СЎЧЫК Ганна, жонка В.Сіўчыка. За ўдзел у пікеце ў абарону Ю.Хадыкі і В.Сіўчыка асуджаная.

СКАРАБАГАТАЎ Віктар, заслужаны артыст Беларусі, саліст опернага тэатру. 17.11.1996 пад час дэманстрацыі разам з Каржанеўскай Г. і Неўдахам У. вяртаўся з касьцёлу св. Сымона і Алены. Каля кавярні "Пінгвін" спынены разам чатырма людзьмі ў цывільным, якія запатрабавалі паказаць дакумэнты. В.Скарабагатаму заламалі рукі і запіхнулі ва ЎАЗік (нумар машыны МН 7614, як высьветлілася пазьней, у міліцыі не зарэгістраваны). У Савецкім РАУС складзены пратакол.

СКОЧКА Яўген. 26.4.96 ў 23 гадзіны пасьля мітынгу затрыманы ў штаб-кватэры БНФ. Пасьля затрыманьня допыт праводзіў сьледчы КГБ. Закрытым судом асуджаны да пяці сутак зьняволеньня. 9.10.96 ў 18.30 затрыманы амонам ля стадыёну "Дынама". У яго сканфіскавалі 500 улётак с запрашэньнем на мітынг 19 кастрычніка. Суткі правёў у пастарунку, абвінавачаны паводле артыкулу 172 пункт 3 Адміністратыўнага Кодэксу.

СКРЫЛЬКА Аляксандар, 1941 г. нар. 30.5.96 затрыманы каля ГУМу. Асуджаны на 10 сутак.

СТАСЮК Мікалай. Жыхар Барысава, 1953 г. нар., машыніст халадзільных установак. За распаўсюджваньне матэрыялаў, якія тлумачылі стаўленьне БНФ да рэфэрэндуму аштрафаваны 28.11.96 на 500.000 руб.

СТАТКЕВІЧ Мікола, лідэр Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, затрыманы 08.12.96 на ст. мэтро Акадэмія Навук. Спачатку яго адвезьлі ў Цэнтральны РАУС, пасьля ў спэцразьмеркавальнік на вул. Прылуцкай, дзе пратрымалі да раніцы 9 сьнежня. Затым зноў прывезьлі ў РАУС, дзе патрабавалі адмовіцца ад адваката. Увечары 9 сьнежня яго адвезьлі ў Цэнтральны суд, які перанёс разгляд справы на 13 сьнежня, але меру стрыманьня не зьмяніў. М.Статкевіч аб'явіў галадоўку. Каля 20 гадзінаў М.Статкевіча выпусьцілі. Судовы працэс адбыўся ў судзе Цэнтральнага раёну. М.Статкевіч атрымаў 15 сутак арышту. У вязьніцы абвясьціў галадоўку, якую трымаў 13 сутак, пакуль ня быў выпушчаны.

СТУПНІКАЎ Аляксандар, карэспандэнт НТВ. 02.5.96 на яго і здымачную групу НТВ напалі супрацоўнікі прэзыдэнцкай аховы, адабралі адзьнятыя стужкі, выкручвалі рукі, некалькі разоў ударылі апэратара.

СУБЕЛЬ А., студэнт. 20.11.1996 арыштаваны людзьмі ў цывільным на ст. мэтро Плошча Незалежнасьці. Пры вобшуку знойдзена шэсьць улётак. Дастаўлены ў Маскоўскі РАУС, дзе абвінавачаны ў актыўным удзеле ў несанкцыяваным мітынгу і распаўсюджваньні ўлётак. Асуджаны судом Маскоўскага р-ну на 200 тыс. руб. штрафу.

СУМСКОВА Алена, 21 год. Асуджаная за падзеі 30.5.96 на шэсьць сутак арышту.

СУМСКОЎ Георгі, 52 гады. Зьбіты і затрыманы 30.5.96. З спэцразьмеркавальніка "хуткай дапамогай" дастаўлены ў лякарню.

СЬВІРЫН Ільля. 30.5.96 арыштаваны.

СЬЦЯПАНАЎ Сяргей. Затрыманы 19.10.96 каля ўнівэрсаму "Рыга" ўжо пасьля заканчэньня мітынгу апазыцыі. Накладзены штраф у 300 тыс. руб.

СЬЦЯПУРКА Андрэй, 1977 г. нар. 30.5.96 схоплены амонаўцамі і зьбіты. Пратрыманы суткі ў спэцразьмеркавальніку. Прысуджаны штраф 100 тыс. руб.

СЯМАШКА А. За падзеі 30.5.96 затрыманы міліцыяй.

СЯМАШКА В., намесьнік ген. дырэктара праграмаў беларускага тэлебачаньня. Затрыманы 17.11.96 каля Галоўпаштамту і абвінавачаны ў спробе прарыву міліцэйскага ачапленьня. Суд 11.12.96 прызнаў, што пратаколы сфальсыфікаваныя і спыніў справу.

СЯМЁНАЎ Георгі. 30.5.96 арыштаваны і асуджаны на пяць сутак.

ТАБУШАВА Ірма, настаўніца, сястра міністра юстыцыі В.Сукалы. Затрыманая 8.12.96 каля ст. мэтро Плошча Перамогі. Абвінавачаная ў супраціве міліцыі. Сп-ня Ірма заступілася за хлопца, якога ні за што пачала арыштоўваць міліцыя. 12 сьнежня яе справу разглядаў судзьдзя Цэнтральнага райсуда Каршуновіч, які асудзіў 60-гадовую жанчыну на 10 сутак арышту.

ТАЛОЧКА Віктар, журналіст БЕЛТА. Затрыманы супрацоўнікамі прэзыдэнцкай аховы 01.5.96. Засьвяціўшы стужку са здымкамі сьвяточнага шэсьця ў Менску, яго адпусьцілі.

ТАНКОВІЧ Канстанцін, беспрацоўны. Схапілі 10.12.96 каля апорнага пункту Ленінскага РАУС на вул. К.Маркса, парвалі куртку. Пратрымалі ў спэцпрыёмніку да 11 сьнежня, а потым прывезьлі ў Ленінскі суд. Абвінавачвалі ў тым, што трымаў плякат на пікеце. Суд вынес папярэджаньне.

ТАРЛЕЦКІ Эдвард, журналіст, карэспандэнт "Радыё Свабода". Жорстка зьбіты пад час шэсьця 26.4.96. Атрымаў траўму галавы.

ТЫМА Юры, дэпутат Вярхоўнай Рады Украіны. Накіроўваўся разам з групай украінскіх грамадзянаў, журналістаў у Менск дзеля ўдзелу ў Чарнобыльскім Шляху. Затрыманы ў ноч з 25 на 26.4.96 на станцыі ў Баранавічах разам зь іншымі грамадзянамі Украіны. Пратрыманы ў Баранавіцкім РАУС паўтары суткі.

УМРЭЙКА Віталь. 13.11.96 бяз санкцыі пракурора ўчастковым міліцыянтам праведзены вобшук у кватэры. Шукалі ўлёткі супраць рэфэрэндуму. Затрыманы 23.11.96 ў інтэрнаце РТІ за распаўсюджваньне ўлётак. Вызвалены за адсутнасьцю складу злачынства.

ФІРСІН Аляксей, 1977 г. нар. За ўдзел у падзеях 26.4.96 паводле арт. 156 асуджаны на 10 сутак.

ФРАЛОЎ Аляксей. 24.3.96 зьбіты міліцыяй і асуджаны на 500 тыс. руб.

ФРЫДРЫХ Аляксандар. 30.5.96 спрабаваў уступіцца за зьбіваных амонаўцамі пажылых мужчыну і жанчыну, атрымаў ад амонаўца дубінкай па галаве, страціў прытомнасьць. Сьведка — Багінская Ніна. У 3-й лякарні на рану на галаве наклалі 4 швы. Прайшоў судмэдэкспэртызу.

ФЯДОРЧАНКА Андрэй, мастак. Затрыманы і зьбіты падчас шэсьця 30.5.96 каля Дзяржбанку. Першы суд прысудзіў да штрафу, другі суд ня ўбачыў у яго дзеяньнях парушэньня законаў.

ФЯДОСЕНКА В., фатакар газэты "Советская Белоруссия". Затрыманы на мітынгу 2.4.96. Абвінавачаны ў закліках "ісьці на плошчу".

ХАДЫКА Юры, намесьнік старшыні БНФ. За падзеі 26.4.96 заведзеная крымінальная справа. Утрымліваўся ў заключэньні да суда. Абвясьціў галадоўку, трымаў яе 21 дзень. Да суда выпушчаны пад падпіску аб нявыезьдзе.

ХАЖАВЕЦ Віктар, 49 гадоў, прадпрымальнік. 24.3.96 каля будынка КГБ падымаў жанчыну гадоў 60, якая упала ад удару дубінкай. Сам атрымаў дубінкай моцны ўдар па галаве. Здолеў адпаўзьці ўбок.

ХАМАЙДА Барыс, рэдактар віцебскай газэты "Выбар". 18.05.96 за ўдзел у пікеце за вызваленьне Ю.Хадыкі і В.Сіўчыка ў Менску атрымаў трое сутак зьняволеньня. Прыцягнуты да суда за публікацыю верша С.Адамовіча "Убей президента". У Дзень Незалежнасьці, 27.07.96 у Віцебску затрыманы разам з Ул.Плешчанкам і Ю.Карпавым.

ХАРЧАНКА Зьміцер. 26.4.96 у 21.50 у раёне ўнівэрсама "Сталічны" зьбіты амонаўцам, зьбіваньне працягвалася пасьля затрыманьня. Складзены пратакол. У мітынгу ня ўдзельнічаў.

ЦЕРМАКЕВІЧ Вера, 54 гады. 26.4.96 у раёне пл. Я.Коласа спрабавала прысарамініць міліцыянтаў, якія зьбівалі мужчыну і дзяўчыну. Сама была жорстка зьбітая міліцыянтам. Зьняла пабоі ў паліклініцы. Дыягназ: "ушыб левага сьцягна". 30.05.96 арыштаваная і асуджаная на 15 сутак.

ЦІМОНЧЫК А. Затрыманы 26.4.96. Асуджаны.

ЦЬВІРКА Аляксандар, 29 год, рабочы. 22.11.1996 падчас кругласутачнага мітынгу каля парлямэнту выходзіў з будынку педагагічнага ўнівэрсытэту і быў схоплены невядомымі людзьмі ў цывільным. Пры спробе запіхнуць яго ў белую "Волгу", быў стукнуты галавой аб дзьверцы аўтамабіля. Па дарозе ў Маскоўскі РАУС зьбіты. Сьледчы не знайшоў складу злачынства. У РАУСе стала дрэнна. Быў адвезены ў 10-ю клінічную лякарню, дзе ўстаноўлены дыягназ: траўмы галаўнога мозгу, закрытая чэрапна-мазгавая траўма. Знаходзіўся ў лякарні 9 дзён. Пашпарт не вярнулі.

ЧАХОЛЬСКІ Алесь. За ўдзел у пікеце 22.2.1996 прыцягнуты да судовай адказнасьці і аштрафаваны.

ЧАНГУЛІ Наталья, грамадзянка Украіны, журналістка. Затрыманая за падзеі 26.4.96. Празь некалькі дзён выпушчаная як журналістка.

ЧУРЦЛОВІЧ Янка, жыхар Берасьця. Затрыманы 24.11.96 пры знаходжаньні няўлічаных бюлетэняў на выбарчым участку № 9 Маскоўскага раёну Берасьця. Зьвярнуўся да польскіх уладаў з просьбаю аб палітычным прытулку.

ЧЫСЛАЎ Сяргей. Арыштаваны 26.4.96 і асуджаны.

ШАВЕЛЬ Зьміцер, жыхар Лагойску. Прыехаў у Менск наведаць хворую маці. У мітынгу ня ўдзельнічаў, быў затрыманы 8 сьнежня на праспэкце Скарыны. Меў пры сабе вуду, якая, відаць, і выклікала падозраньне міліцыянтаў. Апошнія сьцьвярджаюць, што ён крычаў "непрыемныя" словы ў адрас прэзыдэнта. Да 9 сьнежня З.Шавеля трымалі ў спэцпрыёмніку, адабралі акуляры. Справа перададзеная ў суд Цэнтральнага раёну.

ШАПТЫЦКІ Андрэй, грамадзянін Украіны, 1967 г. нар. За падзеі 26.04.96 затрыманы, заведзеная крымінальная справа. Некалькі дзён трымаў сухую галадоўку. Асуджаны 5.09.96 Менскім гарадзкім судом да двух гадоў і трох месяцаў турмы.

ШАСТАКОЎ Аляксей. 30.5.96 схоплены людзьмі ў цывільным на прыпынку каля ГУМу. Моцна зьбіты. Асуджаны на 100 тыс. руб.

ШАЎЦОЎ Юры, аглядальнік газэты "Беларускі рынак". Зьбіты міліцыяй падчас дэманстрацыі 24.3.96.

ШАХОВІЧ Ігар, архітэктар з Калінінграду (Расея). Затрыманы разам з М.Грушко і М.Міхноўскім 8.12.96 на пр. Скарыны. З Цэнтральнага РАУС перавезены ў спэцпрыёмнік, дзе пратрыманы ўсю ноч да 9 сьнежня. Цэнтральны суд аштрафаваў І.Шаховіча на 300 тысяч рублёў.

ШКАБРАВА Вольга, 1931 г. нар. 24.3.96 атрымала ў вочы газ з балёнчыка. Потым у яе быў груба адабраны і зламаны бел-чырвона-белы сьцяжок.

ШКРАБАЎ Зьміцер. 28.9.96 каля 22.30 жорстка зьбіты ў раёне пл. Незалежнасьці, дастаўлены ў пастарунак. Абвінавачаны ва ўдзеле ў забароненай дэманстрацыі.

ШУРПАЧ Зьміцер, 1982 г. нар., вучань сярэдняй школы. 10.10.96 ў памяшканьні школы №152, дзе быў выбарчы ўчастак, жорстка зьбіты супрацоўнікам РАУС Ленінскага раёну Трусевічам.

ШУШКЕВІЧ Алег, 1978 г. нар. 30.05.96 схоплены і зьбіты амонаўцамі. Атрымаў пяць сутак арышту.

ШЫРОКАЎ. За падзеі 26.04.96 аштрафаваны на 200 тыс. руб.

ШЭМЁНКА Сяргей. Арыштаваны 31.05.96 у 9.00 у хаце за падзеі 30.05.96.

ШЭНДАРАЎ Сяргей, жыхар Барысава, намесьнік дырэктара школы. На пачатку лістапада затрыманы за распаўсюджваньне ўлётак БНФ. Складзены пратакол.

ЮХО Ўладзімер, сябра БНФ. Затрыманы 17.12.96 падчас правядзеньня пікету ў абарону арыштаваных 8 сьнежня Статкевіча, Табушавай і іншых. Суд Цэнтральнага раёну 18.12.96 вынес прысуд — 300.000 руб. штрафу.

ЯКІМОВІЧ Валянціна. 26.04.96 пад час шэсьця зьбітая і атручаная газам.

ЯНКОЎСКІ А., студэнт, 20 лістапада 1996 г. ў 14.00 на станцыі мэтро Плошча Незалежнасьці затрыманы супрацоўнікамі крымінальнага вышуку. Абвінавачаны ва ўдзеле ў несанкцыянаваным мітынгу і актыўным распаўсюджваньні незарэгістраванай паліграфічнай прадукцыі. Адвезены ў Маскоўскі РАУС, складзены пратакол. У судзе Маскоўскага р-ну судзьдзём Нікалаевым асуджаны на 200 тыс. руб. штрафу.

ЯНУКОВІЧ Іван, вэтэран II сусьветнай вайны, Полацак. 26.04.96 затрыманы за ўдзел у пікеце.

ЯНУШКЕВІЧ Язэп, літаратуразнаўца. 26.04.96 схоплены ў 21:00 на тралейбусным прыпынку каля ст. мэтро Кастрычніцкая. Зьбіты пасьля затрыманьня, страціў прытомнасьць. Асуджаны паводле 156 арт. Атрымаў 4 сутак зьняволеньня.

Здымак В.Сталіноўскага.

У складаньні ІНДЭКСУ ўдзельнічалі
Алег Дзярновіч, Севярын Квяткоўскі, Вацлаў Арэшка.

Просім усе заўвагі, дадаткі і дапаўненьні дасылаць на адрас: **220123 Менск, а/с 71, Архіў.**

Кнігі — поштай

1. М.Говард. Сучасная культурная антрапалёгія (25.000+8.000 БРБ)
2. У.Ла Бар. Асабістасьць з псыхааналітычнага пункту гледжаньня 12.000+5.000 БРБ)
3. Дж.Эйчысан. Гаваркія істоты: Уводзіны ў псыхалінгвістыку (10.000+6.000 БРБ)
4. П.Брунэль, К.Пішуа, А.-М.Русо. Што такое параўнальнае літаратуразнаўства (25.000+6.000 БРБ)
5. Б.М.Фэйган. Уводзіны ў археалёгію (10.000+6.000 БРБ)
6. Дж.Лоўзі. Гістарычныя ўводзіны ў філязофію навукі (20.000+6.000 БРБ)
7. Ж.Б.Дзюрасэль. Эўропа з 1815 году да нашых дзён (15.000+8.000 БРБ)
8. Ф.Брэтон, С.Пру. Выбух камунікацыі (20.000+6.000 БРБ)
9. Ж.Эрш. Філязофскае здумленьне (30.000+6.000 БРБ)
10. Ш.Дэбаш, Ж.-М. Пант'е. Уводзіны ў палітыку (30.000+8.000 БРБ)
11. К.Г.Рын. Дэмакратыя і этычнае жыцьцё (25.000+5.000 БРБ)
12. Дж.Бэрдшоў. Эканоміка. Ч.1: Мікараэканоміка / Дапаможнік для студэнтаў (45.000+10.000 БРБ)
13. Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры). №1('96) (30.000+6.000 БРБ)
14. **Фрагмэнты (філязофіі, культуралёгіі, літаратуры).** №2('97) (40.000+10.000 БРБ)
15. **Крыўя.** №1, 1994 (45.000+6.000 БРБ)
16. **Крыўя.** №1, 1996 (55.000+6.000 БРБ)
17. **В.Кіпель. Беларусы ў ЗША** (15.000+8.000 БРБ)
18. М.Грыгор'еў. Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі, 1764-1794 (20.000+5.000 БРБ)
19. Т.Сапач. Восень (10.000+3.000 БРБ)
20. А.Глёбус. Толькі не гавары маёй маме... (30.000+8.000 БРБ)
21. Э.Сміт. Нацыяналізм у дваццатым стагодзьдзі (15.000+6.000 БРБ)
22. А.Глёбус. Скрыжаваньне (10.000+3.000 БРБ)
23. Беларускі вайсковы строй і зброя (20.000+3.000 БРБ)
24. Беларускі рок-н-рол (10.000+3.000 БРБ)
25. Кася ў школцы (9.000+4.000 БРБ)
26. Пітэр Бэрк. Рэнэсанс (25.000 + 6.000)
27. Каляндар газэты Царква. 1997 (15.000 + 5.000)
28. Ю.Штайнэр. Эўрапейскія дэмакратыі (25.000+10.000 БРБ)

Каб замовіць патрэбную Вам кнігу, неабходна пазначаную суму плюс суму за перасылку праз пошту пералічыць на наступны рахунак: *БГФ "Наша Ніва" р/р 3015201930039 "Гарант" філія АКБ "Поіск" г. Менска, код 987.*

Не забудзьцеся на паштовай квітанцыі ў сэктары "Для пісьмовага паведамленьня" ўказаць назву кнігі й Ваш дакладны паштовы адрас і калі ёсць тэлефон.

Зьвяртацца можна праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч.

Касэты-поштай

На складзе БГФ "Наша Ніва" ёсьць касэты (кошт 32.000 +7.000 БРБ):

1. Ален. Нармалёк 2 альбо Мафія (1996)
2. Вольга Акуліч.Трохкутнік
3. Вальжына Цярэшчанка (1991-1995)
4. Беларускія народныя казкі
5. Музычныя казкі (1996)
6. Бонда. Найлепшыя песьні
7. Данчык. Я ад вас далёка. Мы адной табе належым.
8. Данчык. Мы яшчэ сустрэнемся.
9. Новае неба. Дзеці чорнага гораду (1991)
10. Новае неба. Сон у трамваі (1994)
11. Новае неба. Go home (1995)
12. Новае неба. Мая краіна (1996)
13. Крама. Хворы на рок-н-рол (1993)
14. Крама. Гэй, там, налівай! (1994)
15. Крама. Камэндант (1995)
16. Крама. Лепшыя песьні (1993-1995)
17. Мроя. Найлепшыя песьні з праграмаў 1988-1990
18. NRM. LaLaLaLa (1995)
19. NRM. Одзірыдзідзіна (1996)
20-23. Беларуская музычная літаратура (т.1-4)
24-28. Залаты фонд Беларускага рок-н-ролу (т.1-5)
   т.1. Бонда. Уліс. Рэй. Мясцовы час. Блізьняты (1986-1990)
   т.2. Бонда. Уліс. Мроя. Крама. Новае неба. Мясцовы час. Тутэйшыя хлопцы (1990-1993)
   т.3. Золотая середина. Отражение. Алексей Шедько & Доктор Моро. Гранит. Метро. Сузор'е. Зартипо (1986-1991)
   т.4. Палац. Уліс. Крама. Новае неба. Мроя (1992-1994)
   т.5. Зиндан. Why Not. Отражение. Инспектор. Тарнадо. Флэт (1992-1994)
29. Рок па вакацыях-96 (NRM. Уліс. Флэт. Тарнада. Крама.Рублёвая зона. Новае неба. А.Шадзько і А.Юшын)
30. Будзьце аптымістамі, рабіце дзетак (Новае неба. Ляпис Трубецкой. NRM. Палац. 1996)
31-33. Беларускі джаз
   т.1. Рэнэсанс
   т.2. Ігар Сафонаў
   т.3. Яблычная гарбата. Пчаліны танец.
34. Беларуская гітарная музыка (1996)
35. Беларуская сымфанічная музыка (1996)
36. Яўген Паплаўскі. Творы (1996)
37-39. Лепшыя музычна-драматычныя творы радыёстанцыі "Беларуская маладзёжная"
   т.1. Чалавек, якому хацелася ўсяго (памяці Ф.Мэркуры)
   т.2. Лесьвіца ў нябёсы (фантазыя па матывах Лед Зэпэлін, Робэрта Планта і Рычарда Баха)
   т.3. Танец поўні (прагулка са Стынгам)
40. Андрэй Мельнікаў. Успамін (1994-1995)
41. Андрэй Мельнікаў. Салам Саўкам (1993)
42. Андрэй Мельнікаў. Песьні выгнаньня (1991-1993)
43. Андрэй Мельнікаў. Камяні майго вогнішча (1994-1995)
44. Андрэй Мельнікаў. Да апошняга камісара (1995-1996)
45. Андрэй Мельнікаў. Гэта мы (1996)
46. Андрэй Мельнікаў. Шлях. 2 часткі (1996)
47. Уліс. Краіна доўгай белай хмары (1990)
48. Уліс. Чужаніца (1991)
49. Уліс. Танцы на даху (1993)
50. Уліс. Life-96
51. Уліс. Блуканьне (1996)
52. Мясцовы час. Наша ўскраіна (1991)
53. Віктар Шалкевіч. Смутны беларускі блюз (1996)
54. Палац (1995)
55. Песьні беларускіх бардаў (1992)
56. Рок супраць рэвалюцыяў (Новае неба. Зіндан. Уліс. Мроя.Крама, 1994)
57. Маладзёжныя хрысьціянскія сьпевы. Прыйдзі і праслаўляй (1996)
58. Ліцьвіны. Неба і зямля (1994)
59. Ліцьвіны. Пятае сакавіка (1996)
60. Зьміцер Бартосік. Да пабачэньня... (1996)
61. Уладзімер Клімовіч. Дзеці вятроў (1997)
62. Камэлот. У краіне талераў. (1995)
63. Ігар Палівода "Максім"(1997)
64. Неруш (1997)
65. Ален. Нармалёк (1995)

кошт 27.000 + 7.000 БРБ:

66. Новае неба. Выбранае. Песьні з альбомаў 1990-1996 г.
67. Уліс. Ратуйце вашыя душы. Песьні з альбомаў 1996 г.
68. NRM. Made in NRM. Песьні з альбомаў 1995-1996 г.

Касэты можна замовіць праз пошту: 220085 Менск, а/с 5, Віталь Супрановіч.

Новыя кнігі, дасланыя ў рэдакцыю

Жук К. Галгофа: Вершы і паэмы. — Менск: Мастацкая літаратура, 1997. — 254 с. 1000 ас. ISBN 985-02-0314-5

Жыгоцкі М. Побач з Коласам. — Менск: Беларуская навука, 1996. — 196 с.: іл. 2000 ас. ISBN 985-08-0025-9

Кантакты і дыялёгі. Інфармацыйна-аналітычны і культуралягічны бюлетэнь. — Менск: Беларусь, 1997. №4 (16). 56 с. 499 ас.

Капусьцін А. Усяму беламу сьвету: Апавяданьні, абразкі, нарысы. — Менск: Мастацкая літаратура, 1997. — 286 с. 1000 ас. ISBN 985-02-0224-6

Назіна І. Беларускія народныя музычныя інструмэнты. — Менск: Беларусь, 1997. — 239 с.: іл. 4000 ас. ISBN 985-01-0061-3

Паўлаў У. Хто знае — адгадае: Вершы, забаўлянкі-пазнаванкі, загадкі, казкі. — Менск: Юнацтва, 1997. — 112 с.: іл. 300 ас. ISBN 985-05-0042-5

Эканоміка ці народная гаспадарка?

Галубовіч В. Эканамічны стан, побыт і гандаль Старажытнай Беларусі (IX-XIII ст.): Дапаможнік. — Менск: ВП "Экапэрспэктыва", 1997. — 175 с.

Аўтар гэтага дапаможніка для студэнтаў эканамічных спэцыяльнасьцяў мае рацыю, калі кажа пра неабходнасьць канкрэтна-гістарычнага вывучэньня эканомікі Беларусі. Сапраўды, названая тэма ахутаная застарэлымі поглядамі навукоўцаў і гэтая кніга — адзін зь першых, а значыць, важны крок у яе дасьледаваньні. Калі ставіцца мэта пераадолець застарэлыя ўяўленьні, чытач мае права разьлічваць на выкарыстаньне аўтарам найноўшай навуковай літаратуры. Але зазірнуўшы ў бібліяграфію, чытач убачыць, што дасьледаваньні апошніх 10 гадоў амаль ня выкарыстаныя. Затое прыведзена багата кніг XIX — першай паловы XX ст. Гэта насьцярожвае.

Асьвятленьне "эканамічнага стану Старажытнай Беларусі" пачатае паводле гістматаўскіх уяўленьняў з аналізу матэрыяльнай вытворчасьці — зь сельскай гаспадаркі. Таму чытач так і не даведаецца, што такое "Старажытная Беларусь", і як яна суадносіцца з сучаснаю Беларусьсю. У кнізе ёсьць месца, дзе выкладзены "зьнешні гандаль" Старажытнай Беларусі з княствамі Кіеўскай Русі. І без дадатковых тлумачэньняў можа скласьціся ўражаньне, што Мазыр (Кіеўскае княства) і Гомель (Чарнігаўскае княства) — гэта не Старажытная Беларусь. Затое Смаленск разглядаецца ў старажытнабеларускім кантэксьце. Калі б гэтая праблема была растлумачаная, то чытач даведаўся б пра тыя княствы, што існавалі на нашай зямлі, пра іх межы, гарады, палітычныя ўзаемаадносіны. Пасьля можна было б перайсьці і да грамадзкіх адносінаў, урэшце, да эканамічных адносінаў — спэцыфічнай групы сацыяльных.

Аўтар вырашыў інакш: сьпярша расказаць пра матэрыяльны бок жыцьця народа: сельскую гаспадарку, рамяство, промыслы. Матэрыял сабраны рознабаковы, але ўсё ж састарэлая літаратура часам падводзіць. Ці быў у Беларусі ў IX ст. плуг? Сярод археалягічных знаходак няма піводнай, якую можна было б суаднесьці з плужным лемехам. Плуг не прыгадваецца ў старажытных пісьмовых крыніцах. Вядома, што ў позьнім сярэднявеччы Беларусь падзялялася на дзьве зоны: у паўночна-усходняй выкарыстоўвалі саху т.зв. рускага тыпу, а ў паўднёва-заходняй — палескага тыпу. Гэтымі сохамі можна было пераворочваць пласт глебы, што задавальняла сялян аж да XIX ст., калі ў Беларусі зьявіліся фабрычныя плугі.

У іншым парадку варта было б расставіць свойскіх жывёлаў, якіх разводзілі ў Беларусі: буйная рагатая жывёла (а не валы і каровы), сьвіньні, дробная рагатая жывёла, нарэшце, коні, якім у кнізе аддадзенае першынство (дарэчы, іх мяса ўжывалі ў ежу, але разводзілі коней параўнальна мала).

Выкарыстаньне старой літаратуры прывяло да пэўных хібаў у разьдзеле пра рамяство. Вытворчасьць жалеза была ня толькі вясковым заняткам, бо ў кожным горадзе Беларусі пры раскопках сустракаюць шматлікія шлакі. Крыца — зусім ня зьлітак жалеза, бо ў домніцах жалеза не выплаўлялі, а аднаўлялі. Зерне не рабілася з дапамогай маленькага зубіла і малаточка — гэта напаяныя шарыкі мэталу. У IX-XIII ст. будавалі пераважна не пяцісьценныя драўляныя дамы, а самыя простыя, аднакамэрныя. Гэтыя прыклады можна працягваць і далей, але найбольш засмучае катэгарычная выснова: "Ніякага перавароту ў разьвіцьці тэхнікі плаўкі і апрацоўкі мэталаў, косьці, дрэва, скуры ў сувязі з пашырэньнем і паглыбленьнем міжнародных эканамічных адносінаў... не адбылося". Але можна назваць галіны рамяства, якія ўзьніклі дзякуючы менавіта такім сувязям: вытворчасьць шкла, выраб пергагародчатых эмаляў, смальты для мазаікі, біцьцё манэты, каменнае будаўніцтва і інш. Зьдзіўляе сьцьверджаньне, быццам пісьменства ў Беларусі было з IX ст.

У кнізе адведзены разьдзел і для такой папулярнай некалі эканамічнай катэгорыі, як промыслы. Катэгорыя даволі цьмяная, розныя аўтары разумеюць яе па-рознаму. У кнізе няма вызначэньня промыслу, тут пад гэтым разумеюцца паляўнічтва, рыбацтва, зьбіральніцтва, а таксама — нарыхтоўка драўнянага вугалю, лесаматэрыялаў, вытворчасьць дзёгцю і паташу. Чаму гэта не рамёствы? І ці слушна будзе пра апошнія заняткі сказаць: "Промыслы ў IX-XIII ст. страцілі сваё былое значэньне, сталі другарадным заняткам"? У позьнім сярэднявеччы яны нават мелі свой росквіт.

Палова кнігі адведзеная гандлю, што апраўдана, бо эканомікі без абмену няма. Але аўтара і тут найперш зацікавіў матэрыяльны бок справы: што вывозілі, адкуль увозілі, шляхі зносін, віды манэты. Сацыяльная арганізацыя гандлю, як і матэрыяльнай вытворчасьці, засталася ў баку, а значыць, засталася невызнанаю сутнасьць гандлю. Бізантыйскі імпэратар X ст. Канстанцін Пурпураноджаны даў клясычнае апісаньне палюдзьдзя кіеўскіх князёў, у тым ліку і на беларускіх землях. Потым сабраная даніна рэалізоўвалася ў Канстантынопалі. Ці былі гэтыя ўнутраныя і зьнешнія апэрацыі гандлем? Ва ўсялякім разе, бізантыйская манэта на Русь амаль не паступала. Цалкам можна пагадзіцца з аўтарам, што гандляр гэтага часу — гэта ваяр (аўтар дадае — "акуратна апрануты"). Аднак дарэчы было б налажэньне, што гандлярамі станавіліся асобы пераважна зь ліку княскіх дружыньнікаў, што проста вынікае зь пісьмовых крыніцаў. Княскія дружыньнікі сталі асновай клясы фэадалаў, таму гістарычна атрымалася, што ў фэадальныя часы гандаль знаходзіўся пад кантролем баярства.

Зь якойсьці старой літаратуры аўтар запазычыў палажэньне пра вялікую ролю царквы ў разьвіцьці гандлю. "Спачатку гандаль адбываўся непасрэдна ў царкве", — гэта гучыць дужа рызыкоўна. Пасьля, на думку аўтара, гандаль вёўся каля царквы, але нідзе ў кнізе няма шырокавядомага факту пра тое, што рынкавы пляц у фэадальных гарадах мясьціўся звычайна каля ўязной брамы. Гэта агульная рыса і беларускіх гарадоў.

Зьнешняму гандлю аўтар прысьвяціў шмат зьмястоўных старонак, але й тут кідаюцца ў вочы некаторыя хібы. Навукоўцы ўжо даўно адмовіліся ад думкі, што бурштын на Русь трапляў толькі з Прыбалтыкі. Са старажытных часоў вядомыя яго радовішчы ва Ўкраіне і Беларусі. З працы ў працу (пераважна, навукова-папулярныя) трапляе думка, што Беларусь вяла шырокі міжнародны гандаль хлебам. Так і было, толькі з XV-XVI ст. Наўрад ці беларускае купецтва імпартавала гваздзік і карыцу, бо гэтыя спэцыі атрымалі хаджэньне толькі ў эпоху Вялікіх геаграфічных адкрыцьцяў, з канца XV ст. "Прадметы мастацкага рамяства зь сярэдзіны XI ст. ужо ня ўвозіліся", — з гэтым пагадзіцца ніяк нельга, як і з галоўнай высновай пра ўнутраны і зьнешні гандаль Беларусі: першы пераўзыходзіў другі ў IX-XI ст., і наадварот было ў XII-XIII ст. Пра гэта няма ніякіх статыстычных зьвестак.

Апраўдана шмат месца адведзена знакамітай дамове 1229 г. Смаленскага, Віцебскага і Полацкага княстваў з Рыгай і Готскім берагам. Тэму міжнароднага гандлёвага права варта было разьвіць і вылучыць у асобны разьдзел, як і некаторыя іншыя галіны права. Толькі згадваецца ў кнізе і крэдыт, а без крэдыту ж няма сапраўднай эканомікі.

Увогуле сабраны ў кнізе матэрыял не дазваляе зрабіць агульную ацэнку "эканамічнага стану", бо ў ёй, як паветра, не хапае аналізу грамадзкіх адносінаў. Зь іншых дасьледаваньняў вядома, што гаспадарка Беларусі ў той час мела натуральны характар, гандаль быў даволі абмежаваным і знаходзіўся пад кантролем дзяржавы ў асобе князёў і буйных землеўласьнікаў. У такіх умовах няма і сапраўднай эканомікі. Больш удалы за "эканоміку" тэрмін "народная гаспадарка" Беларусі, які выкарыстаны ў прадмове да кнігі і зусім забыты на яе далейшых старонках. У адказ на жаданьне аўтара "адабраць з нашай далёкай і блізкай гісторыі тыя каштоўнасьці і эканамічныя інстытуты, якія сябе апраўдалі і вытрымалі выпрабаваньне часам, і ўзяць іх на ўзбраеньне", хочацца нагадаць, што цяперашнія дзяржаўныя кіраўнікі нашай краіны так і робяць, і нашае грамадзтва, мінаючы эканамічныя адносіны, пасьпяхова рухаецца ад дзяржаўнага капіталізму да дзяржаўнага фэадалізму.

Валеры Пазьняковы

ГРАМАФОН.

[...]

***

Не хачу быць шэрай
Ў гэтым шэрым сьвеце,
А хачу быць шчырай,
Як малыя дзеці.

Не хачу быць плямай
Чорнага на чорным,
Ці барвовай зьнічкай
На зялёным фоне.

Не хачу быць быдлам
Ні ў чыім загоне,
Ці маўклівай рыбкай
У ціхім затоне.

Не хачу я ведаць
Дзе, калі, за колькі,
Не хачу наведваць
Тлумныя папойкі.

Я паплёўваць буду
З століна падлогу,
Ды ня буду думаць
Пра перасьцярогу,

Бо хачу я міру
Перш за ўсё — з сабою.
Не хачу кефіру,
П'яная й вадою.

П'яная вадою
Ды шалёнай воляй,
Як той першы бусел
У вясновым полі.

Не хачу як трэба
Ціха жыць, спакойна,
А хачу мець крылы.
Думаць-лётаць вольна!

Ніна Аксёнчык

МАГІЛЬШЧЫКАМ БЕЛАРУСІ

Народныя, заслужаныя, дзе вы?
Калі Айчыну душаць круганы —
З прадажнасьцю прапітай скуры-дзевы
Гуляеце на балі ў сатаны.

Гандлюеце душой сваёй і целам,
Ўслаўляючы аддана д'ябла час.
Узнагароду шчодрую ўмела
З крывёй Хрыста Люцыпар дасьць для вас.

Вы ўзышлі пад беларускім небам.
Зямля сьвятая вам дала ўзьлёт.
Вас наталіла мовай, песьняй, хлебам.
А вы падзяку — камень ёй і лёд.

Вы апплявалі родныя магілы,
І зганьбілі сьвяты Айчыны шлях,
Яе сыноў — арлоў шыракакрылых —
Ганьбуеце штодня на ўсіх вятрах.

І самае сьвятое у народа —
Яго душу, што моваю завуць,
Вы топчаце зь ліхою асалодай,
Ці знаючы, як продкі вас клянуць.

Бо вам няма спагадны дараваньня,
Зямныя служкі цемры і чарцей.
Прадзедаўскія знакі пакараньня
Празь сем кален узыдуць на дзяцей.

Народныя, заслужаныя, дзе вы?

ІЧКЕРЫЯ І БЕЛАРУСЬ

Чачня і Беларусь...
Горы — і балота,
Горды арол — і гусь.
Воля — і бядота.

Амаль што падобны сьцяг.
Вораг і доля — тая ж.
Адзін — да свабоды шлях.
Другі — рабом вымірае.

Прачніся ж,
Мой родны раб —
Брат ад крыві
да хлеба.
Стань Беларусам,
каб
Арлом узляцець у неба.

БЕЛАРУСЫ-АБЫЯКІ

Беларусы-абыякі...
Вам ці лета ці сынягі —
З агародаў тарчаць с...,
Нібы белыя сьцягі.

[...]

НЯМА...

Пакой, нікога, курна, ціш,
У сьвечнік курацца запалкі,
Я сьціснуў розум, я лічу,
Я сэрца рэжу на кавалкі...

Затым усім, каго кахаў,
Дашлюць па пошце мяккі клунак,
Спадзеў я маю: сэрца кус
Для іх найлепшы мой дарунак...

А дух, душа, астанак мой,
Надзеі, погляды і думкі,
Ў якіх нічога больш няма? —
Хай зь іх павук сьпляце карункі...

Аляксандар Антончык

БЕЛАРУСЬ МАЯ МАТУЛЯ

Беларусь мая матуля
Міла птушачка зязюля
Разбрыліся твае дзеці
Па ўсім велькім белым сьвеце

Яны шчасьцейка шукаюць
Шчасьцейка і волі
Надаелі ім нягоды
Захацелась лепшай долі

У старане чужой жывуць
Крапівой ля плоту
Спадарожнікамі ў іх
Сум, туга, журбота

Прыляці радная мама
Ты ў той край далёкі
Празь лясы, высокі горы
Й акіян шырокі

Сядзь ў зялёненькім садочку
Раньняю парою
Разгані журботу ў дзетак
Песьняю сваёю

Запрасі ў мясьціны родны
Маладых і сталых
Пакалечаных нудою
Сьмелых і ўдалых

Тых, хто піў з тваіх грудзёў
Нэктар жыватворны
Каго песьціў і люляў
Нёман ў хвалях вольных

Бо дзе б дзеці ні жылі
У горкую хвіліну
Цягне ў госьці завітаць іх
Да цябе ў хаціну

Завітаць і прытуліцца
Да пляча раднога
Даражэй чым ты матуля
Ў нас няма нікога

Тацяна Будовіч

***

Я кожную думку Вашу
Ў палон завабіць хацела.
Зьняволіць, свавольна стаўшы
Заступнікам самым верным.

Але зразумела з жахам,
Што сэрца маё — ня сэрца,
А вурна зь ягоным прахам,
Канстанта ягонай сьмерці.

Любіць яе — немагчыма.
І сэнсу ў тым — ані кроплі,
Яна — то маё злачынства,
І мне яго — век замольваць.

... Я кожную думку Вашу
Ў палон завабіць хацела.
Зьняволіць свавольна стаўшы
Заступнікам самым верным.

Усевалад Гарачка

ГІМН АМАТАРАЎ ПІВА

Дзеля пітва і воблы
Я б адрокся ад трона.
Воблу з куфалем піва
Не заменіць карона.

Куфаль піва і вобла —
Мае скіпэтр зь дзяржавай.
Вобла з куфалем піва
Лепш рэгалій іржавых.

Надзя Голубева

***

Давайце спынім гэты чорны час,
Давайце возьмемся за рукі, людзі,
Здаецца мне, Бог не пакіне нас,
Не дапаможам мы — нічога тут ня будзе...

Давайце верыць у любоў, у літасьць,
мужнасьць,
Давайце заўважаць вакол сабе сяброў,
Давайце найхутчэй жыць будзем дружна,
Забудзем пра вайну, дыктат і кроў.

Пара б ужо за розум ўзяцца,
І на ўвесь голас закрычаць:
"Мы жыць жадаем! Надакучыла баяцца!
Краіну-маці будзем мы абараняць!"

Урэшце рэшт, шаноўныя, бывайце,
Дапамажы нам Божа і на гэты раз,
Калі жадаеце — трывайце...
А калі не — чытайце мой наказ.

Жыве спакой, жыве Краіна,
(Чамусьці, гэтых слоў я не баюсь) —
Жыве адзіная у сьвеце Бел-чырван-белая
Радзіма,
Жыве на векі наша прыгажуня Беларусь!

Яўген Гучок

***

Так, фарбы не адной маёй душы
Ня знойдуць месца
На парсунах родных.

***

Дзе справе твайго жыцьця,
Гняздо не дазволена зьвіць,
Ты пойдзеш адтуль у выгнаньне.

***

Як у цябе Радзіма ў сэрцы ные,
То як закон — з Радзімы
Выганяць цябе.

***

Ты душу адкрываеш для людзей,
Яны ж цябе і разрываюць,
І выкідваюць.

***

Такіх асоб такая дзейнасьць
Звычайна фінішуе
На чужыне.

***

Што тут рабілася, і робіцца, і будзе,
Такое можна вытрымаць адтуль —
З далёкага выгнаньня.

***

Не, я — ня ўсе
І не такі, як тыя ўсе;
І мне таму няма тут болей месца.

***

Наш край — і Чэхія —
То не дарога дружбы,
То проста шлях уцёкаў ад шаленства.

***

Шчэ доўга будзеце вы жыць
І доўга будзеце яшчэ шукаць,
Каго б яшчэ прагнаць з Радзімы.

***

Усё ж лепей, калі немец твой сусед,
Чымся мангол, "przepraszam"
Ці масковец.

Уладзімер Жаўняк

Я ВОЛЬНЫ ВЕЦЕР

Я вольны вецер, я птушка з краю
Свабоды, шчасьця і цягла.
Я вольны вецер, я сьпяваю
Людзям мэлёдыі жыцьця —

Мэлёдыі свабоды, волі.
Бязь іх ня ведаю, як жыць.
Я вольны вецер, мне ў няволі,
І жыць агідна і юрыць.

Другая справа быць свабодным:
Расправіць крылы і ляцець,
Лунаць над краем маім родным
Ці проста людзям песьні пець.

Я веру, што народ прачнецца,
Свабодным, вольным зажыве!
Няхай жа песьня шчасьця льецца,
Няхай жа Беларусь жыве!

Андрэй Захаранка

СЬВЯТА

Агаце Нагорнай
Праваслаўная Вербная нядзеля.
Кволыя галінкі стаяць на маім
стале й грэюць маё сэрца...

Старадаўні храм, праваслаўны дух,
Прытамлёных дум нетаропкі рух.
У аклад стары, бы да шкла прынік,
Утуліўся сон — стараветны лік.

У скляпеньні дах, у выявы столь...
Ахіне душу, перасіліць боль
І на раны лек — у сівы прастор
Удыхне жыцьцё праваслаўны хор.

Па шчацэ — сьляза, у душы — сьвятло.
Старадаўні храм, Цішыні жытло!
У сьвечным вагні, перагнілы трут,
Дагарае спрэс чалавечы бруд.

Прытулю шчаку да тваёй сьцяны,
Спавяду табе пра віну маны.
На грудзях тваіх — нязгойны шрам,
Пракаветны мой, праваслаўны храм!

І няхай сьвятар да тае бяды
Пра апошні час наддае нуды,
І няхай нашчэнт ахунае ў млосьць
Векавых бабуль векавая злосьць.

Не да іх іду я ў твае муры,
На звановы гук у сьвятой Гары —
У гаючы сум, у Хрыстовы сьвет
І тваіх крыжоў залаты Сусьвет.

Сяргей Званар

Думкі смутныя
Прыходзяць да мяне;
Край родны ў сьне
Ў гады пакутныя.

Зьнявагу прынесьлі
Круганы чорныя,
Змоўклі песьні
Пра зямлю і волю.

На плячах крыўда,
Душу запоўніла бяда,
Ногі абуты
Ў жалезныя путы.

Кіруе балем зла
Нячысьцік-сатана.
Дзе ж схавалася ты,
Сьвядомая грамада?

ПАЎТАРЭНЬНЕ ГІСТОРЫІ

Зноў грукоча пажарам
Год трыццаць сёмы.
Дрэвы стогнуць пад цяжарам,
Хмары пакрыліся колерам чорным.
Вецер руйнуе вольныя прасторы,
Бяду набліжае рок,
Страляюць агнём горы,
Ды не пачуе нас Бог.

СЯБРОЎЦЫ З АРШАНШЧЫНЫ

Адпачыўшы аднойчы ў Барані,
Туды на крылах каханьня лячу.
Сьняцца мне незабыўныя спатканьні,
Бачыць цябе ў сталіцы хачу.

Успомнім былыя сустрэчы,
Маленькую вёсачку Суцін.
Запалім уначы сьвечы,
Лягчэй на душы будзе.

Мікола Кулік

АХОЎНІКІ РЭЖЫМУ

Яны хаваюць свае твары,
Замест душы у іх браня.
Амапавідныя пачвары,
Што ганьбяць годнасьць і імя.

Іх гаспадар псыхічна хворы,
Гвалтоўнік мараў і надзей.
Ён нам нясе вайну і гора,
Бо ненавідзіць нас, людзей.

Але час прыйдзе, і ўсё роўна
Ім прыйдзецца трымаць адказ
За "паляваньне" без законаў,
За тое, што забілі нас.

Мікола Максімаў

СУМНЕВУ НЯМА

На нос ціснуць акуляры,
Асьляпляюць вочы фары.
Грукочуць цяжка па дарозе колы,
Наўкола цемень, мокрадзь, холад.

Танкі ідуць адзін за адным,
Мы ў канаве пры дарозе ляжым,
Снарад рэактыўны ў нас не адзін,
Мы не страляем, ляжым і маўчым.

Танкі праходзяць, за імі машыны,
Пад брызэнтам жаўнеры, брудныя шыны.
Нас ня ўбачаць, цёмнае неба,
Сталі мы рызьзем, такая патрэба.

Два БэТэРы замыкаюць калёну,
Стрэлілі ў іх, ды ў хмыз адсюль ходу.
У дагонку нам кулі, нават снарады,
Нас не знаходзяць, чаму мы й рады.

Нашы снарады мэту знайшлі,
Два БэТэРы гараць уначы.
Дзесяць забітых, як апынулася,
У цынкавых трунах дадому вярнуліся.

Два кіламэтры беглі па лесе,
Шасьцёра жаўнераў, радых як дзеці.
Пачаўся гушчар, перайшлі на хаду,
Ззаду маторы танкаў равуць.

Танкі ў лесе нам ня страшны,
Мы ля балотцу гужам ішлі.
Вось і наш лягер, радасьць вяртаньня,
Будзе гулянка да самага раньня.

Покуль Радзіма вольнай ня будзе,
Мы ваяры, а ня мірныя людзі.
У перамозе сумневаў няма,
І падыходзіць вайна да канца.

А.Мітрэнга

НЯЎЖО ДАРМА?

Адбывалася гэта
Ў час паўстаньня. Тады
На дварэ было лета
І буялі сады.
Ярка сонца сьвяціла,
Не было ў небе хмар,
А каля гільяціны
Кат ахвяру чакаў.
А вакол птушкі пелі
І зьбіраўся народ.
Як звычайна, сядзелі
Гандляры ля варот.
Раптам сьціхлі размовы,
Птушкі скончылі пець:
Арыштант між аховы
Сустракаць ішоў сьмерць.
Быў ня раз катаваны,
Але цьвёрда ступаў,
Ня быў лёсам зламаны,
Тупаў горда, як пан.
Падышоў ён да ката,
Паглядзеў на наўтоп
І згадаў сваю хату,
Дзе ня быў цэлы год.
Засталася там маці,
Што чакала яго,
Ды ёй сына-паўстанца
Не пабачыць ужо.
Ён з пагардай, тугою
Паглядзеў на канвой:
"Ці вядома, за што я
Заплачу галавой?
Я за край свой змагаўся,
Проста так не сядзеў,
Праўды я дамагаўся,
Я свабоды хацеў!
Беларускую мову
Я любіў, паважаў,
Слухаць родныя словы
На Радзіме жадаў.
Як жа лёгка, панове,
Скончыць жыць ў дваццаць год:
Трэба памятаць мову
І любіць свой народ!
Але я не паверу,
Што дарма ўсё было,
Я захоўваю веру —
Пераможам мы зло.
Прыйдзе час — і шчасьлівай
Стане Белая Русь.
Верце, гэта магчыма —
Зажыве беларус!"
Хлопец пражагнаўся,
Перастаў гаварыць...
Сьмерці ён не збаяўся,
Хоць хацеў вельмі жыць.
А цяпер адкажыце,
Хіба зьменена ўсё?
На наш час паглядзіце —
Пераможана зло?
Няўжо марна змагаўся
І загінуў герой?..
Пэўна, марна ён рваўся
Ў сьвяты гэты бой.

Агата Нагорная

ВЫПРАБАВАНЬНЕ РАДЗІМАЙ

Іспыты на высакароднасьць
Праводзіць гісторыя зноў.
За грошы ня купіш годнасьць.
Цана ёй — сьвятая кроў.

Жыцьця свайго не шкадавалі
Вялікага Княства сыны,
Радзіму абаранялі
І клаліся ў курганы.

Сумна шумеў і скрушна
Паліты крывёю лес,
І несьлі на крылах птушкі
Да нас праз гады палянэз.

Разьвітацца з Радзімай нельга,
Калі яна ў сэрцы жыве!
Хай нелюдзі ціснуцца ў чэргі,
Хай душы нясуць сатане.

Гісторыя ім адпомсьціць,
З пагардай адкіне ў нябыт!
Гонар краіны і годнасьць
Вышэйшыя за дабрабыт!

***

Мелкаводныя думкі,
Пустазвонныя словы,
Недарэчныя гукі
Недавучанай мовы

Надта брудзяць эфір,
Рэжуць слых далікатны
І засмоктваюць ў вір
Ваяўнічых дэбатаў.

І псуецца наш густ,
І пачуцьці нямеюць:
Ухваляем прымус,
Як збавеньня надзею.

Сяргей Патаранскі

РЫЧАРД

Ты вывеў свой народ на сьцезі жорсткіх
войн,
жабрацтва, марадзёрства і падману.
За тое ў сатаны любімы ты герой
і прыхвасьцень Люцыпара паганы.

Халоп, які ўскараскаўся на трон,
хлусьнёй сваёю апляваўшы Бога,
сваё сумленьне ты зьмяшаў з крывёй,
у пекла табе, выradак, дарога.

ПЁТАР ВЯЛІКІ

Ты быў вялікі. Але для каго?
Народ, што стаўшы паліцаем сьвету,
ці велічэн набыў? І для чаго
крывавую ўзьняў буру на Русі? Якую
цешыў мэту?

Спасобіў ты булатны востры меч
як быццам бы ў імя сваёй дзяржавы,
а на вагні гарэла праўда веч
дзеля садысцкай і ліхой забавы.

Дзеля якіх нямысьлімых пацех
ты гнаў рабоў зь Літвы і Беларусі?
Народаў ганьба, — твой халодны сьмех
ды кошт бязглуздых і пустых клюзій.

Названы ты вялікім і сьвятым...
Няхай пра велічэ тую мне раскажуць,
хто лёг касьцьмі пад сфінксам залатым,
тваёй сталіцы ладзячы пэйзажы.

Цяпер маўчыш, мядзяны гаспадзін
часоў жахлівай, цемрашальскай славы.
Чаго чакаеш, сьпеставаны сын
гісторыі, — ахвяры? Ці расправы?

НЭРОН

Манарх плянэты, сьвету гаспадар,
ты распаліў бязьлітасны пажар,
загінуў твой народ-ікар,
а выжылі вароны.

Прыдбаў ты славы залаты ампір,
але закончыўся вясёлы пір,
хвалебныя замоўклі сьпевы лір,
адны праклёны.

Усё сплыло, як нейкі дзіўны сон,
яшчэ ў вушах зьвініць фанфараў звон.
Што гэта? Настальгія ці палон
старых ілюзій.

Ты свой народ і волю праматаў,
за тое ганьбу сьвету атрымаў.
Чаго ў юнацтве ты чакаў —
ня будзе.

Юрась Півуноў

***

Углядаюся ў сынавы родныя вочы,
У іх бачная цёмная загадкавасьць ночы,
І з маці ягонаю наша каханьне
Ў вачох яго бачу і водбліск сьвітаньня.

Яму, свайму сыну, прарочу я шчасьце,
Яму, Беларусу, прашу ў Бога ласкі.
Бо хто, як ня ён, пастаіць за Радзіму,
За родны наш край, за Маці-Краіну?!

Углядаюся ў сынавы родныя вочы,
У іх бачная цёмная загадкавасьць ночы,
І з маці ягонаю наша каханьне
Ў вачах ягу бачу і водбліск сьвітаньня...

Сяргей Прылуцкі

"ХТО ТЫ, БЕЛАРУСЕ?"

Калісьці меў ты гонар,
на мове сваёй размаўляў,
дзяцей й землякоў заўсёды
мужна абараняў;

калісьці цябе паважалі...
За Бацькаўшчыну ты стаяў,
калі чужынец нахабна
на зямлю тваю наступаў.

Ты бачыў, як рабавалі
саборы й касьцёлы твае,
як царскія жаўнеры
гналі людзей на сьмерць —

ты плакаў над сьвежай магілай,
магілай Краіны тваёй,
й сабраўшыся з новаю сілай
сваёй ажыўляў крывёй.

У тыя часы меў ты гонар,
мовы сваёй не губляў,
дзяцей й землякоў заўсёды
сьмела абараняў!

Калі ж з бальшавіцкіх наганаў
ляцелі кулі ў скронь,
у Сібіры калі галадалі
харчуючыся імхом,

ты дома сядзеў і моўчкі
за гэтым усім назіраў.
Ня крыкнуў ты голасна: "Годзе!",
ня вырваў з рук ката наган.

У адказ не гучалі стрэлы,
ты страшыў лучнасьць з душой.
Дзе гонар падзеўся твой й годнасьць?
Што здарылася з табой?

Дзе велічэ твая, Беларусе?
Няўжо ж спадабалась табе
па-рабску жыць пад прымусам,
служыць сатане і Маскве?

Без уласнае мовы ты мёртвы,
бяз мовы ты горш за жывёл.
Ты — цёмная пляма, ніхто ты,
пакуль не бароніш сваё!

В.Псэўдонім

САНЧА ПАНСА

Дон Кіхота збраяносец храбры!
Ты сьціскаеш свой народ за жабры.
Чуеш голас Дона ты прарочы
І глядзіш аддана яму ў вочы!
Не сумуеш ты аб тым, што кінуў
жонку ў хаце, у хляве скаціну,
ды затое — у руках улада —
гэта калі ўсеўся на ўсіх задам.
Гэта п'янкі, бабы і парады.
Гэта троны, балі, амбасады.
Гэта мальбары, кляндайкі, эльдарады.
Гэта аксэльбанты, эпалеты,
вершы, што прысьвечваюць паэты.
Гэта права стомы ад жыцьця,
гэта дзьверы ў вечнасьць зь небыцьця.
За такую супэрблагадаць
Можна й на галовы паплявацъ.
Хай буяе радаводам тваё дрэва,
губэрнатар востраva Барнэо!

Тацяна Сьнітко

***

Вось і брук. Гэты самы...
Згублюся ў завулках.
Заблукалае шчасьце
ды знойдзены шлях...

Гэй, часьцінка душы,
ты ізноў без прытулку?
Заставайся ў палоне
у львоўскіх мурах!

Мне цябе не шкада...
На Сьвятога Андрэя
будзе ўрэшце сьвятло.
І мароз. І званы.

Зноў — нібыта свая!
Але сонца — ня грэе,
а мяжа засталася
там, ля менскай сьцяны...

Гэта значыць: вяртаньне
адстукаюць колы.
Па хвілінцы — ў бязмежжа,
бязмоўе, дамоў...

І што з тых імянінаў
да Сьвятога Міколы
сонца мае ўзысці
паўдзясятка разоў!..

Ірэна Янчанка

***

Мне сьніцца сон, хоць я ня сплю,
Нібыта я знайшла зямлю,
Дзе стрэла ўсіх сваіх сяброў
З былых і будучых часоў.

Адзін адному рады мы
І што пакінулі дамы,
Дзе ўсё не разумее нас,
А тут спынiўся марны час.

Нам ёсьць аб чым пагаманіць,
А можна ціха каву піць.
Тут усё сваё, тут наш абшар,
А зоркі — рэшта нашых мар.

І раскрываецца душа,
Як кветка, Што Была Сьпярша,
Ці вецер ў вершалінах дрэў,
Ці маіх думак звонкі сьпеў.

Мне кожны дапаможа тут.
І абароніць ад пакут
Усіх нас і наш умоўны сьвет,
Стары, як неба запавет.

Ўсё раптам зьнікне ў гэты раз,
І да Пытаньня ёсьць Адказ.
Ды вось ня памятаю я,
А дзе была зямля мая?

Я толькі цень яе лаўлю...
Тады спала ці зараз сплю?
Прачнуцца трэба ці заснуць?
Каб зноў туды мне зазірнуць.
Што ж, застаецца ў плыні дзён
Чакаць, ці спраўдзіцца мой сон...

Уладзімер Лобач

Красавіцкі сьнег

Красавіцкі сьнег — прыкмета безнадзейнага, белага і чыстага каханьня.
Рытмы шалёнасьці неўзабаве зьмяняюцца на церушэньне ласкавага прабачэньня й пяшчоту...
А потым дождж. Красавіцкі сьнег — нічога ўжо не сьцьвярджае, гэта выключная сваёй сілаю эмоцыя.
Магчыма, эмоцыя адчаю.

Гэта адчуваецца брывом, на якое трапляе мокрая белая парушынка, гэта адчуваецца кожным, няхай самым дробным і нязначным нэрвам.

Назіраючы за кранальнай, пагібельнай шчырасьцю апошняга сьнегу з-за вокнаў уласнае кухні, поўніцься смуткам і да канца ня складзенымі сапэтамі. Калі раптоўная нябёсная шчырасьць мінулай зімы засыпела цябе на шпацыры, ты лёгка адмаўляесься ад паэтызацыі і прагнеш простае рацыянальнасьці цёплае кухні.
Красавіцкі сьнег — напамін пра тое, чаго табе не стае. Напамін пра згублены гонар ці пра непрыдбаную сілу.
Красавіцкі сьнег прымушае замерці на мяжы, калі ногі, нечакана для самога цябе, апынуліся абапал дэмаркацыйнай лініі спакою.

Што там далей? Цеплыня і водар яблыневай квецені? Мароз і чарговая алькагольная атака на ўласную ўтробную стомленасьць? Красавіцкі сьнег прымушае замерці ў чаканьні. Ён няўлоўны і нетрывалы, як і твае мары. Яго можна падфарбаваць крывёю, але замест прыгажосьці бел-чырвона-белага суплёту ты атрымаеш рудую брудную кашыцу.

Губляюцца сэнсы й мяняюцца колеры. Па красавіцкім сьнезе нельга ісьці наперад, пакідаючы ўласнай перакананасьці храбусьценьне чыстае замерзлае вады. Гэты сьнег — супэльны падман. Ён правакуе на гістэрычныя сьлёзы і дэбільны нэрвовы сьмех.

А ты ня сьмейся. Гістэрычна. Ты супакойся. Падумай пра тое, што сам не заўсёды бываеш чыстым. Усьміхніся. Чыста і нязмушана. Засьні і прысьні лета. Прысьні свой смаляны летнік, пабудаваны на беразе ляснога возера. Ты падыходзіш да расчыненага вакна, а вецер, цёплы вецер шпурляе табе ў твар мройлівыя беласьнежныя фіранкі. Ты пасьміхаесься, шчасьліва і ніпра што. У тваіх патрэсканым гліняных збане, які ты чамусьці выкарыстоўваеш пад кветкі, бялеюць ужо ссохлыя валошкі — твой летні напамін пра красавіцкую недарэчнасьць, бо Сонца разьлілося па ўсёй зямлі.

Славамір Адамовіч

Нататкі невыязнога

15.04. Жонка ўчастковага Толіка Дудалева ізноў смажыць мяса. Саладкавы пах трупнага запоўніў наш інтэрнацкі блёк з двух пакояў. У суседнім і жыве Толік са сваёй кабетай і дачушкай Машай. На дварэ халодна, а для Толіка гэта гарачая вясна бітваў з апазыцыяй. Нават ня можа ён толкам усьцешыцца з прычыны атрыманьня двухпакаёвай кватэры ў новым доме, пабудаваным спэцыяльна для іх, вартавых рэжыму, дакладней жа — ахоўнікаў, я сказаў бы, вертухаяў. На вуліцах сталіцы Толік растрачвае цяпер асабліва шмат энэргіі, таму і трэба яму есьці асабліва шмат мяса, і асабліва сьвініны. Ёш тваю каталажку, дык вось хто зьядае наша мяса і выпівае наш вечаровы кефір!

Сусед Толік ходзіць змрочны, гаворыць мала і так спакойна-ціха, што цяжка паверыць у рэальнасьць таго факту, што ён мент. Учора Толік прыйшоў з разьбітай скулай.

***

— Хто такія жанчыны?
— Істоты, якія ня любяць сырадою і лягавых.

***

Жанчына ўспрымае партнэра ня толькі слыхам, але й нюхам. І калі даме лепш пахнуць адмысловымі духамі, то мужчына няхай распаўсюджвае водар самога сябе, водар маскуліннасьці — адзнаку эратычнага.

17.04. Выяжджаў у рэгіён, дзе працуе пяцёрка "Браніслава". Бадай, штодня ў горадзе зьяўляюцца насьценныя графіці кшталту: "Луку — на муку!", "Масква, забірай Лукашэнку — аддавай Смаленск", і падобныя. N займаецца ценявым бізнэсам, крыху падняўся і цяпер мае за што купляць балёнчыкі зь нітрафарбай. Акупанты з надпісамі маюць праблемы: штодня трэба выпраўляць рабочых замалёўваць лёзунгі на сьценах дамоў, на платах, заводзкіх карпусах. Гэб'ё зьбілася з ног, шукаючы "мастакоў", але сьлед так і не ўзяло.

Днямі хацелі зь "Вячкам" зайсьці да хлапцоў у інтэрнат палітэхнічнай акадэміі (будынак №37 на вуліцы Сурганава). Выхавацелька, якая аказалася на вахце, не прапусьціла, бо мы мелі неасьцярожнасьць гаварыць па-беларуску, чаго было дастаткова, каб запісаць нас у бээнэфаўцы. Мы ня сталі скандаліць, але прозьвішча пільнай службісткі занатавалі для гісторыі і будучых праваахоўных органаў.

У час гэтага інцыдэнту сустрэў аднаго зь вертухаяў, якія вартавалі мяне ў "амэрыканцы" КГБ. П'яненькі, ён таксама спрабаваў прайсьці праз вахту і таксама не прайшоў. А зь якім спрытам ён некалі клацаў на маіх запясьцях кайданамі, студэнт-"завушнік" інстытуту фізкультуры і па сумяшчальніцтву — турэмны наглядчык. Тут нехаця з гора нап'есься.

Адзінота і мастурбацыя. Заўсёды разам. Пара, якая спарадзіла культурны кантэкст, філязофію, мастацтва, літаратуру, музыку і Фройда, які разгадаў таямніцу гэтай пары.

Пасьля акту зь дзедам Ананіем, як звычайна, стала паскудна на душы. Кінуў у кут сырыя майткі ды пайшоў у суседні блёк да Вялікай Жанчыны. Вялікая была незадаволеная маім зьяўленьнем. Запаліла. Тут мая гаротніца і прызналася, што я ёй перарваў акт самазадавальненьня. І стала мне з таго неяк асабліва сумна. Урэшце леглі мы разам і зрабілі, што хацелі, бо жывыя. І плыў акіян нашай лімфы, але душа заставалася не на месцы, бо не было між нас каханьня. Якія ж мы адзінокія ў гэтым сьвеце! А калі яўчэ й Бацькаўшчыну згубіць, і найменьне сваё? Як жа тады будзе сумна. Факт.

18.04. Вечар, адзін дома. Праз "ДжыБі" афарміў пуцёўку ў санаторый "Нарач". Была і другая, у Бабруйск, але тая старана мне дрэнна пахне — цыганскім байструком тхне. Яшчэ дзьве арганізацыі не змаглі дапамагчы з санаторнай пуцёўкай з-за рэпрэсіяў рэжыму. На адлачынку буду да 18-га траўня ўключна.

21 красавіка (панядзелак). Выхад у горад (паводле Бартосіка). Спаткаў у кавярні, што побач з "Кубрыкам", букініста Анатоля. Прадаў мне Лімонава за 20 тысяч — як падарыў. Вечарам — сустрэча са студэнтамі і выкладчыкамі аднаго зь Менскіх унівэрсытэтаў. Слухалі зацікаўлена, актыўна задавалі пытаньні. Мая мілая моладзь, зь якой я адчуваю сябе адэкватна, нармальна, зь якой у мяне ўзаеміны на роўных; зь якой ёсьць пра што гаварыць, бо мы разумеем адно аднаго.

22 красавіка. Каля крамы французскай парфумы, што на праспэкце Скарыны, дагнаў мяне студэнт юрфаку Максім з "Нашай Нівай" у руках, папрасіў аўтограф. Я расьпісаўся на старонцы, дзе зьмешчаны мой турэмны дзеньнік. Стаўшы юрыстам, будзь мужчынам, Макс. З гэтым здабудзеш сваю мару.

28 красавіка (панядзелак). Другі дзень праваслаўнага Вялікадня сустракаю ў санаторыі "Нарач", гатэль "Нарач", пакой 34б. Душа няма, ёсьць агульны ў падвале, уваход з вуліцы. Каляровыя "гарызонты" стаяць у вэстыбюлях 2, 3, 4-га паверхаў. Харчаваньне тры разы ў дзень плюс полудзень. Многа працэдураў: прыём мінэральнай вады ў бювэце, інгаляцыі, прамываньне кішэчніка, цеплалячэньне. Лішне казаць, што пасьля турмы хрэновенькі прафсаюзны санаторый у стадыі рамонту здаецца ледзь што ня раем зямным.

У суботу наведаў пасялковую лазьню, уваход 5 тысяч. Цепляць сасновымі дрывамі, добрая сухая пара. У парыльні між мною і, відаць, мясцовым мужчынам сярэдняга веку адбываецца дыялёг:

— Вы з "зоны"?
— ?..
— Вы, напэўна, з Гомеля?
— А-а-а... не, я з "зоны", але не з чарнобыльскай — я нядаўна вярнуўся з турмы.
— ?..

Далей прыйшлося чалавеку патлумачыць, што няма ў нас ніякай дэмакратыі, а людзей кідаюць за краты, бо яны маюць сьмеласьць выказваць супраціў рэжыму. Чалавек зьдзівіўся. А потым выказаў здагадку, што гэта, напэўна, адбываецца апошнім часам, пры Лукашэнку. І тут я ня мог зь ім не згадзіцца.

У сталоўцы пасадзілі з жанчынамі сталага веку. Адна зь іх, маладзейшая, 26-га мусіла ад'яжджаць. Нагадала мне абліччам Валю Шчэрбачку. Спытаў, ці не са Случчыны яна. Не, ці то зь Берасьця, ці то з ваколіцаў (у час санаторных сустрэчаў людзі не сьпяшаюцца раскрываць дэталі сваіх біяграфіяў). Калі ж я ўслухаўся ў ейную гутарку, то і сапраўды пачуў характэрны паляшуцкі акцэнт — прышапельваньне. І тады ўзгадаў 84-ы, інстытут сухотаў, саркаідоз Бека, Валю Раманавец з-пад Брагіна і гэткае ж мілае гаварэньне, як цурок вады зь мядзельскіх крыніц...

27-га хадзіў у суседнія санаторыі "Будаўнік" і "Прыазёрны". Народу там больш. Трапіў на танцы з нагоды Вялікадня. Выглядала мерапрыемтсва ўбога: звычайны ў такіх выпадках падліты канфэранс груба-сальна жартаваў і ладзіў "забавы", а публіка, пераважна жаночая, "внемля гласу", трэсла формамі. Ах, як яны пераліваліся ў час танцаў, гэтыя складкі тлушчу, гэтыя дупэнцыі!

З маім прыездам, як кажуць суседкі па стале, зьявілася сонца і перастаў дождж.

Амэрыканскі бэстсэлер

Дэн Кларк

БЫЦЬ ТАКІМ БРАТАМ

Адзін мой знаёмы, Пол, на Каляды атрымаў у падарунак ад свайго брата аўтамабіль. Напярэдадні сьвята, калі Пол выходзіў са свайго офіса, нейкі хлапчук хадзіў вакол новай машыны, у захапленьні разглядваючы яе. "Гэта Ваша машына, містэр?" — спытаўся ён.

Пол кіўнуў. "Мой брат падарыў мне яе на Каляды". Хлапчук вельмі зьдзівіўся: "Вы маеце на ўвазе, што Ваш брат даў Вам яе, і яна не каштавала Вам ні цэнта? О, хацеў бы я..."

Зразумела, Пол ведаў, чаго хацеў хлапец. Ён хацеў, каб і ў яго быў такі брат. Але тое, што ён сказаў, незвычайна ўзрушыла Пола.

"Я б хацеў, — сказаў новы знаёмы, — каб я сам мог быць такім братам".

Пол зьдзіўлена паглядзеў на яго, потым спытаў: "Ты б хацеў пракаціцца на маім аўтамабілі?"

"О, вядома, з ахвотай".

Пасьля нядоўгай паездкі, хлапчук павярнуў да Пола свой прасьветлены погляд і сказаў: "Містэр, а Вы не маглі б давесьці мяне да майго дому?"

Пол зьлёгку ўсьміхнуўся. Ён падумаў, што ведае, чаго хацеў цяпер гэты юнак. Ён хацеў паказаць сваім суседзям, што раз-пораз можа вяртацца дадому ў такім вялікім аўтамабілі. Але Пол ізноў памыліўся. "Спыніцеся, калі ласка, каля тых дзьвюх прыступак", — папрасіў хлапчук.

Ён забег у дом. Неўзабаве Пол пачуў, як ён вяртаецца, але нясьпешна. Хлапец нёс свайго малодшага хворага брата, які ня мог хадзіць. Ён пасадзіў яго на першую прыступку, абняў і сказаў, паказваючы на машыну: "Вось яна, Бадзі, як я табе і расказваў наверсе. Ягоны брат падарыў яе яму на Каляды, і яна не каштавала яму ні цэнта. Прыйдзе дзень, калі я таксама падару табе такую. Тады ты сам зможаш убачыць усе тыя прыгожыя калядныя рэчы, пра якія я распавядаў табе".

Пол выйшаў з машыны, падняў малога і пасадзіў яго на пярэдняе сядзеньне. Стары брат уладкаваўся побач, вочы ягоныя зьзялі, і вось яны ўтраіх адправіліся ў незабыўную сьвяточную паездку.

Менавіта напярэдадні тых Калядаў Пол зразумеў, што меў на ўвазе Ісус Хрыстос, калі казаў, што больш бласлаўлёна — аддаваць.

Бэнэт Сэрф

ПАДАРУНАК

Па пыльным гасьцінцы, уздоўж гарадзкой ускраіны схаў аўтобус. Сярод пасажыраў быў хударлявы пажылы мужчына, які трымаў вялікі букет сьвежых кветак. З другога боку праходу сядзела маладая дзяўчына, і ейны позірк спыніўся на гэтых кветках. Пажылому мужчыну настаў час выходзіць. Ён устаў і, падышоўшы да дзяўчыны, паклаў букет ёй на калені. "Я бачу, Вы вельмі любіце кветкі, — патлумачыў ён, — і я думаю, што мая жонка хацела б, каб Вы іх узялі. Я скажу ёй, што аддаў іх Вам". Дзяўчына ўзяла кветкі, затым прасачыла позіркам за мужчынам, як ён сыйшоў з аўтобуса і адчыніў весьніцы, што вялі на маленькія могілкі.

Хэнак Маккарці

УСЬМЕШКА

Усьміхайцеся адзін аднаму, усьміхайцеся вашай жонцы,
Усьміхайцеся вашаму мужу, усьміхайцеся вашым дзецям,
Усьміхайцеся адзін аднаму — ня мае розьніцы, каму — і гэта
дапаможа вам узрастаць у любові да тых, хто навокал.

Маці Тэрэза

Шмат хто знаёмы з выдатнай кнігай Антуана дэ Сэнт-Экзюпэры "Маленькі прынц". Гэты фантастычны твор звычайна называюць дзіцячай казкай, некаторыя бачаць у ім прыпавесьць для дарослых. Нашмат менш хто ведае іншыя творы гэтага пісьменьніка, ягоныя раманы ды апавяданьні.

Сэнт-Экзюпэры быў французам, лётчыкам-зьнішчальнікам, які змагаўся з нацыстамі і загінуў у баі. Перад ІІ сусьветнай вайной ён ваяваў у Гішпаніі супраць фашыстаў. Ён напісаў там чароўнае апавяданьне, асновай якога быў ягоны ўласны досьвед. Менавіта пра гэты твор я і хачу з вамі пагаварыць.

Аўтар піша, што ён быў арыштаваны ворагамі і кінуты ў турэмную камэру. Пагардлівыя позіркі ды грубае абыходжаньне турэмшчыкаў упэўнілі яго ў тым,

што ён будзе пакараны на наступны дзень. З гэтага месца я буду распавядаць уласнымі словамі тое, што запомнілася больш за ўсё іншае.

"Я быў упэўнены, што мяне расстраляюць. Мяне ахапіла жудасная нэрвовасьць, і я адчуў, што пачынаю губляць розум. Каб супакоіцца, я дастаў з кішэні цыгарэту, але ў мяне не было запалак. Я зірнуў праз краты на вартаўніка. Ён гляджу кудысьці ў іншы бок, і я паклікаў яго: "У цябе ня будзе запалак, аміга?" Ён паглядзеў на мяне, сьцепануў плячыма і падышоў, каб запаліць маю цыгарэту.

Калі ён падышоў да мяне і дастаў запалкі, нашыя вочы сустрэліся. У гэты момант я ўсьміхнуўся. Я ня ведаў, чаму я гэта зрабіў. Можа, з-за нэрвовасьці, можа, з-за таго, што проста цяжка не ўсьміхнуцца чалавеку, калі ягоны твар так блізка ад твайго. Як бы там ні было, я ўсьміхнуўся. І ў гэтае імгненьне як быццам іскра праскочыла паміж нашымі сэрцамі, нашымі чалавечымі душамі. Я ведаю, што ён гэтага не жадаў, але мая ўсьмешка як быццам пранікла скрозь краты і выклікала ўсьмешку на ягоных вуснах. Ён запаліў маю цыгарэту, але не адыйшоў, а працягваў глядзець мне проста ў вочы і ўсьміхацца.

Я таксама ўсьміхаўся яму і глядзеў на яго цяпер ня як на проста турэмшчыка, але як на чалавека. Ягоны позірк таксама зьмяніўся. "У цябе ёсьць дзеці?" — спытаўся ён. "Так, зараз, зараз", — я дастаў сваё партманэ і пачаў нэрвова шукаць фатаграфіі маёй сям'і. І ён паказаў мне карткі сваіх "карапузаў" ды пачаў распавядаць пра тое, якія надзеі і спадзяваньні ён зьвязвае зь імі. Мае вочы напоўніліся сьлязамі. Я сказаў, што мне, мабыць, ужо ніколі ня ўбачыць сваіх родных, ня ўбачыць, як растуць маі дзеці. На ягоных вачах таксама зьявіліся сьлёзы.

Нечакана, не гаворачы ні слова, ён адчыніў маю камэру і моўчкі вывеў мяне адтуль. Потым з турмы, потым — бясьпечным шляхам — з гораду. Тамака ён адпусьціў мяне і, павярнуўшыся, пайшоў назад. Усьмешка выратавала маё жыцьцё".

Так, менавіта ўсьмешка — рантоўнае, незаплянаванае, натуральнае яднаньне людзей. Я размаўляў пра гэтую гісторыю на працы і бачыў, як людзі пачынаюць разумець, што пад усімі гэтымі абалонкамі, якія мы набудавалі дзеля бясьпекі, хаваецца сапраўдная непаўторная істасьць — я не баюся назваць яе душою. Я веру, што калі частка цябе і мяне пазнаюць адна адну, мы ніколі ня будзем ворагамі. Мы ня будзем адчуваць нянавісьці, зайздрасьці, страху адзін да аднаго.

У маім жыцьці было некалькі падобных момантаў: пачуцьцё закаханасьці, позірк дзіцяці... І чаму мы заўсёды ўсьміхаемся,

Працяг на старонцы 14

Купа. Амаль усе вяскоўцы перасяліліся ў чатырохпавярховыя цагляныя дамы. Засталося некалькі хатаў, ды й тыя дабываюць свой век. Але стаяць і распускаюцца штовесну вялізныя таполі. Колькі гадоў маюць — дзьвесьце, трыста? Імі абсаджана галоўная вуліца старажытнай нарачанскай вёскі.

Зайшоў у пасялковую бібліятэку, у абмен на пашпарт атрымаў чацьверты том са збору твораў Максіма Танка за 67-ы год. Перачытваю ягоныя "Лісткі календара". Актуальна, на жаль. Дарэчы, на вокладцы напісана "Лісткі з календара". Як жа было ў арыгінале? Зрэшты, важна ўсё ж тое, што ў саміх лістках. Важна, павучальна і актуальна. Лічу патрэбным зрабіць тут некалькі ладных цытацыяў, а заадно заклікаю моладзь прачытаць разам з творамі Краткевіча, Ларысы Геніюш, Багдановіча, Гаруна і "Лісткі календара" Максіма Танка.

У лістку за сёмага студзеня 1935 году знаходзім: "Уважна прачытаў адозву Лігі абароны правоў чалавека і грамадзяніна, у якой сказана пра Картускую Бярозу, што гэта — лягер, яшчэ горшы за царскую катаргу. У перадднавагоднім нумары "Работніка" (23.XII.34 г.) надрукаванае патрабаваньне ліквідацыі Бярозы і прыцягненьня да адказнасьці віноўных у злачынствах супраць арыштаваных. Гэта — першая прабоіна ў сьцяне маўчаньня, што была ўзьнята вакол засьценкаў канцлягера.

Да поўначы засталося 15 хвілінаў. Цікава, колькі гадзінаў, начэй і дзён, колькі яшчэ гадоў — да сапраўднага сьвітаньня?"

Задаю сабе гэтае пытаньне і я, але ўжо вясною 1997 году. Як вядома, Яўген Іванавіч Скурко да сапраўднага сьвітаньня, пражыўшы вунь як многа, так і не дацягнуў. А мы, лясьні мяне пярун, ці мы таксама хочам не дажыць!? Ці мы ўсё ж будзем дзейнічаць?..

Запіс у лістку календара за 15 лютага 1935 году: "А то і на маёй Мядзельшчыне — побач з заявамі, у якіх сяляне патрабуюць адкрыцьця беларускіх школ, — мясцовыя ўлады зьбіраюць подпісы людзей, якія, наадварот, выказваюць пажаданьне, каб іх дзеці вучыліся ў польскіх школах, бо "куды яны пададуцца ў людзі са сваёй мужыцкай мовай?" Праўда, гэтыя заявы часьцей за ўсё пішуцца не па сваёй волі, а пад націскам асаднікаў, солтысаў, паліцыі, ксяндзоў і некаторых настаўнікаў, што прыехалі з цэнтральнай Польшчы і пераканаыя, што гэтым робяць паслугу сваёй дзяржаве і свайму народу".

9 траўня 1935 году Максім Танк запісвае: "У нас літаратуры прыдаецца велізарнейшае значэньне, якога яна ў іншых народаў даўно ня мае. Не знаходзячы ў сёньняшнім жыцьці справядлівасьці, народ шукае ў літаратуры адказу на ўсе пытаньні, якія яго хвалююць і непакояць. У нас няма розьніцы паміж літаратурай і адозвай, літаратурай і забостоўкай, літаратурай і дэманстрацыяй, таму амаль ва ўсіх палітычных працэсах разам з барацьбітамі за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне на лаве падсудных знаходзілася і наша заходнебеларуская літаратура".

У Танкавых "Лістках календара" знаходжу добра знаёмыя назвы вёсак, урочышчаў, мястэчак: Задубеньне (вёска, у якой працаваў нейкі час мой бацька, а потым і я спрабаваў — культработнікам у падсавецкія часы), Крывічы (мястэчка з касьцёлам і царквой, якое цяпер інтэнсіўна разбудоўваецца), Няверaўскае (балота і ўрочышча), Сваткі (вёска, былы цэнтар гліны, а цяпер сельсавету), Буда (старое наша мястэчка). Дарэчы, пра Буду. Ёсьць яшчэ некалькі варыянтаў гэтае назвы: Будслаў (афіцыйная), Будслава (Буцлава), Будслаўе (Буслаўе). Старыя кажуць, што назва Буда пайшла ад будана (буды), які паставілі манахі-бэрнардыны на месцы, дзе, згодна зь легендай, зьявілася людзям Маці Боская. З часам побач з буданом пачалі сяліцца людзі, а манахі ўзьвялі касьцёл, які і сёньня стаіць над ракой Сэрвач. Храм мае два аўтары: стары, з уваходам ад ракі, і новы, з уваходам з боку мястэчка. Як і шэсьцьдзесят гадоў назад пры паляках, а так і цяпер што год 2 ліпеня ў Будзе адбываецца грандыёзны фэст, своеасаблівая фіеста на беларускі лад, калі можна пабачыць самую далёкую сваю радню, школьных сяброў, спаткаць былое каханьне з вывадкам дзяцей, сівога завуча школы, аднавяскоўцаў, людзей цьвярозых і п'яных, цнатлівых і гуляшчых...

Хутка май: каню сена дай, а сам на печ уцякай. У сасновым бары — сінія першацьветы і бульбяныя ямы, зь якіх купаўцы дастаюць бульбу-насевак. У нос шыбае добра знаёмы зямляны дух: пахне цьвілай саломай, мышамі і бульбай.

Пазнаёміўся з дваццацідвухгадовай Ірынай са Швакштаў, якая вучылася разам з маёй сястрой Натальляй у Камарове, дзе на месцы панскай сядзібы разьмешчанае Сьвірскае СПТВ-207. Дваццаць гадоў таму і я ў ім вучыўся — на трактарыста, электрыка і дояра. Гады вучобы ў хабзе — самыя брутальныя.

29 красавіка (аўторак). Пачаў пісаць верш, думаю, атрымаецца.

Каб ня ножкі жаночыя, дзе б я цяпер быў? Усё зь іх пачынаецца й вядзецца. Цікава, якія вонкавыя бачныя элемэнты мужчынскага ўзбуджаюць жанчыну, разварушваюць інтарэс? Шырокія плечы? Доўгі гарбаты нос? Біцэпсы? Скураное партманэ, поўнае даляраў?.. Ірына Швакшцянка (мянушка Плешка) кажа, што выглядае мужчыну па прычосцы, па тым, ці ахайна і з густам апрануты. Па Ірынінай лытачцы ручайком бягуць чорныя валосікі. Форму ручайка падкрэсьліваюць панчохі.

Радасьць сузіраньня чагосьці, што напаўняе цябе энэргіяй, сілай.

"Апошнія крокі адміністрацыі не пакідаюць ніякай надзеі на тое, што ў нашыя часы можна будзе нешта выдаць вартае ўвагі". Гэта таксама зь "Ліскоў календара" Танка — за 37-ы год.

Сёньня раніцай у сталоўцы бадзяжны кот сьцягнуў з накрытага стала рыбу. З гэтай нагоды прыйшлося схадзіць да галоўнага лекара. Стары корч з абвіслай на вярсту ніжняй губой запаліў цыгарэту зь фільтрам і тут жа па тэлефоне выклікаў дыет-лекара. Ужо ў абед у вэстыбюлі сядзела... Ірына і пільнавала, каб у дзьверы разам з наведнікамі не прабіраліся каты й сабакі. Ірына злуецца на мяне і дапытваецца, чаму я іх, сталоўскіх, "залажыў" галоўнаму лекару. Яна ня хоча зразумець, што я катэгарычна супраць таго, каб даядаць пасьля катоў.

У нашэсьці хвастатых вінаватыя й самі курортнікі. Бабулькі асабліва шчыруюць на ніве гуманізму, любові да братоў нашых меншых (бадай, як расейцы любяць нас, беларусаў, але "но странною любовью"). Костачкамі, скарыначкамі жанчыны прывабілі да сталоўкі ўсіх купаўскіх коцікаў і цюцек. І тут паўстае дылема: альбо гуманізм, альбо гігіена. Што выбірае наш чалавек? У зьвязку з гэтым успамінаю мімалётны расповед бацькі пра тое, як у час польскай акупацыі Заходняй Беларусі паліцыянты штрафавалі мужыкоў, што ня мелі на сваіх сядзібах прыбіральняў.

Думаецца, культура вымагае нашмат большае працы мозгу й душы, чымся цывілізацыя. Носьбітамі высокай культуры ніколі ня будуць масы, але карыстацца насоўкай і не карміцца разам з жывёламі павінны вучыцца ўсе, бо гігіена кожнага — перадумова здаровасьці ўсіх. Сёньня колішні савецкі лёзунг "мойте руки перед едой" застаецца актуальным. І будзе такім, пакуль нацыя застаецца ў арбіце Масквы.

30 красавіка (серада). Сёньня прыгожая жанчына з грудцамі стаўбурком узяла мяне ў попу. Ну-ну-ну, ня трэба рабіць пасьпешлівыя высновы, дарагі чытач. Проста прыгожая жанчына, спраўджваючы клятву Гіпакрата, і пры поўнай згодзе з майго боку зрабіла мне прыемна — прамыла кішэчнік мінэральнай вадзіцай, папярэдне змазаўшы мой гемаройны анусік вазэлінавым алеем. Клізма праходзіла дрэнна, ды я мусіў цярпець. Я прыняў бы ад рук гэтай мілай жанчыны і не такія пакуты. Якая цудоўная рэч — жыцьцё! І калі табе дадзена

Працяг на старонцы 14

Амэрыканскі бэстсэлер

Працяг са старонкі 13

калі глядзім на дзіця? Мабыць, таму што мы бачым чалавека без абарончых абалонак, чалавека, чыя ўсьмешка заўсёды натуральная і бясхітрасная. Тады і нашая чыстая дзіцячая душа ўсьміхаецца ў адказ.

Джо Эн Ларсэн

ГІСТОРЫЯ ДА ДНЯ ЗАКАХАНЫХ

Лэры і Джо Эн былі звычайнай парай. Яны жылі ў звычайным доме на звычайнай вуліцы. Як і ўсе іншыя звычайныя пары, яны змагаліся, каб зводзіць канцы з канцамі ды рабіць нешта добрае сваім дзецям. Яны былі звычайнымі і яшчэ ў адным — у іх здараліся сваркі. Шмат якія іхныя размовы былі прысвечаныя таму, што замінае ў іхным сямейным жыцці і хто ў гэтым вінаваты.

Да таго дня, як аднойчы здарылася неверагодная рэч.

"Ты ведаеш, Джо Эн, у мяне ёсьць чароўная камода. Кожны раз, калі я яе адчыняю, тамака паўнютка шкарпэтак ды бялізны, — сказаў Лэры. — Я хачу падзякаваць табе за тое, што ты рабіла яе такою ўсе гэтыя гады".

Джо Эн паглядзела на свайго мужа паверх акуляраў. "Чаго ты хочаш, Лэры?"

"Нічога. Я хачу, каб ты ведала, што я ў захапленьні ад гэтай чароўнай камоды".

Гэта быў ня першы раз, калі Лэры рабіў нешта непаразумелае, і таму Джо Эн хутка забылася на гэтую размову. На некалькі дзён. "Джо Эн, дзякуй табе за тое, што ты кожны дзень робіш такія дакладныя запісы нашых даходаў і расходаў".

Не давяраючы сваім вушам, Джо Эн падняла вочы на мужа: "Лэры, ты заўсёды скардзіўся, што я не магу рабіць гэтыя запісы дакладна. Што здарылася?"

"Нічога. Я толькі хачу, каб ты ведала, што я захапляюся тваімі намаганьнямі".

Джо Эн пакачала галавой і зноў нахілілася да сваёй працы. "Што на яго найшло?" — падумала яна. Як бы там ні было, на наступны дзень, калі Джо Эн перапісвала ў кнігу лічбы з прадуктовага чэка пасьля пакупак, яна яшчэ раз зазірнула ў чэкавую кніжку, каб пераканацца, што ўсё зроблена дакладна. "І чаму я раптам пачала клапаціцца пра гэтыя дурацкія лічбы?" — спытала яна ў сябе. Яна спрабавала зноў забыцца пра гэты выпадак, але дзіўныя паводзіны Лэры нават узмацніліся.

"Джо Эн, гэта была выдатная вячэра", — сказаў ён аднойчы ўвечары. — "Я цаню ўсе твае намаганьні. Слухай, іду ў заклад, што за мінулыя 15 гадоў ты прыгатавала больш за 14000 сьняданкаў, абедаў і вячэраў для мяне і дзяцей". А пасьля: "Божухна, Джо Эн, наш дом выглядае проста цудоўна! Ты сапраўды добра папрацавала, каб ён так выглядаў". І нават: "Дзякуй табе, Джо Эн, за тое, што ты такая. Мне падабаецца быць з табой".

Джон Эн пачала хвалявацца: "Куды падзеўся ягоны сарказм, ягоная крытыка?" Ейны страх падмацавалі словы шаснаццацігадовай Шэлі: "Наш татка з глузду зьехаў. Ён толькі што сказаў мне, што я прыгожа выглядаю. На мне былі гэтыя неахайныя шмоткі, гэтая касмэтыка, але ён усё адно так сказаў. Гэта ня наш татка. Што зь ім, мама?"

Але ніхто ня ведаў, што зь ім здарылася, а ён усё не выходзіў з гэтага стану. Зноў ды зноў Лэры працягваў зьвяртаць увагу толькі на станоўчыя рэчы. Празь некалькі тыдняў Джо Эн трохі прызвычаілася да ягоных дзіўных паводзінаў і зрэдку нават казала "Дзякуй" у адказ. Яна ганарылася, што ёй удаецца кантраляваць становішча нават цяпер, пакуль аднойчы здарылася нешта настолькі незвычайнае, што яна нават аслупянела:

"Я хачу, каб ты адпачыла, — сказаў Лэры. — Я сам памыю посуд. А зараз аддай мне гэтую патэльню і ідзі з кухні".

(Доўгая-доўгая паўза.) "Дзякуй, Лэры. Вялікі дзякуй!"

З таго моманту паходка Джо Эн зрабілася больш лёгкай. Яна пачала адчуваць нейкую годнасьць, нават зрэдку нешта сама сабе ціхенька напяваць. У яе зараз не было нагоды смуткаваць. "А мне вельмі падабаюцца новыя паводзіны Лэры", — думала яна.

Тутака можна было б і скончыць гэтую гісторыю, калі б аднойчы ня здарылася яшчэ больш незвычайная падзея. На гэты раз гаварыла Джо Эн: "Лэры, — сказала яна, — я хачу падзякаваць табе за тое, што ты хадзіў працаваць усе гэтыя гады, каб забясьпечваць нас усім неабходным. Здаецца, я яшчэ не казала табе, як я цябе за гэта паважаю".

Лэры так і не прызнаўся, чаму ён аднойчы так крута зьмяніў свае паводзіны, і гэта засталося адной зь ягоных жыцьцёвых таямніц. Але я ўсё адно ўдзячная яму за гэта.

Вы ўжо зразумелі, што Джо Эн — гэта я.

Джэк Кэнфілд

ЗАЛАТЫ БУДА

Увосені 1988 году мы з жонкай Джорджыяй былі запрошаныя на канфэрэнцыю ў Ганконг. Мы ніколі дагэтуль не былі на Далёкім Усходзе, і таму вырашылі працягнуць нашае падарожжа і наведаць суседні Тайлянд.

Калі мы прыехалі ў Банкок, дык дамовіліся паглядзець тамака ўсе найбольш знакамітыя будысцкія храмы. Тым днём, разам з нашым кіроўцам і перакладчыкам, мы наведалі шматлікія прыгожыя будынкі, але празь некаторы час усе яны пачалі зьліцца ў нашых думках у адзіны цьмяны безабрысны вобраз. Быў, аднак, адзін храм, які пакінуў выразны адбітак у нашых душах і сэрцах. Ён называўся Храм Залатога Буды. Сам храм быў вельмі малым, і калі мы ў яго ўвайшлі, то былі вельмі ўражаныя прысутнасьцю чатырохмэтровай статуі Буды, адлітай з чыстага золата. Яна важыла болей за дзьве з паловай тоны і каштавала прыблізна 196 мільёнаў даляраў.

Пасьля таго, як мы скончылі звычайныя для турыстаў рытуалы (пахадзілі вакол статуі, паахалі ды павохалі ў перапынках паміж наводкай нашых фотаапаратаў), я падыйшоў да шклянога начыньня, якое стаяла побач, і дзе зьмяшчаўся кавалак шэрай грубай гліны і лісток з машынапісным тэкстам пра гісторыю гэтага цуду.

У 1957 годзе манахі з суседняга кляштару павінны былі перавезьці гліняную статую Буды зь іхняга храма на новае месца. Манастыр пераводзілі, каб пабудаваць хуткую аўтастраду праз Бангкок. Калі кран пачаў падымаць вялікую фігуру, сяная вага аказалася такой вялікай, што ідал пачаў трэскацца. Да таго ж, пачаўся дождж. Галоўны манах, які адказваў за перавозку сьвятой статуі, вырашыў апусьціць яе зноў на зямлю і накрыць, каб засьцерагчы гліну ад вільгаці.

Пазьней, тым самым вечарам, галоўны манах пайшоў праверыць стан Буды. Ён уключыў свой ліхтарык і пасьвяціў пад покрывам на статую, каб упэўніцца, што яна ня змокла. Калі праменьчык сьвятла натрапіў на трэшчыну, тамака нешта заблішчэла. Гэта здалося манаху дзіўным і ён вырашыў паглядзець, ці не было пад глінай нешта схаваным. Ён прынёс малаток і долата і стаў адбіваць кавалкі гліны. Пасьля таго, як гліна пачала адвальвацца, бляск стаў мацнейшым. Шмат часу прайшло да таго моманту, як манах апынуўся сам-насам зь незвычайным залатым Будам.

Богам, ты нават і ў клізьме ўбачыш не брутальнае, а прыгожае.

"Усё, што засталося ад польскай акупацыі на ўзроўні слова — гэта некалькі фразаў, якія ў ваколіцах Нарачы ўжываюць дзеля падтрыманьня размовы ў "культурным" рэчышчы. Адна зь іх — "цуд пенкносьці". І жыве яна ў роднай мове нарачанцаў сіратой-папялушкай, якую час ад часу запрашаюць да стала павесяліць гаспадароў.

"Сьвядомасьць у стане інфляцыі заўсёды эгацэнтрычная і не ўсьведамляе нічога, акрамя ўласнага існаваньня. Яна няздольная вучыцца ў мінуўшчыны, ня здольная разумець падзеі, якія адбываюцца цяпер і рабіць правільныя высновы адносна будучыні. Яна загіпнатызаваная самой сабою, і таму зь ёй нельга паспрачацца. Яна непазьбежна выракае сябе на сьмяротныя катастрофы. Даволі парадаксальна, але інфляцыя — гэта рэгрэсія сьвядомасьці ў бок несьвядомага". Актуальныя думкі Карла Густава Юнга. Адрасую іх Антановічу, Шэйману, Мацкевічу ды іншым з рэжымнікаў, якія думаюць, што ўжо ўхапілі Бога за бараду. Мяркую, гэта не барада Ўсявышняга, а хвост д'ябла, які валачэ іх у апраметную.

Узяў з сабой на адпачынак кніжкі: "У пошуках фаласа" Джэймса Уайлі, "Кремлевские жены" Ларысы Васільевай, "Троцкі ў выгнаньні" Ісака Дойгара, "Эрас і цывілізацыя" Гербэрта Маркузэ, "Псыхалёгія масаў і "Фашызм" Вільгельма Райха.

У мясцовы газэтны кіёск паступаюць "Белорусская деловая газета", "Белорусская газета", "Свабода", "Народная воля", "Здравый смысл", расейскія выданьні. У сёньняшняй "СБ" — кракадзілавы сьлёзы нейкага Аўруціна. Скардзіцца рэжыму, што ім, расейскамоўным графаманам, "попросту некуда предложить свои произведения". Ну што ж, "господа", больш нахабнасьці, настырнасьці ў патрабаваньнях. Ня можа быць, каб "ацец" не дапамог. Хоць можа і не пасьпець — работа ў яго неспакойная.

Нататкі невыязнога

Працяг са старонкі 13

У гэтым жа нумары "Советской Белоруссии" зьмешчаная нататка "Славный" возвращается из небытия" — пра савецкі разьведвальна-дывэрсійны атрад, які дзейнічаў на Клічаўшчыне ў часы II сусьветнай вайны. Газэта піша: "Этот отряд появился в Белоруссии в 1942 году, перейдя линию фронта. Его основу составляли кадровые бойцы и офицеры. Выполнял отряд специфические функции: разведка в интересах фронта, борьба с предателями и лжепартизанами". Як беларус, расшыфроўваю апошні выраз наступным чынам: "Славный" і дзясяткі, калі ня сотні, іншых падобных атрадаў зьнішчалі на нашай зямлі беларускія органы самаховы і самаўлады, перашкаджалі стварэньню атрадаў беларускай нацыянальнай партызанкі, непадкантрольнай Маскве, правакавалі немцаў на зьнішчэньне нашых вёсак і мястэчак. Атрад "Славный" складалі прафэсійныя дывэрсанты-правакатары, паводле нацыянальнасьці пераважна расейцы. Вось іхныя "установленные" прозьвішчы: Качанаў, Шарстоў, Шынкароў, Каштанаў, Суханаў, Мурашкін, Данілачкін, Сьмірноў, Плахаў, Ажогаў. Сярод іх толькі два беларускія прозьвішчы — Пархімовіч і Кібіцкі, відаць, звычайныя праваднікі на чужой тэрыторыі. У "СБ" нават прапануюць тэлефон №229-14-04. Маўляў, тэлефануйце, "из Минска будет организована доставка желающих принять участие в... мероприятии (5 траўня на месцы стаянкі "Славного" яны плянуюць адкрыць партызанскі мэмарыял). І гэта ў той час, калі ў Беларусі руйнуюцца хрысьціянскія крыжы памяці ў Курапатах, Паставах, Семежаве, у іншых месцах па ўсёй Краіне, зьнішчаюцца габрэйскія могілкі й помнікі...

Сёньня ж, 30-га, па дарозе ў сталоўку сустрэў чалавека, які прадаваў дзіцячыя кніжкі на беларускай і расейскай мовах. Ім аказаўся Аляксандар Паскробышаў, чалавек суровага лёсу. Ён сьляпы, паводле нацыянальнасьці расеец, піша для дзяцей, кніжкі выдае ў Маскве. Думаю напісаць пра яго асобны артыкул. Як адказ на "галашэньні" А.Аўруціна, "русскоговорящего".

1 траўня (чацьвер). Хмарны дзень салідарнасьці, халодны. Туманна. Учора быў дождж з навальніцай. І было цёпла. Сёньня заходзіў да Паскробышава. Аднапакаёвая кватэрка, дзе стол, на ім друкавальная машынка (звычайная), абапал стала два вялікія мяккія крэслы, канапа, люстэрка, шафа з кнігамі. Жытло невідушчага зрокам, але чуйнага душой чалавека. Некалі, калі мне, ледзь я пераступіў парог, прапанавалі зрабіць масаж, я засумняваўся ў правільнасьці сваіх дзеяньняў. Але, як чалавек, схільны да рызыкі і нетрывіяльных паводзінаў, я распрануўся да поясу і атрымаў даволі адчувальны масаж сьпіны. Мой нечаканы лекар паведаміў, што ў мяне не зусім добра з сэрцам, а таксама бранхіт. Нібыта ён папярэдне прачытаў эпікрыз, які мне далі пасьля курсу аднаўленчай тэрапіі ў N-скай сталічнай клініцы.

30-га заехала ў санаторый мая васямнаццацігадовая муза Вікторыя з в. Лунін Лунінецкага раёну. Бог паслаў мне яе.

2 траўня (пятніца). Максім Танк. Зь "Ліскоў календара" за 1938 год. "21/XII. Калі б ня кнігі, можна было б звар'яцець. І ў няволі яны мяне ратавалі, і зараз, на свабодзе, якая мала чым адрозьніваецца ад няволі (...) 22/XII. Выклікалі да сьледчага, як западозранага ў аўтарстве вершаў, надрукаваных у нейкай падпольнай лістоўцы. Сьледчы намагаўся давесьці, што вершы — мае, бо некаторыя радкі пераклікаліся з маімі канфіскаванымі вершамі са зборніка "На этапах".

Пасьля працэдураў блукалі зь Вікторыяй па лесе, наведалі дом адпачынку "Нарач" і санаторый "Белая Русь". Апошні належыць Міністэрству ўнутраных справаў. Мясцовы дасьціпны люд ахрысьціў яго санаторыем мэндэвэшнікаў. Установа дагледжаная, раскошная нават, з элемэнтамі мармуру і наяўнасьцю туалетнай паперы ў прыбіральнях. Па тым, як выглядае санаторый МУС і наша прафсаюзная лячэбніца, можа меркаваць, у кім улада мае першачарговую патрэбу і кім яна апякуецца. Відавочна, што на першым месцы — "органы" рэжыму. Як той казаў, "всё лучшее — органам и их детям". Можна сказаць, што наш рэжым — палавы гігант, бо колькасьць ягоных "органаў" перавышае колькасны склад кадравай арміі. Гэткія сабе семеньнікі ўлады — 130 ці 150 тысячаў. І ці не таму згвалтаваньні ў райаддзелах міліцыі становяцца будзённай зьявай. Яскравы прыклад — справа Аляксандра Маціеўскага, зь якім я сядзеў у 9-й камэры "амэрыканкі". Былы спэцназавец, які прайшоў баявую школу ў Закаўказьзі, служыў опэрупаўнаважаным сталічнай міліцыі. За згвалтаваньне дзьвюх затрыманых жанчын у райаддзеле быў асуджаны да 5 гадоў зьняволеньня, аднак ня быў зьмешчаны пад варту. Арыштавалі яго толькі пасьля забойства банкіра Валадзько, інкрымінуючы Аляксандру ўдзел і ў гэтым злачынстве. Дарэчы, з Валадзько мела цікавыя

Навукоўцы-гісторыкі вырашылі, што калі за некалькі соцень гадоў да гэтай падзеі Бірманскія войскі пачалі заваёўваць Тайлянд (які тады называўся Сыям), манахі, каб захаваць сьвятыню на сваёй зямлі, вырашылі абляпіць статую звонку глінай. Так здарылася, што бірманцы забілі ўсіх тых манахаў, якія ведалі сакрэт залатога Буды, і ён заставаўся неадкрытым да таго памятнага моманту ў 1957 годзе.

Калі мы ляцелі дадому, я падумаў: Усе мы такія самыя, як гэты гліняны Буда, пакрытыя грубай коркай страху і недавер, аднак дзесьці ў нашай глыбіні ёсьць свой "залаты Буда", "залаты Хрыстос" ці проста "залатая сутнасьць", што якраз і ёсьць нашай сапраўднай натурай. Недзе з двух-трохгадовага веку мы пачынаем "замазваць" гэтую сутнасьць нечым іншым. І вось цяпер, як той манах з малатком і долатам, мы павінны зноў знайсьці і ачысьціць нашую боскую сутнасьць.

Джэк Кэнфілд & Марк Хансэн

ПА АДНОЙ

Аднойчы адзін наш сябра шпацыраваў на закаце сонца па мэксыканскім пляжы. Неўзабаве ў далечыні ён заўважыў яшчэ аднаго чалавека. Калі ён падышоў бліжэй, то ўбачыў, што гэта адзін з тутэйшых жыхароў, які ўвесь час нахіляўся да пяску, нешта падымаў, кідаў у ваду і зноў рабіў гэтыя нескладаныя рухі.

Калі наш сябра падышоў бліжэй, ён убачыў, што чалавек зьбіраў марскія зоркі, якія апынуліся на беразе, і, адну за адной, кідаў іх назад у акіян. Наш сябра быў моцна зьдзіўлены. Ён падыйшоў да таго мужчыны і сказаў: "Добры вечар, дружа. Цікава, што ты тут робіш?"

"Я кідаю марскіх зорак назад у ваду. Разумееш, цяпер вельмі нізкі адліў, і хвалі выкінулі ўсіх гэтых марскіх зорак на пляж. Калі я не закіну іх назад у мора, яны тутака загінуць".

"Так, я разумею, — адказаў сябра, — але на гэтым пляжы ляжаць тысячы такіх зорак. Ты ня зможаш сабраць усіх, іх проста занадта шмат. І хіба ты не разумеш, што такое здараецца на сотнях пляжаў на гэтым узьбярэжжы? Мабыць, няма ніякай розьніцы, ці робіш ты гэта, ці не?"

Мясцовы жыхар усьміхнуўся, нахіліўся па чарговую марскую зорку, кінуў яе ў ваду і адказаў: "Для гэтай зоркі ёсьць розьніца".

Пераклаў з анг. Валянцін Дрозд

Занатоўкі эгаіста

Адам Глёбус

СУАЙЧЫНЬНІКІ

СЫС
Алькаголь цячэ ў вершах Анатоля Сыса.

САВІЦКІ
Па карцінах Міхася Савіцкага варта вывучаць шкілет дзяржаўных замоваў на выяўленчае мастацтва часоў Хрушчова, Брэжнева, Гарбачова, Лукашэнкі, Ельцына і ня больш за тое.

АКУДОВІЧ
У сваіх развагах Валянцін Акудовіч нагадвае дзіця, якое заплюшчвае вочы й кажа: "А мяне няма!"

АСТАШОНАК
Лёс Алеся Асташонка — прыклад таго, як пісьменьнік спачатку выдумляе, а потым пачынае жыць паводле ўласных твораў, што немінуча вядзе ў сьвет цёмны, задушлівы і вузкі.

АДАМОВІЧЫ
Так склалася, што пры любым рэжыме ў Беларусі знаходзіцца нейкі Адамовіч: за фашыстамі Антон, за камуністамі Алесь, за лукашэнкаўцамі Славамір... І кожны зь іх заблытваўся ў калябаранцтве, каяўся прылюдна, але, галоўнае, бараніў беларускую ідэю.

КАРАТКЕВІЧ
Найцікавейшая рыса літаратурных твораў Уладзімера Караткевіча — незавершанасьць, якая вымагае працягаў, варыянтаў, імправізацыяў і пераходу ў іншыя жанры мастацтва: у графіку, у тэлівізію, у кіно...

СТАНЮТА
У кожнай нацыі XX ст. маецца жаночы сэкс-сымбаль: у амэрыканцаў — Мэрылін Манро, у немцаў — Марлен Дытрых, у італьянцаў — Сафі Ларэн, у французаў — Эдыт Піяф, а ў Беларусі гэта пачэснае месца займае Стэфанія Станюта.

СТРАЛЬЦОЎ
Калі чую: які Міхась Стральцоў пісьменьнік, ён жа не напісаў рама-а-ана, — думаю: памер ніколі не вызначае велічы твору.

ЗЯНОН
Адзінае, што магу сьцьвярджаць з усёй адказнасьцю: Зянон Пазьняк не паэт, бо ня лірык, а беларусы, як ні павярні, перш-наперш нацыя паэтаў. Праўда, апошнім часам беларусы робяцца нацыяй кантрабандыстаў, і тут у Пазьняка зьяўляюцца шанцы.

ФЕДАРЭНКА
Пакутнік Андрэй Федарэнка перажывае, што ня можа напісаць як нехта прызнаны, вялікі, геніяльны: Чэхаў, Талстой, Бунін; адсюль і назоў аповесьці — "Вёска". Рыхтык, як у Івана Буніна.

ЗУЁНАК
Паэт Васіль Зуёнак, старшыня Саюзу Пісьменьнікаў Беларусі, не раўнуючы, як купалаўскі Мікіта Зносак з "Тутэйшых", прадаваў эспэўскія памяшканьні розным немцам ды расейцам, пакуль чужынцы не намерыліся забраць увесь Дом Літаратараў.

ТАРАСЭВІЧ
Гледзячы на палотны Лёніка Тарасэвіча, міжволі згадваю Віктора Вазарэлі. Намаляванае Тарасэвічам мусіў напісаць і намаляваць Вазарэлі — да таго як вынайшаў Ап-Арт і зрабіўся найвялікшым мастаком.

КІШЧАНКА
Тое, што панавырабляў за доўгае жыцьцё Аляксандар Кішчанка, горш за кіч, бо гэта — сацыялістычны кішч.

ЛУКАШЭНКА
"З выразам глыбокіх ведаў ва ўсіх навуках павучаюць іншых толькі тыя, хто прыехаў зь вясковай глухамані", — пісаў у сваіх "Занатоўках ад суму" Кэнко-хосі ў далёкім XIV стагодзьдзі, а назіраньне падаецца актуальным і цяпер, калі часам паслухаеш першага прэзыдэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку.

ШАМЯКІН
Раманы Івана Шамякіна за савецкім ладам запаўнялі прастору бульварнага чытва. Цяпер, калі на рынку зьявілася ўласна лёгкая літаратура, патрэба ў прозе Шамякіна зьнікла.

АЗГУР
Помнік Якубу Коласу, што стаіць на менскім пляцы — вельмі далёкая ад лірыкі рэч. Побач з мэталёвым гігантам думаецца, што Заір Азгур ніколі не чытаў вершаў таго, каго ўславіў. Зрэшты, ведаючы разьбяроў, скажу, што яны не чыталі Сталіна зь Леніным, а помнікаў ім настаўлялі ў кожным беларускім горадзе.

ШУШКЕВІЧ
Палітычную кар'еру Станіслава Шушкевіча пагубілі чыста беларускія паводзіны: празьмерная сьціпласьць, заўсёдная нерашучасьць, беспадстаўныя спадзяваньні на шчасьлівы лёс. І бяда ў тым, што гэтыя трыклятыя рысы характару могуць зьнішчыць нашую дзяржаўнасьць.

ГЕРМЯНЧУК
Пад кіраўніцтвам Ігара Гермянчука газэта "Свабода" ўсё больш пачынае нагадваць "Советскую Белоруссию", узначаленую Паўлам Якубовічам. Дзівіць тое, што адзін і той жа працэс чытачы называюць супрацьлеглымі словамі: адныя кажуць "эвалюцыя", а другія — "дэградацыя".

СОКАЛАЎ-ВОЮШ
Зрэдку слухаю Сержука Сокалава-Воюша ў радыё "Свабода" і думаю, што нельга бадзёрым і аптымістычным голасам распавядаць пра ваенныя падзеі ў Чэчні, бо трэцяя сусьветная вайна — паміж мусульманамі і юдаіста-хрысьціянамі — вымагае мінорнай і ўдумлівай інтанацыі.

фінансавыя сувязі і Тамара Віньнікава, сёньняшняя сядзеліца "амэрыканкі". Пра большае пакуль памаўчу.

3 траўня (субота). Ногі, ножышчы, ножкі жаночыя. Як ствалы соснаў – калі ножкі загарэлыя альбо ў панчохах цялеснага колеру. Як ствалы бяроз – калі ножкі без панчохаў.

Быў на танцульках. Танцавалі зь Вікторыяй, міла стукаліся нашы каленкі адна аб адну. Назіраючы за парамі падлеткаў, іх няўклюдныя і такія непасрэдныя танцавальныя рухі, успамінаў сядзельцаў малалеткі з "хаты" шэсьць нуль віцебскага цэнтралу. Бальшыня зь іх стануць кончанымі і выйдуць толькі для таго, каб ізноў сесьці.

Калі паэт Галубовіч вымае зацемкі зь левай кішэні, то мне сваю самапіску прыходзіцца даставаць з правай калашыны. Вечна яна туды западае. І калі ў ёй скончыцца атрамант?

Пасьля танцаў Вікторыя была ў мяне. Гаварылі. Казала, любіць дзяцей, хацела б стаць пэдагогам, але гэты шлях для яе закрыты з-за дэфэкту мовы. Гаворыць — нібы нарачанская хваля з галькай шэпчацца.

4 траўня (нядзеля). Ізноў Вікторыя, Вікця, Віктуся. Прасіла напісаць верш (яны ўсе просяць напісаць верш). Абяцаў. Заяжджалі ў госьці хлопцы зь пяцёркі "Юстына" і прадстаўнік ад "Рамана". "Раманаўцы" пачалі дзейнічаць. Улады будуць адказваць: а) адкрытым тэрорам спэцпадразьдзяленьняў МУС, КГБ, магчыма, некаторых армейскіх частак; б) правакацыямі псэўдапяцёрак КГБ; в) стварэньнем чарнасоценных бандаў з адстаўных афіцэраў-небеларусаў і крымінальнага элемэнту; г) прэвэнтыўнымі арыштамі; д) стварэньнем зон сацыяльнай, рэлігійнай і міжнацыянальнай нестабільнасьці (прыклады ёсьць: разбурэньне габрэйскіх могілак, падпал царквы ў Заслаўі, так званыя, сатанісцкія надпісы на праваслаўным храме ў Менску, пастаяннае нішчэньне каталіцкіх крыжоў на месцах масавых бальшавіцкіх экзэкуцыяў над беларускімі грамадзянамі).

5 траўня (панядзелак). Вікторыя, я напісаў верш! Першы пасьлятурэмны верш. Пра каханьне і свабоду, пра тое, што ты можаш зрабіць гэта са мною. Вікторыя Лунінецкая-Луніна, дзяўчына беларускага Палесься, вазьмі мой верш, напісаны словамі жарсьці...

Рабі ГЭТА са мною,
кахаючы і прыгожа,
пад елкай альбо сасною,
альбо запрасі ў ложак.

На белыя прасьцірадлы
кінь мяне, распрануўшы,
я буду бязьмежна рады
пакінуць граніцы сушы.

Я плюхнуўся ў воды мора,
у акіяны субстанцый,
чытацьму цябе, як Тору,
як Біблію, мая Канстанца.

Я перацалую пялёсткі
тваёй залацістай ружы,
я гэткі малы і порсткі,
і слабы з табой, і дужы.

Глядзі, вось нашае заўтра:
пасьля здабыцьця свабоды
мы пішам вялікую хартыю
Нашай любоўнай згоды...

На жаль, гэта будзе няхутка,
а сёньня наш май халодны,
і нас закрывае "на суткі"
халуйскі рэжым нязводны...

Дык зьдзейсьні гэта са мною,
мая беларуская вершніца,
і праўдай, а не маною
няхай наш прыплод прышчэпіцца.

4 траўня 1997 году, Купа.

Ад бабці Броні з Барысава: абедаў — жывот ня ведаў. Бабця сядзіць праваруч мяне. Каталічка. Мая беларуская мова правакуе і яе гаварыць па-беларуску.

Схадзіў выпіў малака гатаванага ды зьеў булачку. Прайшоўся лесам. Пасьля дажджу цяплее, цёхкае салавей, точыцца трава, на дрэвах выплывае ліст. Чыстае паветра, чыстае дыханьне.

Ножачкі, ножкі, ногі, ступні, лытачкі, сьцёгны, клубы, матрыца...

Хаджу на мінэральна-жамчужныя ванны. Цікавая працэдура: ляжыш сабе самапіскай дагары і назіраеш, як за табой назірае работніца водалячэбніцы. Ёй цікава, інакш бы прымусіла апрануць майткі. Глядзі, мая мілая жанчына, глядзі. А хочаш – вазьмі, я не адмоўлю. Я люблю пісаць маёй самапіскай пісьмёны радасьці.

За вячэрай у сталоўцы мімаходзь згадаў пра сваю адсідку. І тут высьвятляецца, што мужчына гадоў 70-ці, які сядзіць за сталом насупраць, таксама зьведаў турэмнага хлеба, калі ў 50-х, ужо па сьмерці Сталіна, яго арыштавалі "за камэрцыю": рабіў на заказ мэблю, пераважна сталы. З працы рук сваіх займеў грошы, вось і "раскулачылі".

Бабця Броня Скуратовіч адпакутавала ў засьценках гестапа ў Арлоўскай вобласьці Расеі, куды яе адправіў далей ад вайны муж Фама Конахаў, расеец, вайсковец. Жыла ў мужавага брата. Немцы прыйшлі хутка, так што ўцячы не пасьпелі. Расказвае, як зьдзекваліся зь людзей акупанты, як елі белае мяса бяз хлеба. Малыя не разумелі, а старэйшыя вязьні здагадваліся, што кормяць іх чалавечынай. З гестапа Броня Скуратовіч трапіла ў Нямеччыну на працу. У няволі заставалася з 1942-га па 1945-ы, вызвалілі амэрыканцы. Вярнулася на радзіму. Родам зь вёскі Міхалова Жыцькаўскага сельсавету. У Барысаў пераехалі ў 30-м, бо зь пяцьцю дзеўкамі на вёсцы бацькам не было чаго рабіць. А перад тым перажылі рэпрэсіі, раскулачваньне. У вялікай радзіне Скуратовічаў былі фэльчар, вэтэрынар, адна багатая родзічка, пані, якая мела 300 кароў... Броня Скуратовіч з замілаваньнем згадвае сваё шляхецкае паходжаньне ("Я дваранка!"). Калі бацька даведаўся, што дачка ўзяла прозьвішча мужа, ён расплакаўся... Яшчэ мая суседка расказвае, што яна самая старэйшая зь пяці дачок свайго бацькі, і самая меншая ростам, бо змалку прыйшлося шмат працаваць і за кроснамі, і ў полі. Адзіны іх брат загінуў на вайне, загінуў і Бронін першынец, якога гестапаўцы адабралі ад яе.

Бабця Броня за сталом зьядае ўсё чыста, дзякуй Богу, у яе яшчэ добры апэтыт. Зрэшты, тут ня столькі ў апэтыце справа, колькі ў памяці пра галодныя гады дзяцінства і маладосьці. Памяць пра голад выпрацоўвае ашчадныя адносіны да яды. І яшчэ ўспамінае барысаўчанка Броня, як аднойчы маці сьпякла бліны з мукі, у якой аказалася семя дурнап'яну, і як у дзяцей балелі галовы й жываты. Прыйшлося бацьку прадаць дурнап'янавую муку габрэям. Відаць, тыя доўга чухалі свае пэйсы. Пасьлязаўтра бабця Броня ад'яжджае, дзед яе часта застаецца ў палаце, бо яму цяжка хадзіць – сэрца. І я застаюся з бабулькай, што сядзіць леваруч мяне. Мімаходзь закранаем палітыку. Суседка заступаецца за Расею, але Лукашэнку ня любіць. Урэшце, кажа яна, што я ні думала сама, ды апошняе слова за маімі дзяцьмі. Я не магу йсьці ім насуперак, а яны ня любяць ні Лукашэнку, ні Расею. Вось так. І нічога выдумляць ня трэба, бо жыцьцё вышэй за ўсялякія фантазіі. Пакаленьне за пакаленьнем мы праходзім праз турмы, рэпрэсіі, лягеры. І жывем, перажываем і перажываем! Бо сёньня, ня ў прыклад іншым збанкрутаваным дзядам і маладзёнам ад палітыкі, здаровая беларуская моладзь уздымае апошні лёзунг нашага стагодзьдзя: Радзіма альбо сьмерць! Сёньня, напярэдадні Радуніцы, я думаю і пра лёсы людзей, што адкрыліся насустрач майму прызнаньню, і пра тых, хто так і не даждаў свабоды... Я думаю пра Нацыянальную Рэвалюцыю і вызваленьне з-пад акупацыі... У мяне няма прэтэнзіяў да народу, да масы, як справядліва сказаў Амар Хаям, "хто яго (народ) павядзе, ён за тым і пойдзе". У нас ёсьць каму выставіць рахунак. І мы выставім яго і змусім заплаціць!

Менск – Купа, 1997 г.

СТО ТВОРАЎ МАСТАЦТВА XX СТАГОДДЗЯ

Вітальд Бялыніцкі-Біруля. Блакітная капліца. 1912. 96,5x116,5, холст, алей. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь.

Вітальд Бялыніцкі-Біруля. БЛАКІТНАЯ КАПЛІЦА

... Пэйзажны жывапіс, як самастойны жанр, разьвіўся ў Беларусі адносна позна. Спадчына XIX ст. была разнастайнаю, але абавязкова ўлучала ў сябе элемэнты іншых жанраў. Напрыканцы XIX — на пачатку XX ст. Беларусь займела цэлую плеяду выбітных пэйзажыстаў, якія вывелі гэты жанр на ўзровень эўрапейскае клясыкі. Нягледзячы на розныя жыцьцёвыя шляхі, адукацыю і схільнасьці, усе яны стваралі ў кірунку тагачаснага дынамічнага мадэрну...

... Паводле зьбегу абставінаў, найбуйнейшым беларускім пэйзажыстам стаў чалавек, які не вучыўся ў Беларусі і ня жыў тут большую частку жыцьця, чалавек, які пачаў жыцьцё ў шляхецкім гнязьдзе, а скончыў з савецкім ордэнам працоўнага чырвонага сьцяга, чалавек, які стаў перасоўнікам, але быў ушанаваны ў Мюнхене, Парыжы, Барсэлёне...

... Вітальд Бялыніцкі-Біруля паходзіў са старога шляхецкага роду, які меў вялікія ўладаньні ў Віцебскім і Аршанскім паветах, сярод ягоных продкаў быў Гаўрыла Біруля, ротмістар казацкае харугвы ў войску Сьцяпана Батуры падчас Лівонскае вайны. Прыдомак "Бялыніцкія" род атрымаў не ад Бялынічаў, а ад вёскі Бялынавічы пад Віцебскам, хоць пазьней сапраўды Бялыніцкія-Бірулі прыдбалі маёнткі пад мястэчкам Бялынічы. Акалічнасьць са шляхецкім радаводам (каталіцкага вызнаньня), цікавая зь некалькіх прычынаў. Па-першае, сярод перасоўнікаў дваранаў былі адзінкі, а таму арыстакрат-каталік Бялыніцкі-Біруля відавочна мусіў вылучацца сярод разначынскае моладзі. Па-другое, лёс гэтага мастака ўзорны для большасьці шляхецкае беларускае інтэлігенцыі, якая самахоць зьяжджала ў Расею. Вяртаньня ў Беларусь магло й ня быць. Большасьць зь іх, імкнучыся хутчэй зрабіць расейскую кар'еру, выракаліся свайго паходжаньня і былі згубленымі для Бацькаўшчыны. Па-трэцяе, Вітальду Бялыніцкаму-Бірулю ўдалося ня толькі выжыць пры бальшавіках, не зважаючы на паходжаньне, але й дапяць да найвышэйшае вяршыні савецкае мастацкае намэнклятуры. Ягонаму свайку, Аляксею Бялыніцкаму-Бірулю, вядомаму палярніку, географу, падарожніку не давялося пераступіць 1937 году...

... Бацькі, паводле старое радавое традыцыі, хацелі бачыць Вітальда вайскоўцам. З гэтай мэтаю ён быў аддадзены ў Кіеўскі кадэцкі корпус. Аднак, прага да мастацтва прывяла яго ў малявальную школу Мурашкі, якую ён наведваў усе гады навучаньня ў корпусе. Пасьля Кіева жэрабя выпала на мастацтва. У 1889-м ён паступае ў Маскоўскую вучэльню жывапісу, плястыкі і дойлідзтва. Тут ягоны творчы кірунак быў прадвызначаны настаўнікамі-перасоўнікамі Каровіным, Пранішнікавым, Неўравым ды іншымі. З тых гадоў Бялыніцкі-Біруля на ўсё жыцьцё застаўся прыхільнікам творчасьці Левітана, які стаў ягоным кумірам, як і для ўсіх маладых расейскіх пэйзажыстаў. Зрэшты, і сам Левітан угледзеў маладога мастака. Пазьней, стары і хворы патрыярх расейскага пэйзажу казаў: "... трымае мяне хвароба, а пара ўжо даўно на вёску. Цяпер там добра... Надзвычайная далікатнасьць. Неабходна перад усім адчуць гэтую мэлёдыю. Вось з маладых да яе прыслухоўваецца толькі Бялыніцкі-Біруля..." Аднак блізкасьць да кола перасоўнікаў яшчэ не азначала для маладога беларускага шляхціца падзелу зь імі іхных сацыяльных поглядаў. Бялыніцкі-Біруля пачаў карыстацца магчымасьцямі экспанаваньня ў Таварыстве перасоўных выставаў з 1892 году, аднак у самое таварыства ўвайшоў толькі ў 1904-м, калі ўжо быў вядомым пэйзажыстам. Ці быў тут разьлік?...

... Кожныя вакацыі Бялыніцкі-Біруля праводзіў у бацькоўскім маёнтку. Тут ён напрацаваў шматлікія эцюды, шкіцы. Тут ён гартаваўся як самастойны мастак. Тут у ягоныя працы ўвайшоў той самы нацыянальны каларыт, якім ён вызначыўся ў мастацтве. Але трэба было шукаць славы найперш у Расеі. У 1892-м Бялыніцкі-Біруля ўпершыню едзе ў "самую" Расею, у Пяцігорск, і піша там некалькі працаў. Палатно "З ваколіцаў Пяцігорска" адразу зьвярнула на сябе ўвагу і калегаў, і крытыкі. Рэпін пахваліў, Трацьцякоў купіў. Незвычайны посьпех гэтага лірычнага пэйзажу адкрыў маладому мастаку брамы славы. Шматлікія падарожжы па Расеі пашыралі кола тэмаў, матываў: моры, тундры, горы... Наступны посьпех — 1-я прэмія Маскоўскага таварыства аматараў мастацтваў за працу "Вясна ідзе" (1899). "Вясна" стала ці не талісманам для Бялыніцкага-Бірулі. Пасьля яе ў ягонай творчасьці былі дзясяткі "Вёснаў", іх шматлікія паўторы (агулам вясновым краявідам ён прысьвяціў 200 карцінаў, а слова "вясна" ў назвах сустракаецца 120 разоў)... За гэтай прэміяй ўзнагароды сыпаліся адна за адной. У 1901 годзе мастак атрымаў залаты мэдаль на Каўкаскай юбілейнай выставе за палатно "Вечныя сьнягі", напісанае паводле ўражаньняў ад вандровак па Каўказе. "Час цішы" атрымаў у 1909 годзе залаты мэдаль на міжнароднай выставе ў Мюнхене. "Зімовы сон" (1911) — у 1912-м — бронзавы, на шостай міжнароднай выставе ў Барсэлёне. Былі і французскія прэміі, экспанаваньні ў Швэцыі, Галяндыі. Надыходзіла эўрапейская слава... Ці хто зь ягоных расейскіх раўналеткаў мог прасунуцца гэтак у Эўропу? Але Бялыніцкі-Біруля, які ўжо меў званьне акадэміка жывапісу (з 1908), не даверыўся Захаду, дзе посьпех, як і мода, зьменлівы і няпэўны, але дастаецца ў тлуме і ў пакутах. Містычная прыцягальнасьць калясальнае імпэрыі перамагла. У Расеі ён станавіўся першым сярод пэйзажыстаў, пасьля Левітана.

Але знаёмства з эўрапейскім мастацтвам для Бялыніцкага-Бірулі не прайшло марна. Пэрыяд творчасьці жывапісца да першае сусьветнае вайны ("пераважна лірычныя пэйзажы", як пісалі савецкія мастацтвазнаўцы), працяты ўплывамі тагачаснага заходняга жывапісу. Пастознае пісьмо, лякальныя каляровыя плямы, алюзіі на схаваную дынаміку (дынамічную раўнавагу), якая мусіць раскрываць кантэкст вобраза — цэлы набор прыёмаў з эпохі мадэрну. Натуральным, у гэтым рэчышчы досьведу, быў і зварот да сымбалізму. У пэйзажы мадэрну сымбалізм быў ці не галоўным стрыжнем формаўтварэньня. Яскравы прыклад — творчасьць швайцарца Ходлера, якая стала ўзорам для шматлікіх пераймальнікаў.

Пасьля 1905-1907 гадоў грамадзянская і сацыяльная актыўнасьць насельнікаў імпэрыі набыла абвостраныя, часьцяком парадаксальныя формы. Сам Бялыніцкі-Біруля, падпісаўшы разам з 113 мастакамі Расеі палітычную рэзалюцыю (якая была надрукаваная ў газэце "Право" 8 траўня 1905), не пайшоў далей за радыкальна настроенымі мастакамі (нават Дабужынскі ўцягнуўся у палітычную дзейнасьць, публікуючы карыкатуры і палітычна абвостраныя, жорсткія стылем графічныя працы), а сышоў у сьвет сымбалізму. Сваю задачу, бясспрэчна, сацыяльна значную, ён бачыў у мэтафізычных роздумах на вечныя тэмы сну і абуджэньня. Менавіта ў гэтых матывах яскрава выявілася ягонае мастацкае пачуцьцё і грамадзянская пазыцыя лагоднага лібэрала. Працы тых гадоў можна ўмоўна падзяліць на дзьве групы. Першая — разнастайныя сюжэты веснавое прыроды, красаваньня зямлі, доўгачаканае эйфарыі натуры; і другая — ціхія прыцемкі шарае гадзіны, спавітыя ў сьнягі зямныя прасторы, сон за колькі гадзінаў да сьвітанку. Найбольш значнаю працай з апошняе групы палотнаў стала "Блакітная капліца".

У 1912 годзе, у самым росквіце ўласных жаданьняў і прызнаньня ў мастацкім сьвеце, пасьля мэдаля з Барсэлёны, Бялыніцкі-Біруля піша сваю першую "Блакітную капліцу". Верагодна, што гэтая рэч — перыфраз менавіта той карціны "Зімовы сон", якая атрымала посьпех на барсэлёнскай выставе. Крыху пазьней, але ў тым жа годзе, ён стварыў паменшаны варыянт "Блакітнае капліцы", які сёньня знаходзіцца ў Рыбінску (Расея), у гісторыка-мастацкім музэі.

... На засьнежаным пагорку сярод кволых стромкіх дрэўцаў — бажніца. Ля купала сплывае маладзік. Па-над кромкаю сьнежных гурбаў праз хвіліну заясьнее сьвітанак. Сон за дзесяць хвілінаў да абуджэньня... Капліца, вядома, не блакітная, а алівава-шэрая, пад'імшэлая, як і іншыя нашыя драўляныя бажніцы. Яна стаілася, цёплая, людзкая, ў крышталёвым марозным блакіце...

Матыў прадчуваньня ў гэтым творы амбівалентны. Трывога за час, які мінае, боязь чырвонага ранку, смутак па нечым родным, што неўзабаве адыдзе ў нябыт?... Ці жыватворнасьць сьвята пасьля ўсяночнага чуйнаваньня, сьветлыя сьлёзы радасьці, падзяка за новы дзень, што неўзабаве надыдзе? Але тое, што твор чалавечых рук роўны небу, і крыж сягае панад маладзіком — бясспрэчна.

Чым гэты матыў быў дарагі для мастака? Зь якою часткай свайго жыцьця ён зьвязваў гэтую капліцу? Пэўна, для яго яна была вялікай рэліквіяй. Да 1920 году ён піша яшчэ раз трэцюю (зь вядомых) "Блакітную капліцу", якая сёньня зьберагаецца ў Менску, а неўзабаве і чацьвертую, пад назовам "Зімовы краявід", якая належыць цяпер Цьвярской карціннай галерэі.

Гэтае палатно стала своеасабліваю візытоўкаю ўсёй спадчыны Бялыніцкага-Бірулі, як найбольш адметны і шматзначны твор, з тых, больш чым тысячы, палотнаў і эцюдаў, напісаных ім пазьней, сярод якіх і будні пяцігодак, і ленінскія мясьціны, і радзіма Сталіна... Твор, які быў створаны па-за Беларусяй, стаўся клясыкаю беларускае спадчыны, ад яго сёньня вядуць радавод нацыянальнага беларускага пэйзажу.

Сяргей Харэўскі

Вітальд Бялыніцкі-Біруля (17.2.1872, маёнтак Крынкі Аршанскага пав., цяпер у Бялыніцкім р-не – 18.6.1957) жывапісец-пэйзажыст. Вучыўся ў Кіеўскай малявальнай школе М.Мурашкі (1885-1889), пасьля – ў Маскоўскай вучэльні жывапісу, плястыкі й дойлідзтва (1889-1896) у Каровіна, Неўрава, Пранішнікава, Паленава. Акадэмік жывапісу (1908). Народны мастак БССР (1944). Ганаровы акадэмік АН БССР (1947). З 1947 году – нар. мастак РСФСР і правадзейны член АМ СССР.

"Наша Ніва"
незалежная газэта
заснаваная ў 1906,
адноўленая ў 1991
заснавальнік ..... Павал Жук
рэдактар ..... Сяргей Дубавец
выдавец ..... БГФ "Наша Ніва"
адказны сакратар ..... Алег Дзярновіч
мастацкі рэдактар ..... Сяргей Харэўскі
аддзел інфармацыі ..... Андрэй Лапцёнак
Віктар Корзун
вёрстка ..... Іна Жызьнеўская
набор ..... Таціяна Чуйвід
стыль і карэктура ..... Паўлюк Канавальчык
пры ўдзеле ..... Сяргея Шупы
прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі ..... Зьміцер Бартосік
(тэл. 56-94-36)

НАША НІВА

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ
220123 Менск, а/с 71
Тэл./факс 239-78-49
E-mail: edit@niva.minsk.by
Падпісны індэкс 63125

© НАША НІВА. Спасылка на "Нашу Ніву" абавязковая. Наклад 3635. 8 палос фармат А2 Нумар падпісаны ў друк 19[55], 25/5/1997. Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку". Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова № 2992. Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам друку Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.